Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. СУБОТА №204 (28568)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Маці змагаюцца супраць наркотыкаў**

СТАР. 4



**Фальварак адраджаюць… медыкі**

СТАР. 8

**Праграма кінафестывалю**

СТАР. 11

# ПА ПУНКТАХ

## У Палацы Незалежнасці абмяркоўвалі стан жыллёва-камунальнай гаспадаркі



Фота БЕЛТА.

**У рамках рэспубліканскага семінара «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны» на ўзроўні кіраўніка дзяржавы былі разгледжаны пытанні кошту паслуг ЖКГ, тарыфаў, рамонту жылля, цеплазабеспячэння, абыходжання з адходамі, водазабеспячэння і водаадвядзення, працоўнай дысцыпліны і кадравай палітыкі сферы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які вёў пленарнае пасяджэнне семінара, даў шэраг прамых даручэнняў кіраўнікам галіны, адказным урадавым асобам, а таксама губернатарам.**

СТАР. 2

# ВОСЕНЬСКІ КАБРЫЯЛЕТ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Нясвіжскім парку.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«За бягучую пяцігодку нам трэба будзе рэалізаваць больш як 80 буйных інвестыцыйных праектаў на суму каля $30 млрд, з іх $16 млрд — знешнія. Толькі Кітаем для Беларусі зарэзервавана $7 млрд. Сёння мы з кітайскімі калегамі працуем над выкананнем стратэгіі сумесных дзеянняў, якія прадугледжваюць стварэнне канкрэтных праектаў. Магчыма, іх будзе няшмат — 10—20, але яны павінны быць рэальна запатрабаваныя, забяспечваць рост ВУП, а галоўнае — быць нацэленыя на нарошчванне інавацыйнага складніка. Сусветны ВУП будзе прырастаць штогод каля 3%, ВУП Расіі — на 2—3%, Еўрасаюза — каля 2%. Акрамя таго, чакаецца дынамічнае развіццё Кітая, Казахстана і Украіны. Таму вектар супрацоўніцтва з імі застаецца адным са значных фактараў забеспячэння эканамічнага росту і ў нас».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9550 | ▼ |
| Еўра | 2,3075 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0339 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0736 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17204

■ Звяздоўскія вандроўкі

# АДКРЫВАЮЧЫ БЕЛАРУСЬ



Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

**Ідэя гэтага праекта лунала ў паветры. Сутнасць: убачыць рэгіёны Беларусі вачыма ўласных карэспандэнтаў «Звязды» з іншых абласцей. З аднаго боку, гэта дае магчымасць паглядзець на звыклае свежым поглядам. Зноў і зноў адкрыць для сябе сваю Радзіму. З другога — лепш даведацца не толькі пра тое, чым ганарыцца, або што жадае папулярызаваць той ці іншы рэгіён, але і адзін пра аднаго. Бо гэта добрая нагода для сустрэчы і нефармальных зносін, без якіх немагчымая ніводная сапраўдная вандроўка. Першая вобласць, якую мы абралі, — Гродзенская. І тэма вандроўкі вызначылася амаль сама сабой — турыстычны патэнцыял. Такім чынам, уласныя карэспандэнты «Звязды» з Магілёва, Брэста і Гомеля дзеляцца сёння сваімі ўражаннямі ад першай сумеснай паездкі ў адзін з самых любімых усімі беларусамі гарадоў.**

СТАР. 8-9

# ПА ПУНКТАХ

## Размежаваць адказнасць

На працягу бягучага года і ў апошнія месяцы на самым высокім узроўні быў абмеркаваны шэраг пытанняў, датычных асобных сфер жыцця краіны. Гэта і адукацыя, і спорт, і навука, і сельская гаспадарка, і развіццё бізнесу. У гэтым шэрагу, адзначыў учора кіраўнік краіны ва ўступным слове, істотнае месца займае і жыллёва-камунальная гаспадарка. Тут сапраўды наспела шмат пытанняў. Настаў час іх разгледзець і прыняць неабходныя рашэнні — пры гэтым не забыць азнаёміцца з перадавым замежным вопытам і пераняць самае лепшае.

— Мэта сённяшняга мерапрыемства — комплексна адказаць на выклікі і пытанні, якія ўзнікаюць у нашым грамадстве ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, і намецiць шляхі далейшага руху ў гэтым кірунку, шляхі развіцця гэтай сферы, — заявіў беларускі лідар.

У галіне, на якасць работы якой Прэзідэнт рэгулярна звяртае пільную ўвагу, зроблена многае ў тым, што датычыцца зніжэння сабекошту, павышэння якасці паслуг і развіцця тэхналогій. Цікавы факт: 66% насельніцтва краіны станоўча ацэньваюць працу жыллёва-камунальных службаў — гэта ўжо нядрэнна.

— Дай бог, каб гэта было так, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але давайце лепш будзем гэта падвяргаць сумненню — каб лепш працаваць. Не трэба забываць, што амаль трэць апытаных дае рабоце сістэмы ЖКГ негатыўную ацэнку. Па значнасці для насельніцтва гэтыя пытанні займаюць другое месца пасля занятасці. І пакуль у адрас сістэмы чуецца крытыка, супакойвацца рана.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што трэба выразна размежаваць для насельніцтва, што павінна ў плане ЖКГ рабіць дзяржава, а што — самі людзі. Гэта звязана з тым, што ёсць скаргі, — маўляў, недзе не адрамантавалі, недзе не пафарбавалі. У той жа час жыллё ў большасці сваёй прыватызавана, адпаведна, многае службы ЖКГ рабіць не павінны. Пры гэтым, дадаў Прэзідэнт, трэба мець на ўвазе, што не кожны чалавек, нават калі ён прыватызаваў жыллё, можа сам справіцца ўнутры яго з работамі. Старыя, хворыя, інваліды — гэта тыя, каму дзяржава павінна дапамагчы.

## Пад'ёмныя тарыфы

Кіраўнік дзяржавы нагадаў: неадназова дамаўляліся, што тарыфы павышаюцца толькі на пяць долараў у год і індэксуюцца ва ўвязцы з ростам даходаў насельніцтва.

— Наколькі мне вядома, такое павышэнне ўжо адбылося ў студзені 2017 года. Разам з тым урад, вядучае міністэрства, Міністэрства гандлю ў верасні павысілі тарыфы на 8% і пачынаецe далей пужаць людзей тым, што ў снежні яшчэ павялічыце на 10%. І гэта пры тым, што са снежня ўсе аб'ектыўна будуць плаціць болей у сувязі з уключэннем ацяплення. Гэта антынародны падыход!

Прэзідэнт задаў лагічнае пытанне: чаму нельга індэксаваць тарыфы, калі няма ацяплення, і, адпаведна, жыроўкі значна лягчэйшыя? Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу: з 2018 года праводзім разавае павышэнне тарыфаў толькі на пяць долараў і ў далейшым — ніякага росту без ведама Прэзідэнта. Тарыфы павінны быць пад'ёмнымі для народа.

— Не трэба бударажыць насельніцтва размовамі пра стапрацэнтнае пакрыццё кошту паслуг літаральна з заўтрашняга дня, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта пытанне ў тым ліку палітычнае, і спешка тут недапушчальная.

Даволі вострую тэму з адыходам ад перакрыжаванага субсідавання кіраўнік дзяржавы таксама агучыў. З акцэнтам на тое, што галоўны прыярытэт беларускай сацыяльнай палітыкі — гэта інтарэсы людзей, а не ведамстваў і розных міжнародных структур.

— Мы пастараемся да 2020 года адысці ад перакрыжаванага субсідавання, — паабяцаў кіраўнік дзяржавы і дадаў: — Гэтага вельмі хоча прамысловы сектар краіны. Калі ласка, мы не супраць. Але вам прыйдзецца падняць зарплату, прытым істотна.

Палітыка дзяржавы — сацыяльная. У тым ліку і ў абмеркаванай сферы. Адпаведна, патрабаванне кіраўніка краіны: ні адзін чалавек, ні адна сям'я, якія не маюць магчымасці аплаціць жыллёва-камунальныя паслугі, не павінны заставацца без дапамогі дзяржавы. Улады абавязаны гарантаваць падтрымку любому, хто апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

## Ліфты — як мае быць

Капітальны рамонт жылля — тэма, якая заўсёды на слыху. Штогод у краіне капітальна рамантуецца больш за два працэнты жыллёвага фонду, усё больш рэальным становіцца дасягненне жаданых трох працэнтаў. У той жа час на якасць і тэрміны правядзення капрамонту па-ранейшаму паступае шмат скаргаў. А ад асобных прынятых рашэнняў — напрыклад, датычна ліфтаў — увогуле залежыць жыццё людзей. Прэзідэнт канстатаваў: трэцяя частка ліфтаў, якія эксплуатуюцца, выпрацавала свой тэрмін.

— Дзяржаўны сакратарыят Савета бяспекі з году ў год інфармуе пра тое, што расце рызыка ўзнікнення аварый і няшчасных выпадкаў. І чаго мы чакаем? Пакуль ліфты не пачнуць падаць, як у нас некаторыя балконы? — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы. Ён папярэдзіў удзельнікаў семінара: не дай бог недзе ўпадзе ліфт, і нагадаў, што некалі з гэтым таксама цягнулі і адкладвалі да лепшых часоў. У выніку — судовыя расследаванні і крымінальныя справы.

Патрабаванне беларускага лідара: да 2020 года ўвесь ліфтавы фонд прывесці ў належны стан. Спасылкі на недахоп сродкаў не прымаюцца. Дарэчы, айчынны завод па вытворчасці ліфтаў у Магілёве робіць сучасныя ўзоры такой машыны. З прадпрыемствам можна дамовіцца наконт схем крэдытавання пры неабходнасці. З іншага боку, прамыслоўцы павінны паклапаціцца пра якасць сваёй прадукцыі.

## Цяпло — без імпарту

Адна з самых важных і самых дарагіх паслуг ЖКГ — цеплазабеспячэнне. Больш за 30% ад сумы жыроўкі зімой ідзе на ацяпленне і падагрэў вады. Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены: тут ёсць велізарныя рэзервы для эканоміі. Зніжэнне долі імпартных газу і энерганосьбітаў, за якія мы расплачваемся валютай, прымушае нас актыўна выкарыстоўваць мясцовыя віды паліва, а ў перспектыве электрычную энергію Астравецкай АЭС.

— Ужо нікому не трэба сёння даказваць, што вытворчасць цеплавой энергіі на мясцовых відах паліва сябе апраўдала, — канстатаваў Прэзідэнт. У прыклад ён прывёў Віцебск. У горадзе працавала кацельня на газе, сабекошт цяпла быў каля 100 рублёў. Зрабілі рэканструкцыю, перавялі на шчэпкі — стала менш за 65 рублёў.

Водазабеспячэнне і водаадвядзенне таксама абмяркоўваліся падчас семінара. У Беларусі забяспечана стапрацэнтная даступнасць насельніцтва да пітной вады. Але застаецца праблема з яе якасцю.

26% проб вады ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях не адпавядаюць патрабаванням нарматываў па колькасці жалеза. Забяспечанасць станцыямі абезжалезвання па краіне складае 42%. Гэтае пытанне неабходна вырашыць да 2025 года, упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

— І зусім недапушчальна тое, што некаторыя рэгіёны не маюць ачышчальных збудаванняў і дагэтуль увесь бруд збіраецца на палях фільтрацыі. Не буду доўга спыніцца на гэтым пытанні. Ёсць самыя сучасныя формы ачысткі — укараняйце.

Наступная тэма — абыходжанне з адходамі. Штогод у краіне ўтвараецца чатыры мільёны тон цвёрдых камунальных адходаў. Для захавання ўсяго іх аб'ёма выкарыстоўваецца 168 палігонаў і каля 1500 міні-палігонаў у сельскай мясцовасці. Больш за 90% з іх пабудаваны ў часы СССР.

— Мы ведаем, што гэта за палігоны і мініпалігоны. Новаму міністру прыродных рэсурсаў пастаўлена жалезная задача разабрацца з тымі, хто адказвае за гэтыя палігоны, і асабліва з тымі, хто гэтыя палігоны стварае дзе папала. Гэта значыць засмечвае лясы, дарогі, прыдарожныя палосы і гэтак далей.

## Міністэрству жыць

Гаворачы пра далейшае ўдасканаленне існуючай структуры жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Прэзідэнт падкрэсліў: неабходна разумная цэнтралізацыя пры дастатковай свабодзе дзеянняў на месцах.

— Міністэрству жыллёва-камунальнай гаспадаркі быць, развівацца, станавіцца цэнтрам прыняцця рашэнняў і несці адказнасць за якасць, паўнату і даступнасць усяго спектра жыллёва-камунальных паслуг, што аказваюцца насельніцтву. Усялякія размовы пра тое, ці будзе яно — трэба спыняць. Гэта рашэнне — кампетэнцыя Прэзідэнта. А сёння міністэрства працуе і будзе працаваць заўтра.

Яшчэ адно даручэнне Аляксандра Лукашэнкі: структуру работы галіны і механізмы ўзаемадзеяння неабходна ўніфікаваць у залежнасці ад колькасці насельніцтва ў населеных пунктах. Але асноўнае патрабаванне — структура павінна быць адзіная і кіраваная. А ад структурных змен не павінен пакутаваць ні адзін спажывец. Людзям няважна, ці змяняецца нешта ў сістэме ЖКГ. Для іх галоўнае, каб у доме было суха, светла і цёпла.

Яшчэ адзін нюанс — сістэма ЖКГ павінна супрацоўнічаць з навукай. Павінна быць двухбаковая сувязь: вучоныя — сістэма ЖКГ.

— Чаму б не ініцыяваць сумесныя праекты, не выкарыстоўваць асобныя прадпрыемствы ў якасці эксперыментальных навуковых пляцовак? — прапанаваў беларускі лідар.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БЕЛТА.

**Прэм'ер-міністру Андрэю КАБЯКОВУ і міністру жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандру ЦЕРАХАВУ было што абмеркаваць.**

# ТЭЛЕФАНУЕМ ПА АДНЫМ НУМАРЫ

**Пра тое, якім чынам у беларускай сталіцы вырашылі праблемы, што існавалі раней у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, расказаў старшыня Мінскага гарвыканкама Андрэй ШОРАЦ. Сярод прынятых мер — раздзяленне функцый заказчыка і падрадчыка, размежаванне функцый работ па тэхабслугоўванні, бягучым рамонце, прыборцы тэрыторый, а таксама стварэнне кантакт-цэнтра ЖКГ Мінска — 115.**

«Мы разарвалі заганны круг, калі арганізацыі ЖКГ самі, бо так склалася гістарычна, выконвалі ўсе работы, самі правяралі сябе і атрымлівалі бюджэтныя сродкі», — расказвае Андрэй Шорац, звяртаючыся да тэмы раздзялення функцый падрадчыка і заказчыка. Такім чынам раскручваўся механізм атрымання ўсё большага аб'ёму бюджэтных сродкаў без супастаўлення павелічэння аб'ёмаў рэальна выкананых работ. Таму быў створаны незалежны заказчык, які на конкурэнтнай аснове выбірае пастаўшчыка паслуг — не абавязкова дзяржаўных ці з Мінска, — што кантралюе якасць і тэрміны выканання работ. У падтрымку да яго створаны кантакт-цэнтр, які спрасціў камунікацыю грамадзян з камунальнымі службамі. Незалежная служба адпраўляе заяўку і кантралюе яе выкананне.

На думку прэм'ер-міністра Беларусі Андрэя Кабякова, пэўны вопыт, асабліва што датычыцца канкурэнтных прапаноў па выкананнях работ, у рэгіёнах, у якіх можна выбраць выканаўцу паслуг, варта выкарыстоўваць. Магчыма, для невялікіх населеных пунктаў такая прапанова неактуальная, але з насельніцтвам ад 100 000 чалавек падобную ідэю можна выкарыстоўваць. Пры гэтым адпаведных нарматываў уводзіць не плануецца, але ў той жа час гэта застаецца эфектыўнай мерай, на якую варта звярнуць увагу кіраўнікам рэгіёнаў. Таксама беларускі прэм'ер станоўча ацаніў увядзенне агульнага тэлефоннага нумара па паслугах ЖКГ 115 у Мінску і падкрэсліў, што гэта дадае празрыстасці ў атрыманні заявак і іх задавальненні.

Па словах Наталлі Качанавай, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, адзіныя дыспетчарскія службы (такога плана, як «115.бел» у Мінску) шмат у якіх рэгіёнах ужо працуюць, толькі з іншым трохзначным нумарам. Праўда, пакуль казаць пра ўсеагульнае распаўсюджанне такога вопыту сталіцы заўчасна, лічыць яна.

На думку кіраўніка дзяржавы, вопыт з увядзеннем кол-цэнтра — станоўчы, яго могуць пераняць і рэгіёны. «Чалавек павінен ведаць — у горадзе, аграгарадку, — што па такім тэлефоне патэлефануй, там будзе твой зафіксаваны званок і людзі на гэта адрэагуюць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка і заклікаў уводзіць гэтую практыку ўжо ў наступным годзе. — Тут яшчэ важна, што мы пабачым рэальную цану паслуг».

Па словах Аляксандра Церахава, міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі, нумар 115 зарэзерваваны, таму з цягам часу ён зможа стаць агульнарэспубліканскім для паслуг ЖКГ. І такі «глыбокі аналітычны прадукт», як служба 115, дазваляе не толькі кантраляваць заяўку, але і планаваць, якія работы таму ці іншаму дому зараз патрэбны больш за ўсё. Акрамя таго, міністр расказаў, што нярэдка бываюць выпадкі, калі службы імкнуцца ўтаіць заяўкі, прэтэнзіі, звароты грамадзян.

«Не фіксуюцца заяўкі! Гэтага не рабіць — злачынства! Значыць, не будзе парадку. Празрыстасць у заяўках людзей — гэта ўжо вялікая справа», — сказаў Прэзідэнт.

Зараз у жыллёва-камунальнай гаспадарцы найлепшым чынам складваецца сітуацыя з кадрамі. Працоўныя месцы амаль усе занятыя, людзі трымаюцца за работу. Часта адным са стымулаў уладкавацца становіцца атрыманне службовай кватэры. Але кіраўнік дзяржавы заклікаў адыходзіць ад гэтай практыкі, якая была ўведзена яшчэ падчас Савецкага Саюза, і шукаць іншыя рычагі ўтрымання людзей на працоўных месцах.

Па словах Андрэя Шорца, ёсць яшчэ адно новаўвядзенне, калі ў штат жыллёва-эксплуатацыйных упраўленняў уводзяцца рабочыя па комплексным абслугоўванні і рамонце будынкаў і збудаванняў, так званыя хаус-майстры, якія маюць спецыяльнасці сантэхніка, электрыка, столяра і маляра-тынкоўшчыка. Усяго ў горадзе каля тысячы такіх спецыялістаў. У сярэднім зарплата складае 680 рублёў, але ёсць і тыя, хто зарабляе да тысячы за кошт аказання дадатковых паслуг насельніцтву ў непрацоўны час. «Вакантных месцаў па гэтым напрамку практычна няма», — запэўніў старшыня Мінгарвыканкама. У сваю чаргу кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што такая практыка можа быць распаўсюджана і на малыя населеныя пункты.

У канцы мерапрыемства кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэты рэспубліканскі семінар — своеасаблівы «мазгавы штурм», падчас якога былі агучаны прапановы па ўдасканаленні сістэмы ЖКГ. Калі гэта неабходна для іх рэалізацыі, варта прыняць адпаведныя заканадаўчыя акты да канца года, а калі гэта не з'яўляецца неабходнасцю — вольна выкарыстоўваць выказаныя ідэі. Таксама кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пры неабходнасці будзе прынята праграма па развіцці сістэмы ЖКГ.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ФОРМУ ПАШЫЛІ. ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ ПЕРАМАГЧЫ

## Прэзентавана парадная форма для алімпійскай зборнай Беларусі

**Камплект парадна-грамадзянскай формы для беларускіх спартыўных дэлегацый, якія ўдзельнічаюць ў зімовых XXIII Алімпійскіх і XII Паралімпійскіх гульнях 2018 года ў Пхёнчхане, створаны на аснове апошніх тэндэнцый сусветнай моды.**



Фота БЕЛТА.

**Беларускі дызайнер і аўтар праекта Людміла ЛАБКОВА** падчас мерапрыемства расказала:

— Для мяне галоўнае — паказаць магчымасці беларускіх прадпрыемстваў. Галоўным чынам таму, што давер беларускага пакупніка да айчынных вытворцаў усё ж пакуль вымушае жадаць лепшага. І таму наш прадукт накіраваны менавіта на папулярызацыю айчыннай прадукцыі. Гэта мая асабістая галоўная мэта ў межах праекта. Вядома, мы прадстаўляем краіну, таму нам хочацца выглядаць не толькі годна, але і самабытна, запамінальна. Мы і паспрабавалі ўвасобіць гэту думку ў праекце.

Адно з галоўных пытанняў, якое цікавіла ўсіх прысутных, — чым быў абумоўлены выбар менавіта шэрага колеру?

— Чаму менавіта ён? Шэры колер для Беларусі — гэта зімовы колер, — кажа Людміла Лабкова. — Ён найлепшым чынам паказвае беларускую прыроду гэтай пары года. Што датычыцца сусветных фэшн-трэндаў, то спалучэнне шэрага і чырвонага — гэта трэнд зімніх калекцый 2018 года. Таму шэры колер быў выбраны нездарма, — падкрэсліла дызайнер.

Для дзяўчат прапанаваны шэры касцюм, які складаецца з вузкіх пакарочаных штаноў з лампасамі і жакета на адным гузіку з фрачным каўняром, пад які можна надзець або прынтаваны джэмпер, або кашулю. Камплект для мужчын складаецца са штаноў, пінжака, сарочкі і фуфайкі.

Для хлопцаў — камплект з клецістых штаноў-бананаў і твідавага пінжака.

Галоўнай адметнай рысай, акцэнтам, які закліканы абазначыць нацыянальную прыналежнасць каманды, з'яўляецца спецыяльна створаны элемент беларускага арнаменту ў выглядзе сняжынкі, які ўвабраў у сябе сімвалы абярэгаў «маці», «ураджай», «поспех».

Такі арнамент вылучыць беларускіх спартсменаў сярод алімпійцаў іншых краін і падкрэсліць нацыянальную прыналежнасць.

— Капіраваць арнамент на беларускім сцягу на гэты раз мы не сталі, а стварылі свой прынт. Я спадзяюся, што гэты арнамент — сняжынка — прыжывецца і будзе запатрабаваны беларускімі пакупнікамі, — растлумачыла дызайнер.

Стала вядома, што ў хуткім часе, а менавіта ў лютым, паступяць у продаж элементы формы беларускай зборнай.

— Аб цане казаць яшчэ рана, але яна не будзе перавышаць кошт, устаnumляваны для пашыву камплектаў для саміх алімпійцаў, — расказаў намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам».

**Анастасія ГРУК, фота аўтара.**

# За адсутнасць кантролю

Палкоўнік Канстанцін Чарнецкі вызвалены ад пасады начальніка 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў Узброеных Сіл. Адпаведны Указ №383 Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў 20 кастрычніка, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Падчас расследавання крымінальнай справы па факце смерці радавога Аляксандра Коржыча былі выяўлены выпадкі парушэння статутных правілаў узаемаадносін паміж вайскоўцамі навучальнага цэнтра. Гэта стала магчымым у выніку безадказнага стаўлення шэрагу службовых асоб цэнтра да выканання сваіх службовых абавязкаў, а таксама адсутнасці кантролю за падтрыманнем воінскай дысцыпліны і правапарадку ў падпарадкаваным злучэнні з боку яго начальніка палкоўніка Канстанціна Чарнецкага.

■ Занятасць

# ДЗЕ ШУКАЦЬ РАБОТУ?

**Агульнагарадскі кірмаш вакансій пройдзе ў сталіцы 24 кастрычніка.**

Даведацца пра вакансіі можна будзе ў аўторак з 10.00 да 13.00 гадзін у Палацы культуры чыгуначнікаў (вуліца Чкалава, 7). У праграме — кансультацыі па пытаннях заканадаўства аб занятасці насельніцтва, стратэгіі пошуку работы. Будуць арганізаваны секцыі па прафарыентацыі і навучанні беспрацоўных, прадпрымальніцкай дзейнасці і працаўладкаванні інвалідаў.

Агульнагарадскія кірмашы вакансій у Мінску праходзяць двойчы на год — восенню і вясной. Мінулым разам мерапрыемства наведала больш за пяць тысяч чалавек. Удзельнічала 90 прадпрыемстваў, якія прадставілі каля 2,5 тысячы вакансій у розных сферах — будаўніцтве, гандлі, прамысловасці, адукацыі, ахове здароўя.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Ліга Еўропы

# ПОСПЕХ, ЯКІ ЗАХАВАЎ ШАНЦЫ

## Футбалісты барысаўскага БАТЭ ў дамашнім матчы перамаглі нямецкі «Кёльн» з лікам 1:0

**Лёс паядынку вырашыў адзіны гол гаспадароў — праз 10 хвілін пасля пачатку другога тайма лік адкрыў Аляксей Рыас. Пагроза каля варот гасцей ствараласа неадназразова, Гардзяйчук і Валадзько не змаглі рэалізаваць небяспечныя моманты, таму перамога атрымалася з мінімальным лікам. Гэтая вікторыя пакінула барысаўскаму клубу рэальныя шанцы працягнуць барацьбу за выхад у плэй-оф Лігі Еўропы.**

*— Самае галоўнае — гэта перамога. Каб захоўваць шанцы на выхад з групы, трэба было браць тры ачкі, —* адзначыў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр ЕРМАКОВІЧ.** *— Першы тайм у нас зусім не атрымаўся, гульцы проста не паспявалі за сапернікамі з «Кёльна». Там іншы футбол, іншыя хуткасці. Ведалі, што ў другім тайме нам будзе лягчэй. Сапраўды, «Кёльн» пачаў стамляцца, аслабла канцэнтрацыя. А як мы забілі, сапернік і зусім раскрыўся. У нас з'явілася прастора, з'явіліся контратакі. Шкада, што не забілі другі гол, які загадзя зняў бы ўсе пытанні. Але на апошніх хвілінах маглі прапусціць і самі...*

У іншым паядынку трэцяга тура групы Н сербская «Црвена Звезда» прымала англійскі «Арсенал» з Лондана і саступіла з тым жа мінімальным лікам 0:1.

***Турнірнае становішча пасля першага круга:*** «Арсенал» — 9 ачкоў (розніца мячоў — 8—3), «Црвена Звезда» — 4 (2—2), БАТЭ — 4 (4—5), «Кёльн» — 0 (1—5).

У наступным туры 2 лістапада футбалісты БАТЭ згуляюць у гасцях у «Кёльна», у Лондане «Арсенал» прыме «Црвену Звезду»

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Каталонія можа пазбавіцца аўтаноміі

Урад Іспаніі аб'явіў, што ў суботу, 21 кастрычніка, збярэцца на пасяджэнне, каб вырашыць пытанне аб адмене аўтаноміі Каталоніі для аднаўлення канстытуцыйнага парадку, паведамляе El Pais. Адпаведная заява была апублікавана пасля таго, як пасля заканчэння тэрміну чарговага ўльтыматуму ўлады Каталоніі адмовіліся адназначна адказаць: абвясцілі яны фармальна аб незалежнасці ад Іспаніі ці не.

Для аднаўлення парадку Мадрыд мае намер задзейнічаць 155-ы артыкул Канстытуцыі, які дазваляе прыпыніць паўнамоцтвы мясцовага кіраўніцтва і ўвесці знешняе кіраванне ў рэгіёне. Кіраўнік Каталоніі Карлес Пучдэмон у адказ заявіў, што калі артыкул будзе задзейнічаны, то рэгіён адназначна абвесціць аб незалежнасці. Тым часам сітуацыя ў Каталоніі не стала важнай тэмай на саміце ЕС, які праходзіць у Бруселі. Па словах кіраўніка Еўрапейскага савета Дональда Туска, для ўмяшання Еўрасаюза ў канфлікт паміж Мадрыдам і рэгіянальным урадам Каталоніі няма падстаў.

## Пуцін назваў звышзадачы для прэзідэнта Расіі

Расію неабходна зрабіць гнуткай, а таксама ў найвышэйшай ступені канкурэнтаздольнай. Пра гэта заявіў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, адказваючы ў ходзе пасяджэння «Валдайскага клуба» на пытанне аб задачах будучага прэзідэнта Расіі. «Гнуткай — з пункту гледжання развіцця эканомікі, нацэленай у будучыню — з пункту гледжання найноўшых тэхналогій, ацэнкі гэтых магчымасцяў і іх прымянення», — сказаў ён. Прэзідэнт таксама заявіў, што ў будучыні неабходна ўдасканальваць палітычную сістэму. «Вось гэта і ёсць звышзадача», — дадаў ён. Таксама Пуціну было зададзенае пытанне, ці можа жанчына стаць наступным прэзідэнтам Расіі. «У нас усё магчыма», — адказаў ён. Выбары прэзідэнта Расіі пройдуць 18 сакавіка 2018 года. Яшчэ ў лютым дзве федэральныя крыніцы паведамілі РБК, што Крэмль рыхтуецца да меркаваных выбараў з улікам таго, што Уладзімір Пуцін будзе балатавацца на новы тэрмін. Напярэдадні пра намер балатавацца на пост прэзідэнта Расіі заявіла тэлевядучая Ксенія Сабчак. У жніўні гэтага года фонд «Пецярбургская палітыка» назваў спікера Савета Федэрацыі Валянціну Мацвіенку магчымай пераемніцай прэзідэнта Уладзіміра Пуціна.

## Тэрміны склікання камісіі па справах японскай імператарскай сям'і не вызначаны

Урад Японіі абверг інфармацыю аб адрачэнні імператара Акіхіта ад пасады ў сакавіку 2019 года, паведамляюць інфармагенцтвы. Генеральны сакратар кабінета міністраў Ёсіхідэ Суга таксама абверг паведамленне пра тое, што неўзабаве будзе склікана нарада членаў імператарскай сям'і для вызначэння часу, калі цяперашні імператар пойдзе на спакой. Раней газета Asahi Shimbun паведаміла, што перадача трона наследнаму прынцу Нарухіта можа адбыцца ў канцы сакавіка 2019 года. Сёлета ў чэрвені ў Японіі ўступіў у сілу закон, які дапускае перадачу Хрызантэмавага трона пры жыцці цяперашняга імператара Акіхіта спадчынніку. Дакумент будзе дзейнічаць тры гады і рознічаны толькі на цяперашняга манарха. Для прынцыпу такога рашэння будзе склікана камісія па справах імператарскай сям'і з удзелам прадстаўнікоў трох галін улады і членаў імператарскай сям'і.

■ Ведай нашых!

# «Мне нават не па сабе ад таго, колькі ўсяго наздымаў...»

**...Падхапіцца ледзь не сярод ночы, ціхутка апранууцца, закінуць на плячо сумку з апаратурай, ступіць за дзверы — у снег, у туман...**
**Ісці — доўга, навобмацак, не бачачы сцежкі. Стаяць — ля рэчкі, альбо на знаёмым пагорку, слухаць цішыню і чакаць... Чакаць золаку, досвітку, каб убачыць — самому, сённяшні... Каб іншым паказаць (хоць на здымках!) гэтую заўсёдную таямніцу, гэта заўсёднае свята: свята нараджэння дня, альбо кветкі... Вясёлкі ці вясны...**



Больш за трыццаць гадоў ён здымае. Сказаць прафесійна, значыць, не сказаць нічога, бо **фотакарэспандэнт «Звязды» Анатоль КЛЯШЧУК** аўтар больш чым 30 персанальных выстаў (у тым ліку ў Аўстрыі, Германіі, Японіі, Кітаі, Злучаных Штатах... У Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Еўрапарламенце...), аўтар і сааўтар фотаальбомаў «Пад небам Беларусі», «Чарнобыль», «Чарнобыль 1986—2006. Жыць з трагедыяй», «Беларусь. Зямля песняроў», «Карагод беларускіх абрадаў», Майстар, здымкі якога не проста ўпрыгожваюць газету, іх ведаюць і памятаюць многія чытачы. Яны ж — ганарацца асабістым знаёмствам, бо на карце Беларусі няшмат населеных пунктаў, дзе б спадар Анатоль яшчэ не бываў.

А ўжо колькі ўсяго здымаў — нечаканага, рэдкага, сумнага, цікавага, смешнага, прыгожага... Падзеі, краявіды, святы і абрады, дарогі, вакзалы, паводкі, пажары, балоты, будоўлі, народныя гулянні, птушкі і звяры... Як прызнаўся сам *(гл. інтэрв'ю на сайце «Звязды»)*: «Мне нават не па сабе ад таго, колькі ўсяго наздымаў! У тым ліку — нікому не патрэбнага... Пакуль».

Але ж галоўнае — не што здымаў, а каго: у аб'ектыве спадара Анатоля заўсёды былі і застаюцца людзі, многія з якіх сёння, у шасцідзясяты яго дзень нараджэння, хацелі б падзякаваць яму — за працу, за дапамогу, за навуку, пацісунць руку, абняць, а то і пацалаваць (калі дазволіць)...

**Са святам, калега! Здароўя! Новых дарог, сустрэч і творчых поспехаў!**

**Звяздоўцы.**

■ Акцэнт на здароўе

# «Я ПРЫЗАДУМАЎСЯ...»

## Наваполацкія «Маці супраць наркотыкаў» дзейнічаюць...



**Перамагчы алкагольную або наркатычную залежнасць можна. Шанцы павялічваюцца, калі звяртаешся па дапамогу. У 22 гарадах краіны працуе Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Маці супраць наркотыкаў». Шмат гадоў таму менавіта мамы ўключыліся ў барацьбу за сваіх дзяцей, якія ўжывалі зелле. Стварыла арганізацыю ў Мінску Алена Пісарэнка, сын якой быў у залежнасці. Аднак паступова да суполкі пачалі далучацца бацькі і алказалежных дзяцей. Яны збіраліся ў групы ўзаемадапамогі, абмяркоўвалі набалелае. Сапраўды, у выпадку такіх цяжкіх залежнасцяў, як алкагольная і наркатычная, першымі біць трывогу пачынаюць сузалежныя сваякі, як правіла, маці і жонкі. Бо самі залежныя — сын, муж — проста не здольны крытычна ацэньваць свае паводзіны (такая спецыфіка псіхічнага захворвання, да якога адносяцца алкагалізм і наркаманія).**

Дарэчы, для сузалежных вельмі важным аказваецца гаварыць сабе «стоп!» кожны раз, калі захочацца вырашыць праблемы залежнага. А праблемы ў яго ёсць, ды яшчэ колькі! З работы такіх рана ці позна выганяюць, грошай ім пастаянна не хапае, здароўя не дадаецца, сям'я распадаецца. То правы на ваджэнне адабралі, то пабіўся з некім... Унутранай матывацыі ў хворага на алкагалізм/наркаманію няма ніякай — псіхаактыўнае рэчыва робіць так, каб чалавека цікавіла толькі само гэта рэчыва. Таму варта прыбягаць да матывацыі знешняй — складанне пратаколаў, прызначэнне штрафаў, пазбаўленне бацькоўскіх правоў, накіраванне ў лячэбна-працоўны прафілакторый... Часам адно пазбаўленне залежнага ўсякай матэрыяльнай падтрымкі штурхае яго на пошук паратунку. Руку дапамогі працягваюць сёння тыя ж грамадскія арганізацыі, дзе ўсё ананімна і добраахвотна.

— На нумар +375 29 512 97 87 нам званяць сваякі, якіх мы запрашаем на групу менавіта для сузалежных, — кожны чацвер, з 19 да 21 гадзіны, — расказвае **старшыня наваполацкага гарадскога аддзялення Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Маці супраць наркотыкаў» Любоў БУЛГАКАВА.** — З Полацка нават часам прыязджаюць маці з бацькам залежнага сына. Гэтыя сустрэчы неабходны, каб навучыцца правільным паводзінам з хворым сваяком, і практыка паказвае, што як толькі мы пачынаем ратаваць сябе, то адначасова ратуем і залежнага. Хоць апошняму, безумоўна, патрабуецца спецыфічная дапамога — напрыклад, медыцынская, і тады мы падкажам, дзе шукаць урача-нарколага, а затым і рэабілітацыйная, больш працяглая і вельмі важная. Апошнім часам наша арганізацыя цесна супрацоўнічае з цэнтрам «Права на жыццё», што ў пасёлку Рудня пад Мазыром, і хрысціянскім рэабілітацыйным цэнтрам «Вяртанне» ў Баранавічах — для залежных больш сталага ўзросту. Эфект ад такой работы адназначна ёсць, некаторым удаецца дасягнуць стойкай рэмісіі на працягу многіх гадоў.

Разам з псіхолагам сацыяльна-педагагічнага цэнтра наваполацкія «Маці» арганізавалі групу для маці-выпівох, якім на працягу шасці месяцаў даецца шанц выправіцца, каб не пазбавіцца бацькоўскіх правоў. Дзеці ў гэты час пражываюць у цэнтры або прыёмнай сям'і. 2-гадовае дзіця ўзяла пад часовую апеку і Любоў Булгакава, якая аформіла разам з мужам прыёмную сям'ю. Бацькі-выпівохі абавязаны тым часам наведваць урача-нарколага і групу ўзаемадапамогі пры сацыяльна-педагагічным цэнтры.

У апошнія гады «Маці супраць наркотыкаў» працавалі і ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, які да нядаўняга часу існаваў у горадзе. Некаторыя ўдзельнікі дзвюх груп урэшце здолелі адаптавацца да цвярозага жыцця — вярнуўшыся па месцы свайго пастаяннага пражывання, уладкаваліся на работу, завялі сем'і. Той, хто вырваўся з залежнасці сам, як правіла, застаецца дапамагаць іншым, бо адаптацыя да новага жыцця прадугледжвае і патранаж над тым, хто толькі спрабуе. Сёння лячэбна-працоўны прафілакторый у Наваполацку закрыты. Аднак «Маці супраць наркотыкаў» маюць намер аднавіць сваю работу са звольненымі, якія маюць залежнасці. Пакуль яны адбываюць пакаранне, ім прапануецца толькі кансультацыйная дапамога, а пасля вызвалення ахвотныя могуць адправіцца на рэабілітацыю.

— Па запыце любой нашай установы адукацыі, пачынаючы са школ і заканчваючы Полацкім дзяржаўным універсітэтам, асабіста я праводжу спецыяльныя інтэрактыўныя заняткі па тэме залежнасцяў ад тытуню, алкаголю і наркотыкаў, — тлумачыць Любоў Леанідаўна. — Пасля адной з апошніх сустрэч з першакурснікамі па традыцыі было прапанавана ацаніць каштоўнасць атрыманай інфармацыі. Як правіла, падлеткі пішуць, што сэнс у гэтым адназначна ёсць. У адной школе хлопец нешта напісаў: «Я думаў, што ў 16 гадоў пакаштую ўсё, але дзякуй, што папярэдзілі». Наогул меркаванні розныя, нехта напісаў, што «не варта рабіць рэзкія вывады пра чалавека, які выпіў піва, але не злоўжывае. Не лічу, што ён адразу становіцца дэградантам і будучыні ў яго няма». Або вось: «Для мяне заняткі ніякай ролі не сыгралі, бо я ніколі нічога не ўжывала і ўжываць не збіраюся», «Нічога новага не даведаўся, усё, што мы і ведалі», «З задавальненнем паслухала б яшчэ», «Прызадумаўся, каб кінуць курыць»...

Уводныя заняткі для школьнікаў рознага ўзросту называюцца «Усё пачынаецца з малога». Што радуе нас летам і чаго няма ўжо восенню, зімой? — пытаецца спачатку Любоў Леанідаўна ў аўдыторыі. Пасля невялічкай падказкі дзеці здагадваюцца, што размова пра кветкі. А што трэба, каб яны раслі? Дзеці пералічваюць: паліваць, падкормліваць, каб сонца грэла. Рэдка хто здагадаецца назваць барацьбу з пустазеллем, але менавіта да гэтай думкі і важна падвесці, каб перайсці да галоўнага: а што ў нашым жыцці ёсць пустазелле? Што перашкаджае чалавеку нармальна жыць і развівацца? І дзеці здагадваюцца, што гэта тытунь, алкаголь і наркотыкі.

Тэма перадачы ВІЧ-інфекцыі не абыходзіцца без гульні, яна называецца «Аўтограф». Школьнікам раздаюцца паперкі, якія трэба перадаваць адно аднаму, каб пакідаць свае аўтографы. Напрыканцы вядучы просіць падняцца таго, каму дасталася паперка з чырвонай кропкай на адваротным баку. Так дзеці вучацца разумець, што чыста знешне ніколі не зразумееш, што ў чалавека ёсць інфекцыя. А яна тым часам распаўсюдзілася.

— Я кажу і аб тым, што верагоднасць заражэння адна — пры тых жа сексуальных кантактах яна не надта вялікая, аднак статыстыка колькасці выпадкаў указвае на тое, што большасць выпадкаў перадачы інфекцыі адбываецца менавіта палавым шляхам, — заўважае Любоў Леанідаўна. — Пра чысціню стасункаў паміж маладымі людзьмі можна расказаць праз нейкія зразумелыя ўсім рэчы. Прапаную, напрыклад, задумацца, чаму ніхто з нас не купіў бы ўжо адкрыты калісьці ёгурт?

Супрацоўнікі «Маці супраць наркотыкаў» займаюцца прафілактыкай перадачы палавых інфекцый і сярод прадстаўніц секс-бізнесу — на шашы, стаянках, прыдарожных кафэ дзяўчынам раздаюць інфармацыйныя матэрыялы, дзе пазначаны магчымасці ананімнага бясплатнага медыцынскага абследавання, у тым ліку на ВІЧ па сліне за 15 хвілін. Абследавана такім чынам ужо каля 200 жанчын, адной з якіх — са станоўчым вынікам — арганізавалі сацыяльнае суправаджэнне да ўрача-інфекцыяніста для далейшага абследавання.

У арганізацыі працуе і **ананімны кансультацыйны кабінет (вул. Калініна, 5, тэлефон «гарачай» лініі: +375 29 523 68 69)**, у якім праводзіцца работа са спажыўцамі ін'екцыйных наркотыкаў і людзей, якія маюць беспарадкавыя палавыя сувязі, па фарміраванні ў іх адказнага стаўлення да свайго здароўя. Наладжаны тут і абмен шпрыцаў для нарказалежных. А з 2014 года дзейнічае сумесны праект арганізацыі «Маці супраць наркотыкаў» і **Цэнтра дружалюбнага стаўлення да падлеткаў «Дыялог», які размяшчаецца на базе дзіцячай паліклінікі (тэл. +375 214 51 90 90)**. Звяртацца сюды могуць не толькі тыя, каму да 18 гадоў, але і крыху старэйшыя — каб атрымаць кансультацыю спецыяліста, прайсці тэст на ВІЧ. Сёлета гэта ўжо зрабілі 47 падлеткаў ■



### На Віцебшчыне...

✓ усяго зарэгістравана звыш 1200 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі (з ВІЧ жывуць 933 чалавекі);

✓ доля заражэння ВІЧ праз палавы шлях склала сёлета 95 працэнтаў;

✓ найбольшая колькасць выпадкаў зарэгістравана ў Лёзненскім, Талачынскім, Полацкім, Гарадоцкім, Бешанковіцкім, Віцебскім, Расонскім, Дубровенскім раёнах і Віцебску.

### У Наваполацку...

✓ 68 чалавек жывуць зараз з ВІЧ (а ўсяго было зарэгістравана 79 выпадкаў);

✓ у апошнія гады пераважае палавы шлях перадачы (фактычна 100 працэнтаў выпадкаў);

✓ у полі зроку ўрачоў-нарколагаў псіханеўралагічнага дыспансера Наваполацкай цэнтральнай гарадской бальніцы — 72 афіцыйныя нарказалежныя і 1382 пацыенты з сіндромам алкагольнай залежнасці.

■ Дабрачыннасць анлайн

# АД КОЖНАГА З НАС

**ЮНІСЕФ і «Пріорбанк» запусцілі інавацыйны дабрачынны праект нацыянальнага маштабу. У найбліжэйшыя тры гады плануецца сабраць каля аднаго мільёна долараў. Стаць часткай глабальнай місіі можа кожны ахвотны.**

Чым больш сродкаў удасца сабраць, тым лепш можна будзе рэалізаваць падтрымку сем'яў з дзецьмі — забяспечыць сацыяльнай і медыцынскай дапамогай па месцы жыхарства, стварыць альтэрнатыўныя формы сямейнага ўладкавання дзяцей-сірот, у тым ліку з інваліднасцю і асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, а таксама заняцца прафесійнай арыентацыяй падлеткаў, якія пражываюць у інтэрнатах. Сабраныя грошы плануецца патраціць на адкрыццё дзясяткаў рэсурсных пакояў для дзяцей, падрыхтоўку школ для навучання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і інваліднасцю, дача апошнім магчымасці ўдзелу ў сацыяльным жыцці і прафесійнай дзейнасці, абсталяванне шэрагу дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

**Доктар Рашэд Мустафа САРВАР, прадстаўнік ЮНІСЕФ у Рэспубліцы Беларусь**, заўважае, што дабрачыннасць сёння — гэта пра сацыяльную культуру, пра разуменне таго, што дзеці маюць патрэбу не ў разавай дапамозе, а ў пастаяннай увазе. Сёння ў краіне каля 12 тысяч дзяцей жывуць у інтэрнатах рознага тыпу, а значыць, не маюць доступу да клопату сям'і, адпаведных магчымасцяў для рэалізацыі ўласнага патэнцыялу. Тым часам каля 30 тысяч дзяцей з інваліднасцю, частка якіх выхоўваецца ў тых жа інтэрнатных установах, маюць патрэбу ў інклюзіўнай адукацыі, і да гэтага павінны быць гатовыя мясцовыя таварыствы, заўважае **рэгіянальны дырэктар ЮНІСЕФ па Еўропе і Цэнтральнай Азіі Афшан ХАН.** Яна звяртае ўвагу і на тое, што Беларусі трэба далучацца да той паўсотні краін свету, дзе сёння для вырашэння глабальных задач эфектыўна выкарыстоўваецца карпарацыйнае сацыяльнае партнёрства.

Першым партнёрам праекта стаў найбуйнейшы прыватны банк Беларусі — «Пріорбанк», які з дапамогай перадавых плацежных тэхналогій аб'яднае дзеля добрай справы не толькі прыватных, але і карпарацыйных кліентаў у нацыянальным маштабе. Зрабіць ахвяраванні можна проста і хутка — праз мабільны банк, інтэрнэт-банк і банкаматы. Падрабязнасці на сайтах ЮНІСЕФ (www.unicef.by/prior-deti) і «Пріорбанка» ■

Матэрыялы падрыхтавала **Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары




Дзеткавічы Баранавіцкага раёна

# «ДЗЕНЬ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ СТАЎ НІБЫ СВЯТАМ НАШАЙ МАЛАДОСЦІ»

**У Дзеткавічах хоць і зарэгістравана сем чалавек, пастаянна пражываюць тры жанчыны.**
**— Некалі ўсё было: і школа, і магазін, у калгасе працавалі, у лясніцтве, на чыгунцы, людзей было шмат, многа моладзі на танцы збіралася, — расказвае 82-гадовая Раіса ЛЕБЕДЗЕВА. — А цяпер нас засталося трое. Яшчэ дзве суседкі аднаго са мной веку: Люба і Вольга. Вось так і жывём.**

Як толькі мы са старшынёй Жамчужненскага сельскага Савета Валерыем Германам зайшлі да Раісы Уладзіміраўны і павіталіся (28 верасня. — **Аўт.**), гаспадыня найперш пацікавілася, ці будзе сёлета сустрэча ў Доме культуры з нагоды Дня пажылых людзей. І пачуўшы ў адказ, што такая сустрэча запланаваная на 3 кастрычніка, паведаміла, як яны ўжо рыхтуюцца да вечарыны.

Валерый Міхайлавіч заўважыў, што сельсавет вялікі, у яго склад уваходзяць дзясяткі населеных пунктаў. Таму мерапрыемствы для пажылых людзей праводзіцца некалькі. Пенсіянеры з тых вёсак, якія раней уваходзілі ў склад калгаса з цэнтрам у Сеўруках, і збіруцца ў Сеўруках. Спонсарам вечароў выступае цяперашняя гаспадарка — ААТ «Птушкафабрыка «Дружба». На гэты дзень сельгаспрадпрыемства выдзяляе аўтобус, які праязджае па населеных пунктах і падвозіць удзельнікаў свята. Потым, зразумела, развозяць па дамах. Усе загадзя рыхтуюцца, дастаюць святочныя ўборы, некаторыя гатуюць смачныя пірагі, каб пачаставаць сяброў-знаёмых.



Да прыезду герояў дня сталы ўжо накрываюцца, прыязджаюць самадзейныя артысты, каб даць душэўны канцэрт. Ну, і ў канвертах грашовая дапамога ў гонар Дня пажылых людзей прадугледжана.

— Для нас гэта сапраўднае свята, — расказвае Раіса Уладзіміраўна. — Мы ж цэлы год не бачымся. А раней многія працавалі ў адным калгасе або жылі па суседстве, а потым раз'ехаліся, калі стварылі сем'і. Ёсць нават тыя, якія ў школе ў адзін клас хадзілі, а сёння ім ужо за семдзесят. Уяўляеце, як цікава сустрэцца, пагаварыць пра дзяцей-унукаў, расказаць навіны за год? А яшчэ любім пагаманіць пра сваю старасць, у кожнага яна розная. І самае галоўнае — успомніць, якімі былі некалі, як жылі раней. Ведаеце, гэта сустрэча — як свята нашай маладосці. Мы забываем пра ўзрост, спяваем песні ранейшых гадоў, можам і патанцаваць. Таму і чакаем дня сустрэчы.

Гэтым разам Раіса Уладзіміраўна, вядома ж, расказвала сваім сяброўкам юнацтва пра тое, што ўдалося нарэшце памяняць крыж на ўездзе ў Дзеткавічы. Гэта зроблена найперш яе клопатам. Менавіта яна тэлефанавала ў сельскі Савет, паведамляла, што стары крыж згніў, вось-вось разваліцца, тэрмінова патрабуе замены. Валерый Герман дамовіўся з мясцовым прадпрымальнікам. Ігар Дубіна на сваім прадпрыемстве зрабіў новы крыж, які і прывезлі ў вёску. Устанаўліваць галоўны вясковы атрыбут-абярэг узялася сям'я Раісы Лебедзевай. Цяпер Раіса Уладзіміраўна яго даглядае, павесіла самаробныя ручнікі, прапалвае траву. Дачка яе той крыж пафарбавала. І ён дыхтоўны, трывалы, бачны здалёк.

Старшыня сельскага Савета расказаў, што Раіса Лебедзева заўсёды адрознівалася актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Калі паўстала пытанне аб добраўпарадкаванні могілак, яна хадзіла па дамах, размаўляла з людзьмі, потым збірала грошы, за якія ўдалося знесці вялікія дрэвы. Яшчэ колькі гадоў таму Раіса Уладзіміраўна была душой на любым святочным мерапрыемстве, бо любіць паспяваць, павесяліцца. Цяпер гады крыху бяруць сваё.

Але бабуля Рая не здаецца, гадуе курачак, садзіць агарод і бульбу. Яна нарадзілася і вырасла ў гэтай вёсцы. Працавала і на чыгунцы, і ў калгасе. Расказала, што бацьку свайго не памятае, бо загінуў ён на вайне. Маці адна гадавала траіх дачок. Праўда, старэйшая сястра памерла ў дзень свайго 18-годдзя. Вось ёй ды сваім бацькам нядаўна памяняла помнікі на вясковых могілках.

— Такія ў мяне цяпер клопаты, — расказвае Раіса Уладзіміраўна. — Мая бабуля пражыла 96 гадоў, мама — 75, невядома, колькі мне адведзена, але ж трэба варушыцца, нешта рабіць, пакуль жывы.

У 82-гадовай жыхаркі Дзеткавічаў трое дзяцей. Уладкаваліся яны недалёка: двое ў суседняй вёсцы Палонка, адзін у Баранавічах. Усе прыязджаюць, матулі дапамагаюць па гаспадарцы, прывозяць усё неабходнае. Два разы на тыдзень у вёску заязджае аўтакрама. Да машыны ідуць дзве пенсіянеркі, трэцяя ўжо занадта слабая. «Прывозяць усё-ўсё, не горш за тыя «еўраопты», толькі б грошы былі, — гаворыць бабуля Рая. — Але ж пенсію, дзякуй богу, атрымліваем. Бульбу выкапалі, агарод прыбралі, будзем зімаваць ды вясну чакаць».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ Факт

## Кітайскі масаж

**У Гродна можна атрымаць фізія- і іголкарэфлексатэрапію, вода- і травалячэнне, пайсці на масаж і заняткі ёгай паводле традыцыйнай усходняй медыцыны.**

Праект коштам 600 тысяч долараў ажыццявілі інвестары з правінцыі Ганьсу. Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны ўзведзены каля дзіцячай паліклінікі абласнога цэнтра. Па словах старшыні Гродзенскага гарвыканкама Мечыслава Гоя, рашэнне аб адкрыцці было прынятае пасля таго, як гродзенская дэлегацыя наведала такі цэнтр у Кітаі. Прапанаваныя тут методыкі скіраваныя на рэабілітацыю і прафілактыку захворванняў. У новым цэнтры будуць працаваць як нашы спецыялісты, так і кітайскія — пасля атрымання неабходных сертыфікатаў для работы ў беларускай сістэме аховы здароўя.

Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны — другі аб'ект, узведзены кітайскімі інвестарамі ў Гродне. Нядаўна запушчаны ў эксплуатацыю смецясартавальны завод, на чарзе — праект па рэканструкцыі гасцініцы «Гродна». У мінулым годзе гандлёва-прамысловая карпарацыя правінцыі Ганьсу набыла 16-павярховы будынак гасцініцы. Праект прадугледжвае стварэнне 4-зоркавага гатэля, рэстарана кітайскай кухні, офісных і гандлёвых памяшканняў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# ЗВЫЧАЙНЫ ЦУД АД ДОКТАРА САМАРЫНА

## Вясковая бальніца развівае экспарт паслуг

**У Гарадоцкім раёне ёсць вёска Халамер'е, участковую бальніцу ў якой ведаюць замежнікі, а таксама зоркі беларускай эстрады, вядомыя спартсмены і міністры.**
**Галоўны ўрач Міхаіл Самарын тут па ўнікальнай методыцы лечыць міжпазваночную грыжу і суставы.**

### «Адчыняў вокны з рамамі»

Міхаіл Самарын у Віцебску скончыў медыцынскую ВНУ. Нядоўгі час папрацаваў у абласной бальніцы. Але захацелася свабоды ў прафесійным плане: ініцыятыўны малады тэрапеўт паехаў у глыбінку. Гэтаму рашэнню здзівіліся многія.

— Бацька не хацеў адпускаць. Ён быў заслужаны настаўнік, дырэктар школы... Так, мне рамантыкі хацелася, адчуць сябе ў ролі «чэхаўскага» доктара, які лечыць усё, за ўсё адказвае, — успамінае галоўны ўрач Халамерскай участковай бальніцы.

Спачатку папрацаваў каля двух гадоў у вёсцы Селішча. Там уваходныя дзверы ў драўляную бальніцу былі завешаны коўдрай. Вокны, сантэхніка ў жудасным стане, ацяпленне не функцыянавала. Але ён не збег у горад. Наадварот, вырашыў пабудаваць бальніцу сваёй мары.

На паперцы зрабіў малюнак, паказаў яго таварышу-архітэктару. Потым упэўніў адказных асоб мясцовай улады ў тым, што зможа сам дабіцца фінансавання з рэспубліканскага бюджэту. Абяцаў знайсці будаўнічыя матэрыялы. А ў 1980-я гады перыядычна яны былі ў дэфіцыце, як і большасць тавараў. Напрыклад, тэлефонны апарат.



Галоўны ўрач Міхаіл САМАРЫН з сынам Канстанцінам.

І ён зрабіў «звычайны цуд».

Дарэчы, ён адным з першых загаварыў у краіне пра геранталагічнае абслугоўванне.

— Магу знайсці запіс з маім інтэрв'ю рэспубліканскаму тэлебачанню, якое даў у 1988 годзе. Гэта цяпер «сацыяльныя ложкі» — распаўсюджаная справа. А тады пра неабходнасць лячыць хваробы старых не казалі на афіцыйным узроўні, — працягвае доктар.

Акрамя бальніцы ў Селішчы пабудавалі кацельню і катэджы для медыкаў. Добрыя ўмовы для працы і годнае жыллё дапамаглі вырашыць кадравае пытанне.

### Сарафаннае радыё

У СМІ і інтэрнэце не знайсці інфармацыю пра платныя паслугі, якія аказвае Халамерская ўчастковая бальніца.

— Як даведваюцца пра нас? Добрае пытанне! Сарафаннае радыё — найлепшы піярщык. Вось паглядзім, хто ў нас на сёння лечыцца. Хлопец з Казахстана, людзі са Смаленска, Брэста, Санкт-Пецярбурга, Стаўрапаля. І артыстаў лечым, і міністраў, — сціпла пералічвае кіраўнік медыцынскай установы.

Сын Міхаіла Самарына — Канстанцін — таксама працуе ў вясковай бальніцы. Акрамя таго, ён таленавіты музыкант, валодае некалькімі музычнымі інструментамі і можа за пару тыдняў асвоіць новы. Канстанцін Самарын стварыў калектыў «De Puta Madre Banda», які выступаў на «Славянскім базары ў Віцебску», іншых фестывалях, у тым ліку ў Расіі... Піша музыку. Канстанцін Міхайлавіч з Халамер'я з'язджаць не хоча. Ад бацькі ён пераняў сакрэты лячэння.

### Узровень ва ўсім

Мы праходзімся па бальніцы. Тут усё прадумана да дробязяў, нават шыльда. Недалёка — праваслаўны храм. Яго пабудавалі таксама па ініцыятыве медыкаў.

Заходзім у кабінеты. Звычайная палата-блок на двух пацыентаў: у кожнага свой пакой, агульная прыбіральня. Хворы глядзяць праграму спадарожнікавага тэлебачання. Бальніца разлічана на адначасовае лячэнне 25 чалавек. Яна — адзіная ў Беларусі, якая юрыдычна мае статус сельскай участковай.

Галоўны ўрач мае выдатнае пачуццё гумару. Адчуваецца, што з ім лёгка працаваць калегам. А людзі расказваюць пра яго залатыя галаву і рукі...

**Намеснік старшыні райвыканкама Марына ЗДОЛЬНІКАВА** лічыць, што дзякуючы такім ініцыятыўным спецыялістам, як Міхаіл Самарын, глыбінка развіваецца.

— Медыцынскі турызм у нашым раёне прыцягвае шмат прыезджых. І гэта бальніца — узорны прыклад. Улада паклапацілася, каб была добрая дарога да вёскі. На рабоўту крамы па суседстве з бальніцай няма вялікіх нараканняў. Было б добра стварыць у вёсцы і цэнтр беларускага фальклору — на базе вясковага дома культуры. Каб іншаземцы маглі цікава правесці час, пазнаёміцца з традыцыйнай культурай беларусаў, — разважае яна.

Высокі ўзровень медыцынскіх паслуг у звычайнай вёсцы — доказ таго, што правінцыя можа канкураваць з буйнымі гарадамі. А доктар Самарын — чалавек, які пераўтварае наваколле.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГРОДНО РЕМБЫТТЕХНИКА»

| | Лот №1 | Лот №2 |
|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика, сведения о земельном участке, информация | **Изолированное помещение инв. №400/D-83397** (нежилое помещение на 1-м этаже пятиэтажного жилого дома) общей площадью 58 кв. м, железобетонные панели, 1971 г. п., кадастровый номер земельного участка 440100000002000706.<br>_Информация:_ *возможно использование нежилого помещения под размещение объекта общественного назначения по согласованию с заинтересованными службами города и УГАИ УВД Гродненского областного исполнительного комитета с соблюдением требований технических нормативных правовых актов.*<br>*В случае реконструкции либо изменения целевого назначения использования нежилых изолированных помещений законодательством об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности в Республике Беларусь предусмотрена необходимость оформления разрешительных документов на разработку проектной документации и производство работ* | **Капитальное строение инв. №400/С-87092** (гараж) общей площадью 30 кв. м, силикатные блоки, 1994 г. п., кадастровый номер земельного участка 440100000001001546, площадь – 0,0283 га (охранная зона систем газоснабжения – 0,0214 га, тепловых сетей – 0,0142 га), целевое назначение – эксплуатация и обслуживание гаражей; **капитальное строение инв. №400/С-87093** (блок гаражей) общей площадью 176 кв. м, силикатные блоки, 1988, 1992 г. п., кадастровый номер земельного участка 440100000001002581, площадь – 0,0638 га (охранная зона тепловых сетей – 0,0279 га, линий электропередачи – 0,0021 га, систем газоснабжения – 0,0110 га), целевое назначение – содержание и обслуживание гаражей.<br>_Информация:_ *согласно действующему генеральному плану развития города Гродно земельный участок, на котором расположены строения, находится в границах территории, на которой предусмотрено перспективное размещение общественной застройки и торгово-обслуживающих объектов, обустройство ландшафтно-рекреационной зоны (озеленение территории общего пользования) и инженерное оборудование, и капитальные строения по ул. Титова, 24 в перспективе развития города Гродно сохранению не подлежат* |
| Обременения | Аренда по 31.10.2018 г. (в случае продажи, арендатор обязуется освободить помещение в течение 10 дней с даты заключения договора купли-продажи) | Блок гаражей (капитальное строение инв. №400/С-87093) сдается в аренду по 15.07.2018 г. |
| Местонахождение | г. Гродно, ул. Пролетарская, 71 | г. Гродно, ул. Титова, 24 |
| Начальная цена | **54 240 рублей с учетом НДС** | **43 356 рублей с учетом НДС** |
| Сумма задатка (5%) | **2 712 рублей** | **2 168 рублей** |

Сведения о продавце: ОАО «Гродно Рембыттехника», г. Гродно, пер. Виленский,16, тел./факс 8 (0152) 77 14 79

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X , УНП 500481906

| | | | |
|---|---|---|---|
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20 дней с даты проведения торгов | Условия оплаты | по согласованию сторон |

**Торги состоятся 21 ноября 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

Срок подачи документов: **по 15 ноября 2017 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8**

**Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by**

Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8(0152) 74 49 11, 77 23 79

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Червенское районное потребительское общество |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Магазин №17** | Здание специализированное розничной торговли | 163,6 кв. м | 615/С-16336 | Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Советская |

Составные части и принадлежности: склад

***Сведения о земельном участке***: пл. 0,0488 га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации объектов торговли

**Начальная цена с НДС 20% – 22 892,70 бел. руб. (снижена на 25%)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете **«Звязда» от 11.02.2017**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **03.11.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **01.11.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |

## Извещение о повторном аукционе 01 ноября 2017 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| **Наименование объекта** | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54080 «Заготовительный цех» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54079 «Деревообрабатывающий цех» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями» |
|---|---|---|---|---|---|
| **Номер лота** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1 |
| **Тип помещения** | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| **Общая площадь (кв. м)** | 3982,2 | 4516,7 | 3351,5 | 12954,0 | 3482,1 |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | 1,444 | | 3,574 | | |
| **Начальная цена продажи** | 206 828,90 | 234 471,39 | 230 554,37 | 291 992, 17 | 133 092,91 |
| **Шаг аукциона** | 5% от начальной цены | 5% от начальной цены | 5% от начальной цены | 5% от начальной цены | 5% от начальной цены |
| **Сумма задатка** | 20 682,90 | 23 447,15 | 23 055,45 | 29 199, 21 | 13 309, 29 |
| **Условия продажи** | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка** | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 м$^{2}$ каждый. В состав входят: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м$^{2}$. Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 м$^{2}$ каждый. В состав входят: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м$^{2}$. Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Одноэтажное, в состав входят: склад пиломатериалов 1389 м$^{2}$, навес 284 м$^{2}$, водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальто-бетонное покрытие 1876 м$^{2}$, бетонное покрытие 2751 м$^{2}$, линия электропередачи (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Одно- и двухэтажное, в состав входят: склад пиломатериалов с бетонным покрытием 3051,3 м$^{2}$, сушильные камеры 6 шт., навес 72 м$^{2}$, циклоны 3 шт., помещение для газовой сварки со складом, санитарно-бытовые и административные помещения, асфальто-бетонное и бетонное покрытие 4979 м$^{2}$, электрический кабель 96,7 м, ливневая и фекальная канализация 203,8 м Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г. |

| **Наименование объекта** | **Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями)** | **Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий»** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58323 «Помещение арматурного цеха»** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58322 «Помещение формовочного цеха с эстакадой для принятия бетона»** | **Комплекс зданий и сооружений (помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центом с инвентарным номером 130D-58321; склад готовой продукции с инвентарным номером 130/С-44660; очистные сооружения с инвентарным номером 130С-44951; комплект гаражей с инвентарным номером 130/С-44658; железнодорожный путь с инвентарным номером 130/С-44660)** |
|---|---|---|---|---|---|
| **Номер лота** | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11П | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-3 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1--2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1 |
| **Тип помещения** | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| **Общая площадь (кв. м)** | 539,0 | 1930,1 | 3200,6 | 1944,40 | |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | 0,1827 | 0,3941 | | | |
| **Начальная цена продажи, рублей** | 67 418,89 | 1 706 493, 50 | 537 753,90 | 351 792,81 | 5 879 310, 44 |
| **Шаг аукциона** | 5% от начальной цены | 5% от начальной цены | 5% от начальной цены | 5% от начальной цены | 5% от начальной цены |
| **Сумма задатка, рублей** | 6 741,89 | 170 649,35 | 53 775,39 | 35 179, 28 | 587 931, 04 |
| **Затраты на оценку, организацию и проведение аукциона, рублей** | | 1498,71 | | | |
| **Условия продажи** | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| **Сведения об объекте** | Одноэтажное здание. Канализационная сеть 73 м, водопроводная сеть 20,4 м, бетонное покрытие 701 м$^{2}$. Ввод в эксплуатацию – 1992 г. | Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 м$^{2}$, помещение ремонтно-механического участка 294 м$^{2}$, помещение цеха доборных изделий 1456 м$^{2}$, пристройка 12 м$^{2}$, навес 24 м$^{2}$, градирня 33 м$^{2}$, два теневых навеса 7 м$^{2}$. Покрытие бетонное 1030 м$^{2}$. Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | Одноэтажное, состоит из 1 пролета. Длина: 131,84 м. п, ширина: 24,27 м. п;<br>Крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | Одноэтажное, состоит из 1-го пролета. Длина: 13,90 м. п., ширина: 17,87 м. п.;<br>крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | – помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центром: площадь – 18836,2 кв. м, в том числе здание арматурного цеха – 4230 кв. м, бетоносмесительный центр – 206 кв. м;<br>крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г.<br>– склад готовой продукции: площадь – 14347 кв. м, 4 пролета, (материал покрытия площадки: цементо-бетон, колонны железобетонные с металлическим каркасом). Ввод в эксплуатацию – 1973 г.<br>– здание очистных сооружений: площадь 205 кв. м, крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>– 2 (два) резервуара для воды: материал – бетон; наружная площадь: 108 кв. м; объем: 300 м$^{3}$. Ввод в эксплуатацию – 1994 г.<br>– комплект гаражей: площадь – 66,8 кв. м, одноэтажное, крыша (кровля): рулонная битумная; полы: бетон; вентиляция естественная. Ввод в эксплуатацию – 2010 г.;<br>– железнодорожный путь: протяженность – 3981,7 м. Ввод в эксплуатацию – 1971 г. |
| **Организатор аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | | | | |
| **Продавец аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | | | | |

Аукцион состоится **1 ноября 2017 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале.

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии», р/счет BY16BAPB30124701200210000000 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление BAPBBY21401, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 31 октября 2017 г. включительно.
3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;
4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов;
5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 31 октября 2017 года включительно, тел. 80165 37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон 375-29-640-80-37.

■ Партнёры

# ЛЕТАПІС ГІСТОРЫІ І СУЧАСНАСЦІ

## Да 100-годдзя «Звязды» Інстытут журналістыкі БДУ падрыхтаваў зборнік навуковых даследаванняў

**«Звязда» працягвае святкаваць свой юбілей. Гэтым разам падарунак найстарэйшай штодзённай газеце краіны зрабілі нашы пастаўшчыкі журналісцкіх кадраў, а таксама даўнія партнёры і сябры. Інстытут журналістыкі БДУ зладзіў круглы стол, прысвечаны стагоддзю «Звязды», — «Гісторыя краіны пяром публіцыстаў». Акрамя таго, нашы калегі з журфака правялі шэраг навуковых даследаванняў, якія змясцілі пад кніжнай вокладкай.**

Перш чым распачаць канферэнцыю, да яе ўдзельнікаў звярнулася начальнік інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Таццяна Хмель, якая перадала прывітальное слова міністра інфармацыі Аляксандра Карлюкевіча, лёс якога самым шчыльным чынам знітаваны са «Звяздой».

— Газета заўсёды была маяком у журналісцкай дзейнасці нашай краіны, — адзначыў **дырэктар Інстытута журналістыкі БДУ Сяргей ДУБОВІК.** — На публікацыях «Звязды» вучыліся будучыя журналісты, па газетных артыкулах у свой час ЦК КПБ прымаў пастановы і важныя рашэнні. За сто гадоў свайго існавання «Звязда» была тым стрыжнем, вакол якога фарміравалася наша дзяржаўнасць. І галоўнае — беларуская газета ніколі не здраджала



роднаму слову, матчынай мове.

Не адно пакаленне журналістаў-пачаткоўцаў праходзіла ў «Звяздзе» практыку, сотні выпускнікоў журфака пачыналі ў беларускамоўнай газеце свой шлях. Сёння многія «звяздоўцы» з задавальненнем дзеляцца сваім багатым вопытам з будучымі тварамі айчыннага друку, эфіру і інтэрнэт-прастораў. Уладзімір Андрыевіч, Таццяна Падаляк, Леанід Лахманенка з цеплынёй успаміналі гады (дзесяцігоддзі!), якія яны прысвяцілі роднай газеце на роднай мове.

На думку аднаго з **даследчыкаў беларускага друку Алега СЛУКІ**, «Звязда» з'яўляецца люстэркам як нашай гісторыі і культуры, так і ўвогуле развіцця беларускага народа. «Ні адна газета, ні адно выданне на ўсёй еўрапейскай прасторы не мае такой гераічнай гісторыі, — падкрэсліў доктар гістарычных навук. — «Звязда» фактычна арганізавала ідэалагічную Перамогу над акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. І сёння, якія б палітычныя вятры не дзьмулі, якая б эканамічная сітуацыя не складвалася ў нашай Беларусі, «Звязда» вытрымлівае выпрабаванне часам».

Выкладчыкі Інстытута журналістыкі, якія далі пуцёўку ў жыццё не аднаму пакаленню таленавітых журналістаў, прысвяцілі «Звяздзе» шэраг навуковых артыкулаў. І дзеля гэтага нават не трэба было адхіляцца ад асноўнай тэмы, якой на працягу многіх гадоў займаецца кожны з даследчыкаў. Наша газета стала нагодай для роздуму як і ў гістарычным плане, так і ў рэчышчы культуры, мовы, міжнароднага жыцця... Не забыліся навукоўцы і прааналізаваць, як газета прадстаўлена ў інтэрнэт-асяроддзі, акрэсліць асноўныя тэндэнцыі ў развіцці сучаснага выдання, казалі і пра перспектывы.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Нетрывіяльныя думкі

# Змяняцца трэба, калі ў бізнесе ўсё добра

## Прапануем прадпрымальнікам некалькі слушных парад ад вядомага расійскага практыка

**Пра тое, як, калі і навошта трэба нешта перакройваць у рабоце прадпрыемства, расказвае стваральнік і саўладальнік кансалтынгавай кампаніі «Berner & Stafford», аўтар збытавай тэхналогіі Вадзім Дазорцаў. Як зразумець, што ў арганізацыі наспела неабходнасць перамен? Як вылічыць, дзе менавіта і што менавіта прыйшла пара мяняць? Як забяспечыць уцягванне супрацоўнікаў у працэс змен? Ці рэальна зрабіць так, каб кожны супрацоўнік разумеў сваю ролю ў поспеху кампаніі? На прамыя пытанні павінны быць шчырыя адказы.**

Сігналы да перамен можна падзяліць на дзве групы, лічыць Вадзім Дазорцаў. Першая — рацыянальныя: стагнуюць або падаюць продажы, сыходзяць кліенты або запавольваецца дынаміка іх прыцягнення, мяняюцца паказчыкі цякучкі кадраў у аддзеле продажаў. Прычым апошняе не абавязкова азначае частую змену персаналу. Калі супрацоўнікі вельмі доўга працуюць на адным месцы і калектыў не абнаўляецца — гэта таксама нядобра.

### 5 ці 10 гадоў — і ў зону рызыкі?

Ёсць адзін вельмі адчувальны момант — выгаранне супрацоўнікаў у продажах. Кіраўнікі часта не хочуць гэтага ўсведамляць. Спікер лічыць, што ў такой нашай постсавецкай рэчаіснасці сярэдні жыццёвы цыкл чалавека на адным месцы ў адной кампаніі складае пяць гадоў. Якая з гэтага напрошваецца выснова? Што трэба абнаўляць аддзел продажаў. А ўявіце кампанію, паспяховую, дзе супрацоўнікі працуюць па 10 гадоў? Рэзаць прыйдзецца па жывым. Але гэта — ужо асобная гісторыя кіраўніцкай смеласці і мудрасці — умець глядзець аб'ектыўна на рэаліі. Ёсць і выключэнні, калі такія старажылы выступаюць ініцыятарамі змен. Калі кіраўнік асцерагаецца такіх сітуацый, то перад укараненнем змяненняў лепш за ўсё запрасіць бізнес-псіхолага і высветліць стан кожнага супрацоўніка. Гэта дазволіць убачыць людзей, якія знахо-



дзяцца ў зоне рызыкі, і з імі лепш расстацца да пачатку змен.

### Рынкавае акно магчымасцяў

Другая група сігналаў аб неабходнасці перамен — ірацыянальныя. «На мой досвед магу сказаць, што прадпрымальнікам варта давяраць сваёй інтуіцыі. Бывае, кіраўнік кампаніі адчувае, што вось-вось будуць нейкія вялікія праблемы. Ці наадварот: па справаздачах выходзіць, што ўсё добра, але ёсць адчуванне, што магло быць яшчэ лепш, што патэнцыял кліентаў, патэнцыял рынку не выкарыстоўваецца ў патрэбнай меры. І вось гэтаму пачуццю дакладна трэба давяраць», — лічыць Вадзім Дазорцаў. Ёсць так званае рынкавае акно магчымасцяў, і яно адкрываецца нячаста. Таму, калі ў кампаніі сёння ёсць магчымасць працаваць больш інтэнсіўна і расці, іх абавязкова трэба выкарыстоўваць. Бо, калі акно магчымасцяў зачыніцца, канкурэнцыя вырасце і вы будзеце змагацца ўжо за кожнага кліента. І атрымліваецца, што, не даверыўшыся інтуіцыі, можна страціць час, калі вы маглі «зняць вяршкі з рынку».

### Статус лідара ў кампаніі

Перамены заўсёды выклікаюць супраціўленне персаналу. Як правільна падрыхтаваць ключавых супрацоўнікаў?

Прыватны бізнес, часцей за ўсё, уладкаваны аўтарытарна, на аўтарытэце кіраўніка. Таму першы пасыл менавіта да яго: трэба думаць пра ваш статус у кампаніі, трэба яго разумнымі спосабамі заваёўваць. Асабліва ў добры перыяд для бізнесу. І калі наступаюць цяжкія часы, вы з дапамогай свайго аўтарытэту можаце данесці да супрацоўнікаў, што трэба рабіць і навошта. Стварэце ў іх нейкі вобраз будучыні. Гэта значыць можаце прадаць ім ідэю перамен. У рэшце рэшт пакажаце, што вы, як лідар, разумееце сутнасць таго, што адбываецца вакол, каб людзі вам верылі. Наступны крок — план змен. Іх трэба прадумаць у «штабе» — як падчас вайны. Так, частка рашэнняў будзе балючая, і пра гэта трэба адразу адкрыта сказаць супрацоўнікам.

У любых зменах самае праблемнае — гэта злом старой звычкі і фарміраванне новай. Вельмі важна скласці разумны, плаўны, але няўхільны план іх укаранення. Людзі не могуць за адзін дзень перабудавацца. Кожны тыдзень крок за крокам вам прыйдзецца іх мяняць. І ўвесь аўтарытэт лідара заключаецца ў тым, каб выразна даць зразумець камандзе, што дарогі назад няма — ні ў іх, ні ў вас.

Чаму важная плаўнасць змен? Людзі павінны бачыць прамежкавыя дасягненні. Але тут вельмі важна даць зразумець, што яны — гэта прыступкі вялікай лесвіцы на шляху да агульнай мэты. Колькі часу запланаваць на правядзенне змен? Практыка паказвае, што людзі прывыкаюць не хутка — прыкладна 100 дзён, такая вось магічная лічба.

### Работа «па-новаму» — да аўтаматызму

Кіраўнік павінен разумець, што зменам людзей трэба навучыць. Не варта спадзявацца, што яны самі разбяруцца, прымуць іх. Просты прыклад. Вы ўкараняеце новую сістэму. Супрацоўнікаў трэба навучыць ёю карыстацца, а гэта 10—20 гадзін трэніровак. Уявіце жыццёвую сітуацыю. У вашага супрацоўніка праз паўгадзіны сустрэча з кліентам, адначасова ў яго звоніць тэлефон і прыходзіць ліст на e-mail. І ў гэты момант яму трэба стварыць картку кліента ў сістэме. А яму толькі сёння растлумачылі, як гэта рабіць. І што, ён будзе глядзець у інструкцыю?

Не, у яго павінен быць гэты працэс ужо даведзены да аўтаматызму. Таму, перш чым патрабаваць ад супрацоўніка працы «па-новаму», пераканайцеся, што ён усё дакладна засвоіў і давёў свае дзеянні да «раз-два». Ёсць кіраўнікі, у якіх пастаяннае жаданне нешта палепшыць, памяняць, паспрабаваць. Гэта выдатна, але трэба разумець, што не ўсе супрацоўнікі — такія ж. Трэба даць ім час папрацаваць у спакойным рэжыме.

### Прымусіць варушыцца

Як праводзіліся змены ў рэальных арганізацыях? Раскажам на адным цікавым прыкладзе. Кампанія «А» шмат гадоў займаецца дыстрыбуцыяй прамысловай сантэхнікі. Па ўсіх фінансавых паказчыках гэта паспяховая кампанія, абарот — некалькі дзясяткаў мільёнаў еўра ў год. Пры гэтым росту ўжо даўно няма, і кіраўніцтва разумее, што доўга так працягвацца не можа, — трэба нешта рабіць і падымаць продаж. Але штат прадаўцоў кампаніі — гэта супрацоўнікі, якія тут вельмі даўно, яны кансерватыўныя ў дачыненні да змен. І тады было прынята цікавае рашэнне.

Сумесна з уладальнікамі кампаніі мы вырашылі стварыць паралельны, новы аддзел продажаў, пакінуўшы стары. Дамовіліся падзяліць рэгіёны працы (навічкам аддалі менш прыбытковую частку). Калі сталі набіраць новых людзей, адзін з уладальнікаў прапанаваў ад іх аддзела зняць нават іншае памяшканне, каб яны не мелі зносін фізічна (у курылках) са старымі супрацоўнікамі. Усё атрымалася проста ідэальна. Праз тры месяцы ў пачаткоўцаў назіралася станоўчая дынаміка продажаў. Прыкладна праз 4—5 месяцаў некаторыя з іх сталі прыносіць такі ж вынік, як і старыя супрацоўнікі, якія працавалі з больш прыбытковымі кліентамі. «Стараслужачыя» пачалі дазнавацца пра гэта па справаздачах, сталі «падглядаць» за навічкамі. У выніку праз нейкі час адбылося аб'яднанне гэтых аддзяленняў і частка старых супрацоўнікаў сышла. Але частка — перабудавалася і стала працаваць у новым тэмпе. Усяго гэтая гісторыя доўжылася прыкладна год.

### Натхніць ідэяй найлепшых

Што зрабіць, каб работнікі разумелі сваю ролю ў поспеху кампаніі? Гэта аўтарытэт кіраўніка: сапраўднаму лідару многія супрацоўнікі проста паверыць і пойдуць за ім. Другое — навучанне. Перш чым патрабаваць ад супрацоўніка што-небудзь, яго гэтаму трэба навучыць і разам з ім замацаваць вынік. Трэцяе — трэба ўцягнуць паспяховых супрацоўнікаў у працэс змен. Пры гэтым кіраўнік паказвае, што яму важнае іх меркаванне, і яны ў такім выпадку менш супраціўляюцца пераменам. А акрамя таго, яны аўтарытэты для ўсіх астатніх, хай і асабістае стаўленне да іх не заўсёды добрае.

> **Даведка**
>
> Вадзім Дазорцаў — саўладальнік шэрагу паспяховых расійскіх кампаній, валодае вопытам аператыўнага і стратэгічнага кіраўніцтва прадпрыемствамі, якія працуюць у сферы вытворчасці, дыстрыбуцыі і паслуг. Кіраўнічы вопыт, шырокі кругагляд і валоданне сусветнымі практыкамі арганізацыі і павелічэння продажаў адчынілі яму дзверы ў свет бізнес-кансультавання. У сапраўдны момант Вадзім з'яўляецца вядучым кансультантам у галіне кіравання продажамі ў Расійскай Федэрацыі.

### Галоўнае — своечасова пачаць

А цяпер пра тры галоўныя памылкі, якія здзяйсняюць кіраўнікі. Першае — яны рашаюцца на змены занадта позна. Калі продажы падаюць — гэта значыць, што час ужо ўпушчаны. Мяняцца трэба, калі ўсё стабільна добра. Але гэта і цяжэй за ўсё зрабіць. Другое — кіраўнікі спадзяюцца, што супрацоўнікі самі правядуць усе змены. Але без уцягвання кіраўніка нічога не адбудзецца. Трэцяе — непадрыхтаванасць. Нельга «нахрапам» за тыдзень усё змяніць, вы працуеце не з праграмай, а з людзьмі, з іх звычкамі і натурай. Таму да змен трэба рыхтавацца, гэта доўгая гісторыя.

***Аўтар выказвае ўдзячнасць супрацоўнікам прэс-службы ЗАТ «Інфапарк-праект» за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.***

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# ПРАГА ЖЫЦЬ ЗМЯНЯЕ АСЯРОДДЗЕ

## Як дружная сям'я медыкаў адраджае былую веліч старажытнага фальварка на Гродзеншчыне

**Усё пачынаецца з кахання. З чаго ж яшчэ? У 1989 годзе ажаніліся Павел і Наталля, студэнты Мінскага медыцынскага інстытута, а сёння іх старэйшы сын Раман Клімук не толькі нашчадак прафесіі бацькоў — ён таксама ўрач, але і адзін з уладальнікаў аграсядзібы пад Гроднам, якая мае гучную назву Каралінскі фальварак Тызенгаўза.**


Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.
Гаспадары старадаўняй сядзібы Павел і Наталля КЛІМУКІ.

**Усё пачалося з веры.** Некалі католік Павел абвянчаўся з праваслаўнай Наталляй. Невыпадкова, што першым будынкам на тэрыторыі, дзе цяпер агракластар, стала капліца. Ксёндз Юзэф Макарчык так блаславіў, а пара сужэнцаў яго паслухалася. Пасля гэтага значна змяніліся адносіны мясцовых да прышлых людзей. Вясковыя бабулькі рады, што цяпер не трэба на нядзельную службу ездзіць далёка. Ну а пра тое, Хто сапраўды спрыяў важнай справе, маўчу.

**Насамрэч усё пачалося са студэнцкага будатрада.** У сярэдзіне 80-х юны Павел разам з будучымі калегамі-медыкамі працаваў з кельняй і кіркай у руках — будаваў фермы, дамы. Так набываліся інжынерныя і арганізатарскія навыкі. Вопыт не перашкаджае і дагэтуль, таму хоць і страшна спачатку было брацца за вялікую справу адраджэння гістарычнай сядзібы, але ж ведаў, з якога боку падступіцца. Тым больш да пачатку работ на фальварку Павел Клімук ужо пабудаваў уласную клініку ў Гродне, дзе і дагэтуль займаецца прыватнай медыцынскай практыкай. Так што адраджаць запушчаную дашчэнту сядзібу пачаў з пэўным досведам.

**А можа, усё пачалося з дружбы?** Менавіта сябры заахвочвалі лёгкіх на пад'ём Наталлю з Паўлам ездзіць у вандроўкі па Беларусі. Такім чынам маладыя людзі — а іх і цяпер інакш не назавеш — сталі глыбока цікавіцца гісторыяй роднага краю. Напрыклад, яны разам працавалі на раскопках у Траецкім прадмесці. У міжнародных лагерах за мяжой жылі ў старажытных сядзібах. Там упершыню ўбачылі, як можна ў такіх пабудовах захоўваць і падтрымліваць гістарычны каларыт.

**Не выключана, што ўсё пачалося з нашчадкаў.** Іх сёння трое ў Клімукоў. Дарэчы, другі сын, Антон, цяпер набывае тую ж спецыяльнасць, што і бацькі — і ў той жа ВНУ. А вось дзевяцігадовы малодшы Сцяпан гаворыць, што будзе дырэктарам Каралінскага фальварка Тызенгаўза. Пакуль жа, калі бачыць, што недзе смецце раскідана, без напамінку і без залішняга гонару бярэцца за венік і прыбірае. Сапраўдны гаспадар, што казаць.

**Усё пачалося чвэрць стагоддзя таму.** Павел звярнуў увагу на маёнтак яшчэ ў 1992 годзе, калі шукаў, дзе жыць пасля заканчэння інстытута, і прыехаў па размеркаванні ў Гродна. Маладому чалавеку вельмі спадабаліся тутэйшыя мясціны. Але ў той час не склалася: участак пад дом выдзелілі ў суседніх Каробчыцах. А пра тое, як тут было ў 2003 годзе, калі Клімукі сталі ўладарамі толькі аднаго памяшкання ў сённяшнім «Радавым гняздзе» (назва галоўнага будынка ў сядзібе), нагадваюць цяпер толькі старыя фотаздымкі ды гістарычныя рэшткі брамы, пабудаванай з бута і камення ў другой палове XVIII стагоддзя.

**Усё пачыналася з продкаў.** Калі зусім акунацца ў гісторыю, вядома, што асвойвалі гэтыя землі ў XVI стагоддзі ўплывовыя татарскія роды. Яны тады атрымалі прывілей на валоданне тэрыторыяй ад каралевы Рэчы Паспалітай Боны. Падчас рэканструкцыі асноўнага сядзібнага дома, які шмат разоў перабудоўваўся, знайшлі цэглу, якая па сваёй структуры і памеры была характэрная для XV—XVI стагоддзяў. Усе шматлікія гаспадары маёнтка невядомыя, бо архіў згарэў, аднак дакладна вядома, што ў другой палове XVIII стагоддзя фальварак належаў гродзенскаму старосту Антонію Тызенгаўзу.

**Тызенгаўз усё пачаў з падаткаў.** Менавіта падскарбій (міністр фінансаў) Вялікага Княства Літоўскага Антоній Тызенгаўз, чалавек аўтарытарнага складу думак, прымусіў тутэйшых плаціць падаткі. І ўвогуле пачаў праводзіць шматлікія радыкальныя рэформы, якія не падтрымліваліся мясцовай шляхтай. Калі ў казне з'явіліся грошы, ён пачаў увасабляць ідэі, запазычаныя ў еўрапейскіх сталіцах. Хацеў, каб на Гродзеншчыне было лепш, чым у Парыжы ці Варшаве. За 20 гадоў ён адкрыў звыш 15 мануфактур — суконную, палатняную, панчошную, карэтную, зброевую і іншыя. Па яго ініцыятыве ў горадзе над Нёманам былі пабудаваны жылы, адміністрацыйны і культурны комплекс, заснаваны тэатр, музычная капэла, медыцынская акадэмія, кадэцкі корпус, музей гісторыі прыроды, закладзены самы буйны ў Еўропе батанічны сад... Гродзенскі староста паўплываў і на гісторыю вёскі Караліно, гаспадаром якой быў пэўны час. Аднак у 1780 годзе яго абвінавацілі ў растратах каралеўскай маёмасці і пазбавілі ўлады. Перажыць гэтага стары халасцяк так і не змог, і ў 52 гады, забыты і адзінокі, памёр ад сухот.

**Усё пачыналася ў вёсцы Караліно наноў шмат разоў,** бо пасля смерці Тызенгаўза сядзіба закладалася за даўгі і пераходзіла з адных рук у іншыя. Дарэчы, адзін з гаспадароў, Спірыдон Гансоўскі, у сваім тэстаменце падрабязна апісаў усё, што тут знаходзілася ў другой палове XIX стагоддзя, і нават даў парады, якую вытворчасць развіваць выгадна. Зрэшты, сённяшнія гаспадары не робяць стаўку на даход ад сядзібы, гавораць, што дагэтуль у большай ступені занятак агратурызмам — справа стратная. Сямейнае захапленне хоць занадта дарагое, але любімае, у якое ўкладзены не толькі грошы, але і душа.

**З душы ўсё і пачынаецца,** хоць пра матэрыяльны бок справы ніхто не забывае. Клімукі, якія асталяваліся тут надоўга, сцвярджаюць, што сёлетнія змяненні ў заканадаўстве дадуць новы подых агратурызму. Людзі, якія жывуць на вёсцы і самі клапоцяцца пра яе развіццё, цяпер змогуць мець не заўсёды стабільны, але дадатковы даход. У тым ліку ад правядзення вяселляў ці карпаратываў.

— У гэтым сектары ёсць магчымасць рэалізавацца, — адзначае Павел Клімук. — Нехта шые, нехта вяжа, хтосьці пчалярствам займаецца... Тыя, хто можа працаваць, атрымалі магчымасць і падзарабіць. Але ж гэта бізнес нестабільны, бо на яго значна ўплывае сезон, надвор'е, інфляцыя... А расходы па ўтрыманні пастаянныя. Важна спакойна працаваць і ваганні ў законах не павінны ўплываць на справы.

**Патрыятызм. З яго ўсё пачынаецца?** Быццам занадта ўзнёслае слова, але ж Наталля дагэтуль з цеплынёй успамінае сваю беларускамоўную школу на Брэстчыне і сачыненне па-беларуску пры паступленні ў медыцынскую ВНУ. Павел нагадвае, што ў яго першым пашпарце была напісана нацыянальнасць — паляк.

— Я нарадзіўся ў мястэчку Ясная Паляна Калінінградскай вобласці, якое раней мела назву Тракенен. Там вывелі знакамітую тракененскую пароду коней. Па чутках, радавая сядзіба, дзе я жыў у былой стайні, перароблены пад кватэры, магла належаць генерал-фельдмаршалу Паўлюсу. Калі мне было шэсць гадоў, бацькі вярнуліся сюды, на радзіму. Мы тут усе рознай крыві, але ж добра дамаўляемся адно з адным. Я кайфую ад фізічнай працы. На мне фінансаванне, рэстаўрацыя і дызайн. Наталля адказвае за кухню, гаспадарку і прыборку. Прыём гасцей — справа Рамана. Антон вельмі нам дапамагаў, пакуль у інстытут не паступіў, ён адзін выкошваў усе газоны. А тэрыторыя ў нас між тым — 2,5 га. Плюс абкошваем вакол сядзібы. Малодшы Сцяпан тут вырас — ён можа правесці экскурсію па сядзібе.


Фота Нэлі ЗІГУЛІ.
Так выглядае маёнтак у нашы дні.

**Усё пачынаецца з усмешкі.** Пра гэта добра ведаюць гаспадары, асноўная спецыяльнасць якіх — стаматалогія. Аднак важна не толькі ствараць усмешку штучна, але і дэманстраваць шчыра і часцей. Напрыклад, ёсць вялікая мара пабачыць усмешлівых мытнікаў і памежнікаў. А яшчэ пачуць, як яны з гасцямі размаўляюць па-англійску. Да таго ж, калі замежнікі, якія пачалі карыстацца пяцідзённым бязвізам, будуць менш часу марнаваць на мяжы, радасці ўсім прыбавіцца.

— Сюды, да нас у сядзібу, прыязджаюць розныя людзі: навукоўцы, пісьменнікі, мастакі, — гаворыць Наталля. — Пяць гадоў запар мы праводзім тут пленэр творцаў з розных краін. У якасці падзякі яны нам пакідаюць свае карціны — так ствараецца наша мастацкая галерэя. Для нас важныя стасункі з людзьмі культуры. Гэта і нам дае вельмі многа. Мне ўсё роўна, якую пасаду займае чалавек. Важна, каб ён адсюль павёз станоўчы эмацыянальны настрой.

**З бязвізу і настальгіі таксама пачынаецца многа.** Гаспадары аграсядзібы, якая знаходзіцца на адлегласці дзесяці кіламетраў ад Польшчы, гавораць, што грамадзяне суседняй краіны пратапталі сюды сцяжынку. Тым больш што многіх з іх, як і нашчадка апошняга дасавецкага ўладара сядзібы Козел-Паклеўскага, звязвае з Гродзеншчынай гісторыя ўласных продкаў. З 1921 па 1939 год гэта была польская тэрыторыя, і ў многіх адтуль ёсць сваякі па гэты бок мяжы. Між тым і літоўцы, якім да Гродна рукой падаць, праяўляюць цікавасць і ўпэўнена адкрываюць для сябе новую Беларусь. Дапытлівыя расіяне час ад часу наязджаюць.

**Шлях да фальварка пачынаецца з запыту ў інтэрнэт.** За стасункі з наведвальнікамі ў фальварку адказны Раман Клімук. Сусветнае павуцінне — яго вотчына, і такім віртуальным чынам ён актыўна падтрымлівае цікавасць да сядзібы. Старэйшы з сыноў арганізоўвае адпачынак гасцей:

— Часцей за ўсё пра нас даведваюцца праз інтэрнэт ці тых, хто тут ужо пабываў. Мы імкнёмся захаваць дух фальварка. Ён не толькі ў архітэктуры пабудоў, але і ў шматлікіх легендах, якія спадарожнічаюць сапраўднай старажытнай гісторыі. Напрыклад, ноччу некаторыя чуюць тут гукі клавесіна. У нашай сядзібе ёсць падземны ход, які вядзе ў пакой, дзе недаступна мабільная сувязь. Дарэчы, гавораць, што некалі там праходзілі таямнічыя сходы масонаў. Адным з іх быў і Тызенгаўз. Тут і стайня з коньмі, і музей быту, і млын — воданапорная вежа па сумяшчэнні, карэты, більярды, корт, лазні, сажалкі... У Караліно каля 300 гадоў таму была менавіта гасцявая сядзіба, і мы цяпер працягваем традыцыю — адусюль прымаем гасцей.

**Такім чынам, усё пачынаецца з любові.** Да сваякоў, да справы, да зямлі, да сядзібы — да радзімы ўрэшце. Усё пачынаецца з адказнасці за тое, што цэніш. З гонару, што табе пашанцавала рэалізоўвацца менавіта тут, менавіта такім, звыш дадзеным чынам.

— Важна мець прагу жыць, — у адзін голас гавораць Клімукі і шчыра ўсміхаюцца. — Усё толькі пачынаецца. І працяг будзе абавязкова, бо планаў развіцця Каралінскага фальварка Тызенгаўза безліч.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by


Фота фальварка першай паловы XX стагоддзя, калі ён належаў Козел-Паклеўскім.


Так выглядаў фальварак у Караліно да рэстаўрацыйных работ у пачатку гэтага стагоддзя.

# ДЗЕ ХАВАЕЦЦА ДУША ГОРАДА?

Вандроўка ў любым горадзе для сапраўднага турыста пачынаецца з музеяў, тых скарбніц, дзе захоўваецца гісторыя і не толькі яна. У горада, вядома, ёсць гісторыя. А яшчэ ў яго павінна быць свая душа, свая аўра, нешта такое, што адрознівае ад іншых, акрамя архітэктуры і традыцыйных славутасцяў. У Парыжы, напрыклад, асаблівым месцам называюць набярэжную Сены, не вельмі і прыгожую, але прыцягальную, дзе любяць тусавацца мастакі, пісьменнікі, творчая моладзь. У Маскве раней такім быў Арбат, не ведаю, як цяпер. Але і ў любым іншым, нават маленькім горадзе бывае нешта такое, што адрозніване. Дык вось аднойчы я адкрыла для сябе азначэнне «такога» — калі гараджане-месцічы любяць свой горад, яно ёсць, інакш усё набліжаецца да аднароднай масы.

Памятаю, як у Парыжы мяне некалі ўразіла пажылая парыжанка на востраве Сітэ, дзе праходзяць кожную гадзіну натоўпы турыстаў. Вось прайшла чарговая група, і нехта кінуў пад ногі ўпакоўку ад марожанага. А яна падышла, падхапіла, пашукала вачыма сметніцу і, не знайшоўшы, пайшла далей, каб выкінуць паперчыну ў патрэбным месцы. Значыць, ёй не абыякавы свой горад. Значыць, у яго ёсць душа. І складаюць яе людзі. Вось такіх людзей я шукала падсвядома ў Гродне... і часам знаходзіла іх.

І першыя сярод іх — **Наталля і Павел КЛІМУКІ, гаспадары сядзібы «Каралінскі фальварак Тызенгаўза».** Медыкі па адукацыі і сферы дзейнасці, яны з юнацтва апантаныя гісторыяй роднага краю, разам з таварышамі аб'ехалі ўсю Беларусь у пошуках гэтай самай гісторыі. А сядзіба-фальварак стала вынікам духоўнага развіцця іх сям'і, агульнай справай жыцця сужэнцаў-аднадумцаў. Дарэчы, музей у сядзібе не проста цікавы ілюстрацыямі, гістарычнымі звесткамі, але забаўны, відовішчны. Бо там размясціліся побач раставыя лялькі палітыкаў-антаганістаў Тызенгаўза і Кацярыны II. Падрыхтаванае крэсла-трон для яшчэ адной лялькі, віноўніка многіх перыпетый, у тым ліку і названага фальварка, — караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Партрэт караля і яго асабістае бюро знаходзяцца ў гісторыка-археалагічным музеі. Музеем цяпер сталі сярэднявечныя замкі — стары і новы. «Дык гэта тут быў абкам партыі?» — спытала я ў хударлявай захавальніцы фондаў. «Так», — адказала яна з усмешкай, пад якой хаваўся лёгкі налёт пагарды. Маўляў, цётка нібыта з нашых, не іншаземка, а такія звычайныя рэчы не ведае.

— Падумаеш, не ведала, — запярэчыла я ёй у думках, — якія вы тут ганарлівыя. Маючы такія замкі, ды Фарны касцёл, ды старадаўнюю Каложу, і дурань можа ганарыцца, бо ёсць чым... А я цяпер буду ведаць. А гэты замак, можа, і захаваўся добра таму, што там быў абкам.

Фарны касцёл, вядома, і сам можа прэтэндаваць на званне музея, а насупраць мог бы быць касцёл не горшы, але яго няма. І першая сустрэчная гараджанка мне расказала, што тая маладая, несумненна, таленавітая падрыўніца з Ленінграда, якая разлічыла да міліметра схему ўзрыву так, што знакамітая Фара Вітаўта зляжылася, нібы падстрэленая жывая істота, дык вось, тая жанчына вельмі дрэнна скончыла. Яна памерла хворая, паралізаваная, няшчасная. Пра гэта раскажа кожны, хто любіць свой горад.

З любоўю паказвала нам аптэку-музей яго гаспадыня Вікторыя Ткачова. Найстарэйшая аптэка ў Беларусі, пабудаваная езуітамі ў 1709-м і сёння стаіць на вуліцы Савецкай ды служыць гараджанам XXI стагоддзя аптэкай. З гонарам паказвала нам захавальніца рэцэпты і допісы гарадзенскага фельчара, почырку якога маглі б пазайздросціць нават імператарскія пісары. Пісьмо, трэба сказаць, унікальнае па мастацтве каліграфіі. А яшчэ там ёсць гербарыі, уласнаручна афармленыя Элізай Ажэшкай. Ну і асобнае месца займаюць інструменты для анатаміравання трупаў. Менавіта такімі ўпершыню ва Усходняй Еўропе ўскрывалі сярэднявечныя медыкі цела Стафана Баторыя, які раптоўна памёр тут, у Гародні. Тут жа і правялі анатаміраванне. І хоць прычыну не ўстанавілі, пакінулі апісанне для нашчадкаў.

Складваецца ўражанне, што асобай караля польскага і вялікага князя літоўскага Стафана Баторыя тут асабліва ганарацца. І не толькі музейныя работнікі ды спецыялісты. Памяць пра гаспадара гродзенскіх замкаў падтрымліваецца ў назвах многіх устаноў. Вось і на Савецкай плошчы ёсць утульны гандлёвы цэнтр з кавярняй пад назвай «Баторыя». Там прыпыніліся карэспандэнты «Звязды» перад ад'ездам дадому выпіць кавы. Калі ў адным з аддзелаў кафетэрыя я стала ў хвост чаргі, каб купіць бутэльку вады ў дарогу, сімпатычная і ветлівая прадавец параіла: «Прысядзьце, хутка чаргі не будзе». І так прыемна стала ад мімалётнага маленечкага знаку ўвагі, што захацелася прыехаць сюды яшчэ...

Дарэчы, раю вам абавязкова пабываць у Музеі гісторыі рэлігіі і Музеі харальнай сінагогі, куды я завітала год таму. Там цікавыя як самі музеі, так і іх будынкі. У першым выпадку гэта былі палац Храптовічаў, у другім — самая прыгожая па архітэктуры сінагога, якую даводзілася бачыць, яе яшчэ называюць найпрыгажэйшай у Еўропе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*


Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

**Кафедральны касцёл Святога Францішка Ксаверыя ў Гродне.**

# Убачыць Гродна — і пажадаць застацца

**Усю дарогу марыла, каб сустрэча адбылася пры сонейку, але горад сустрэў нас шэрым бясконцым дажджом. У такое надвор'е лепш за ўсё сядзець за кубачкам кавы (або ў панскай сядзібе, якая гасцінна прыняла вандроўных уласных карэспандэнтаў «Звязды») і слухаць заспакойлівую мелодыю дажджу. Але, як той казаў, прыгажосць нічым не сапсуеш. Для магіляўчанкі, што жыве ў горадзе, якому Стафан Баторый у свой час падараваў Магдэбургскае права, было справай гонару паглядзець на яго рэзідэнцыю — Стары замак, які першапачаткова будаваў яшчэ адзін вялікі князь — Вітаўт. Гродна наогул адзіны горад у Беларусі, дзе захаваліся аж два каралеўскія замкі — спачатку ён быў рэзідэнцыяй літоўскіх князёў, потым каралёў Рэчы Паспалітай.**

Прыемнае прадчуванне сустрэчы з гэтымі славутасцямі пачалося яшчэ на адной са старадаўніх вуліц Гродна — Савецкай, якую таксама называюць «гродзенскім Арбатам», бо тое, што жыццё тут вірує пастаянна, відаць простым вокам. Шмат утульных кавярняў, афіцыйных офісаў і крам, павольна гуляюць турысты, спяваюць вулічныя музыкі. Сёлета тут з'явіліся шыльды з варыянтамі назваў вуліцы — Віленскі гасцінец, Віленская, Гімназіяльная, Саборная, Дамініканская.

Калі б не **начальнік аддзела гісторыі краю Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Яўген МАХНАЧ,** які стаў нашым гідам, не хапіла б фантазіі ўявіць, наколькі разнастайнай была гэта вуліца. На жаль, ад старадаўніх будынкаў, першыя з якіх тут з'явіліся, мяркуючы па шыльдзе, у XVI стагоддзі, засталіся толькі падмуркі ды першыя паверхі.

Як вось гэта камяніца князёў Масальскіх, ад якой захаваліся толькі падвалы XVIII стагоддзя. Тое, што тут знаходзілася ў XIX — пачатку XX стагоддзя, напэўна, ведае кожны гродзенец, які сябе паважае. А вось турыстам, накшталт нас, прапануюць здагадацца. Самыя ўважлівыя, дарэчы, хутка знаходзяць над верхнімі вокнамі надпіс — «закон» і нерашуча выказваюць здагадку — суд? І гэта... правільны адказ.

На вуліцы так шчыльна пераплецена вялікая колькасць эпох і перыядаў, што губляешся, у якім ты наогул стагоддзі апынуўся. Ажурныя балконьчыкі, урачыстая ляпніна на фасадах і тут жа — ну хто з нас, дзяцей савецкай эпохі, мог падумаць, што сустрэне прыемны напамін аб бестурботным дзяцінстве, — аўтаматы з газіроўкай.

На Віленскай-Савецкай, па якой калісьці магнаты і каралеўскія асобы накіроўваліся напрасткі ў Вільню, захаваўся кавалачак бруку пачатку XX стагоддзя. Гэта не тыя гладкія камяні «кашэчае вока», якімі звычайна масцілі двары замкаў і пад'езды да іх у XVIII—XIX стагоддзях. Брук з 80-гадовай гісторыяй рабіўся ў Польшчы з бетону і ўкрапаным туды гранітам і клаўся пад вуглом, каб яго менш разбівалі колы транспарту.

Паўтарацьь гісторыю на гэтай вуліцы адно задавальненне. Гродна ўвайшло ў склад Савецкага Саюза ў канцы трыццатых мінулага стагоддзя. А да гэтага да статусу сталіцы прымервайся Магілёў. І гэта яму каштавала цэлага шэрагу гістарычных будынкаў, якія не ўпісаліся ў савецкі стыль, — Іосіфаўскага сабора напрыклад, пабудаванага пасля лёсавызначальнай для Рэчы Паспалітай сустрэчы аўстрыйскага імператара Іосіфа II з расійскай імператрыцай Кацярынай Вялікай. Прабачце за адступленне з Магілёвам, да яго мы вернемся, спадзяюся, у адным з нашых рэдакцыйных падарожжаў, а зараз зноў уся ўвага толькі да Гродна.

Цэнтральная плошча горада, на жаль, не тая, што на малюнках Напалеона Орды. Няма ратушы, палаца Радзівілаў, іншых пабудоў — шмат што было разбурана падчас вайны. Але ёсць Фарны езуіцкі касцёл, у сценах якога адчуваеш сябе зусім маленькай казюлькай і міжволі схіляеш галаву перад анёламі, якія лунаюць над табой. Ад ратушы застаўся толькі гадзіннік, які зараз упрыгожвае касцёл. Цыферблат, праўда, новы, а механізму — болей за пяць стагоддзяў. Кожны дзень яго наглядчык пераадольвае сто прыступак, каб стрэлкі працягвалі адлічваць час.

Плошча вабіць сваёй прасторай і гістарычнасцю. З яе ўжо простая дарога да знакамітых замкаў. Сімвалічна, што вуліца за гады свайго існавання ні разу не мяняла назвы — Замкавая. Паколькі, пачынаючы з XVII стагоддзя, кожны трэці сейм Рэчы Паспалітай праходзіў у Гродне, магнаты і шляхта імкнуліся будаваць тут свае палацы. Некаторыя будынкі тых часоў можна ўбачыць і сёння. Вунь маленькая рэзідэнцыя польска-літоўскага роду Храптовічаў — на яе фасадзе герб Гродна з аленем. Герб падарыла ў XVI стагоддзі каралева польская і вялікая княгіня літоўская Бона Сфорца. Гэта алень Святога Губерта, таго самага, які з асобы з мноствам слабасцяў ператварыўся ў чалавека з моцнай верай пасля цудоўнай сустрэчы на паляванні з незвычайным аленем, паміж рагоў якога зіхацеў залаты крыж. Святога лічаць заступнікам паляўнічых. У Гродне іх у тыя часы было шмат.

Пра пажарную каланчу з жоўтай цэглы, якая была пабудавана перад Першай сусветнай вайной на сродкі гараджан, таксама даводзілася чуць. Фасад упрыгожвае фрэска гродзенскага мастака Уладзіміра Качана з выявай пажарных розных гістарычных эпох. У гэтым прадстаўнічым шэрагу загадкава выглядае дзяўчына з тварам Джаконды. Кажуць, што мастак проста так пажартаваў з мэтай бянтэжыць такіх вандроўнікаў як мы. А яшчэ з гэтай вежай звязана добрая традыцыя, да якой мы, на жаль, не паспелі далучыцца. Апоўдні на яе падымаецца трубач і сігналізуе, што ў горадзе ўсё спакойна.

З вялікім трапятаннем ішла па старажытным мосце да Старога замка, па якім, як адразу ж папярэдзіў наш эксперт, хутка пойдзе цяжкая грузавая тэхніка з будматэрыяламі. А для работнікаў музея, які знаходзіцца ў будынку замка, і турыстаў пабудуюць часовы мост. Першы паверх замка дае магчымасць уявіць, як тут было ў часы Стафана Баторыя. Скляпеністая столь, метровыя сцены добра перадаюць дух той эпохі. Новы замак пабудаваны каралём Рэчы Паспалітай Аўгустам III. Адзінае, што засталося ў першапачатковым выглядзе — брама з фігурамі сфінксаў і (згодна з легендай) тварамі караля і яго любай жонкі, з якой ён нарадзіў 14 дзяцей. Хто з іх хто, мы так і не разабраліся. Яно і не дзіўна, бо блытаюцца нават спецыялісты. У сценах новага замка, які ў 50-я гады мінулага стагоддзя быў «рэзідэнцыяй» абкама партыі, захоўваецца прыжыццёвы бюст апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Панятоўскага і яго асабістае бюро. Замак вядомы яшчэ тым, што тут быў афіцыйна падпісаны дакумент, у якім Панятоўскі адрокся ад кароны на карысць Кацярыны Вялікай.

Што яшчэ абавязкова трэба паглядзець у Гродне — гэта Каложская царква XII стагоддзя. Нават тады, калі, як было ў нас, да ад'езду застаюцца лічаныя гадзіны. У першапачатковым выглядзе царква захавалася толькі напалову, яе правая сцяна больш за сто гадоў таму абрынулася з замкавай гары ў Нёман і была заменена на драўляную. Тое, што захавалася, дазваляе захапляцца майстэрствам старадаўніх дойлідаў, якія нечаканым спосабам сумяшчалі вузкую плінфу, вялікія шліфаваныя валуны і маёлікавую плітку, глазураваную эмаллю. Унутры храма замест тыповых для таго часу фрэсак і ікон выглядаюць замураваныя ў сцяну галаснікі. Спецыялісты кажуць, што гэта не столькі для таго, каб малітва «гучала», а хутчэй, каб аблегчыць канструкцыю пабудовы. Гару, на якой яна стаіць, метадычна падмывае рака.

Яшчэ адна тайна храма — знакі на сценах, сэнс якіх дагэтуль не разгаданы. У царквы, дарэчы, дзве назвы: Барыса-Глебская і Каложская. Сюды здзяйсняюць паломніцтва ахвотныя павянчацца або пахрысціцца. Каля іконы Каложскай Божай Маці да гэтага дня адбываюцца цуды. Дзякуючы ёй, кажуць, Уладзімір Мулявін пазбавіўся ад тытунёвай залежнасці. І ў знак удзячнасці ахвяраваў храму грошы — на іх быў зроблены разны іканастас.

Апошнія даследаванні паказалі, што пад пабудовай шмат полацаў і, калі іх не запаўняць, яна будзе працягваць разбурацца. Сёлета Прэзідэнт краіны паставіў мэту адрамантаваць царкву і на гэта выдзелена пэўная сума грошай. Трэба ратаваць адзін з галоўных сімвалаў Беларусі.

Гродна — унікальны горад, з якім звязана не толькі шмат вялікіх падзей, але і шмат імёнаў. Пяцідзённы бязвізавы ўезд у краіну даў магчымасць далучыцца да беларускіх славутасцяў і жыхарам Еўропы. Мацнеюць і этнічныя сувязі. Сведчаннем таму Музей рупніка, які адкрыўся сёлета ў аграгарадку Зарачанка пад Гроднам. Музейныя работнікі пахваліліся, што паглядзець на творы народнага мастацтва толькі з латвійскага горада Вентспілс прыязджалі ўжо чатыры разы... У тым жа музеі ёсць зала, якая знаёміць з гісторыяй ваенных і ведамасных формаў і амуніцыі, дзе можна ўбачыць унікальны ва ўсіх адносінах фасончык ведамаснай шапкі — кандыбобер.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

*г. Гродна.*

■ Віншуем!

# КАБ СЛОВА СЛУЖЫЛА ЛЮДЗЯМ

**На гэтым тыдні адзначыў свой 80-гадовы юбілей старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец. Урачыстасць з гэтай нагоды ўчора адбывалася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Павіншаваць юбіляра завіталі намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль Жарко, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, міністр інфармацыі Алесь Карлюкевіч, намеснік міністра культуры Ірына Дрыга, прадстаўнікі Акадэміі навук, пісьменніцкай грамадскасці, у прыватнасці Мікола Мятліцкі. У святочным канцэрце для юбіляра прынялі ўдзел кампазітар Алег Елісеенкаў, Леанід Барткевіч, гурт «СССР», Ядзвіга Паплаўская, Андрэй Разін.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Намесніца старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ** расказала карэспандэнту «Звязды»:

— З Мікалаем Іванавічам вельмі прыемна працаваць. Кожны дзень я іду на работу, думаючы, што маю шчасце зносін з такім незвычайным чалавекам. Бачу, якое кола людзей яго віншуе — і з Беларусі, і з блізкага і далёкага замежжа, — гэта сведчыць пра аўтарытэт чалавека. Яго 80 гадоў — не толькі яго дата, гэта падзея для ўсёй культурнай грамадскасці. Той унёсак, які ён зрабіў у станаўленне нашай незалежнай краіны, будучы грамадскім дзеячам і будучы пісьменнікам, вельмі важны. Колькі ён стварыў кніг, каб слова служыла людзям! І зараз ён працягвае гэтую справу, будучы старшынёй Саюза пісьменнікаў.

Кажуць, што Мікалай Чаргінец унесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса як вельмі разнапланавы дзеяч. Ён займаўся спортам, мае дасягненні ў футболе, працаваў у органах правапарадку. Ён быў і ў парламенце, Савеце Рэспублікі, 10 гадоў прадстаўляў Беларусь у ААН. Мікалай Чаргінец з'яўляецца сустаршынёй Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Ён служыў у Афганістане і мае баявыя ордэны. Увогуле гэты чалавек узнагароджаны трыма ордэнамі і больш як 60 медалямі самага рознага ўзроўню — Беларусі, Расіі, Афганістана, Югаславіі.

Учора да ўзнагарод дадалася яшчэ адна — **першы намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Васіль СЦЕПАНЕНКА** асабіста ўзнагародзіў Мікалая Чаргінца медалём Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

**Дырэктар выдавецтва «Чатыры чвэрці» Ліліяна АНЦУХ** адзначыла:

— Без перабольшання можна казаць пра тое, што Мікалай Чаргінец — знакавая асоба не толькі ў беларускай, але і ў сусветнай літаратуры. Яго творы перакладзены на многія мовы. Як чалавек ён адрозніваецца ад іншых сваёй уважлівасцю. Ці гэта будзе малады талент, ці праблема нейкая ў чалавека, ці знакавая падзея ў жыцці іншага — ён заўсёды адзначыць. Гэта вельмі важна і не кожнаму такое дадзена. З ім заўсёды камфортна і можна абмяркаваць любыя тэмы. А ў выдавецтве «Чатыры чвэрці» нядаўна выйшаў пераклад кнігі «Сыны» на англійскую мову. Ёсць і іншыя сумесныя задумы, якія, магчыма, з цягам часу ўдасца рэалізаваць.

Адметным падарункам да юбілею стаў пераклад адной з кніг Мікалая Чаргінца, зроблены на французскую мову. Так супала, што акурат у дзень святкавання Жан Гараньен дапрацаваў свой рукапіс па-французску. Жан Гараньен з'яўляецца прафесарам французскай мовы і літаратуры ў Францыі, Аўстраліі, таксама пэўны час выкладаў у Мінскім лінгвістычным універсітэце. Цяпер ён шмат часу праводзіць у Беларусі і адзначае, што наступны крок у рабоце з кнігай Мікалая Чаргінца — пошук выдавецтва і яе выданне ■

# МАГІЯ НА МАСТАВОЙ, 35

## ГРОДЗЕНСКАМУ ДРАМТЭАТРУ — 70: ІДЗЁМ ЗА КУЛІСЫ

**Яшчэ нядаўна гасцей тут сустракалі скваркай ды чаркай, разыгрывалі яблыкі з Адамавага дрэва. Гродзенскі абласны драматычны тэатр па-панску адзначаў юбілей «Беларускай камеды». Сёння заслужанаму калектыву Беларусі — 70. Пенсія? Не, не чулі.**
**«Нашы сцэны — інтэлектуальна-творча-духоўны пупок Гродна», — жартуюць персанажы на капусніку.**
**Ці праўду кажуць яны, і якія сакрэты хаваюць тэатральныя лабірынты — са святочнага вечара рэпартаж карэспандэнта «Звязды».**



Скульптурная кампазіцыя «Пегас» лунае ў паветры над парадным уваходам у тэатр. Унікальны будынак, створаны Генадзем Мачульскім, ужо больш як 30 гадоў сімвал горада над Нёманам. Старажылы ўспамінаюць: «Спачатку мы дзівіліся: «Як так? Ставіць футурыстычную каракаціцу каля самога Фарнага касцёла?» Гродзенцы бурчалі на гэтыя сцэны, як парыжане — на Эйфелеву вежу. А пасля закахаліся ў навабуд».

Тут нікому не верыцца, што тэатру — 70. На падмостках атмасфера гарэзлівасці, бясконцы паток энергіі артыстаў і не толькі іх. Гукарэжысёры, музыканты, мастакі, касцюмеры, бутафоры — 181 чалавек, кожны па-свойму служыць тэатру. А тым часам білеты прадаюцца як гарачыя піражкі, часта ёсць чэргі, і гэтым вечарам, безумоўна, таксама. Але ўжо не па білеты, а для таго, каб павіншаваць.

«Пра што сведчыць дата — 70 гадоў?» — пытаецца **Генадзь МУШПЕРТ, галоўны рэжысёр.** — Напэўна, пра тое, што, якія б часы ні былі за вакном, — тэатр людзям чамусьці патрэбны *(зала прыціхла)*. Бо наколькі розныя былі гэтыя гады: галодныя 40-я, спакойныя 50-я, стабільныя 60-я, застойныя 70-я, пераменлівыя 80-я, ліхія 90-я, сытыя нулявыя, трывожныя 10-я і нявызначаныя пакуль нашы. Але пасля 18 гадзін нязменна вечарэе. І людзям хочацца кудысьці пайсці. А тэатр якраз і адчыняе свае дзверы. І што б ні адбывалася навокал, мы чакаем вас з хваляваннем, з надзеяй на разуменне і на спачуванне да нашых персанажаў. А інакш дзяржава даўно перастала б выдзяляць на нас бюджэтныя грошы *(чуваць смяшкі)* і закрыла б наша нерэнтабельнае прадпрыемства. Людзі ўвечары хочуць відовішча. Так уладкаваны свет, і мы трывала займаем у ім сваё месца».

Кажуць, дзеці падчас навагодніх спектакляў у перапынках радасці кідалі на сцэну цукеркі. Асабліва цяжкая трапіла акцёру ў вока. Сёння, вядома, не Новы год, і аўдыторыя даўно выйшла з дзяцінства, але настрой ва ўсіх акурат цукерказакідальніцкі. Госці нясуць кветкі.

«Я лічу, што ў гродзенскім драмтэатры ёсць соль, вострае чырвонае слова, — упэўнена **журналістка «Гродзенскай праўды» Алена КАРПУК** (трымае ў руках белыя ружы). — Ёсць камедыі, прычым высокага класа, каб людзі смяяліся. Напрыклад, «Нараджэнне». А яшчэ — і гэта абавязкова трэба! — часам камяк да горла салёны падыходзіць. Але ўсё роўна ў фінале радасць, і я не іду дахаты пад цяжарам нейкай страшэнна трагічнай гісторыі. Не, мне лёгка, і так, я вяртаюся зноўку».

Відавочна, радасць адбываецца і на святочным вечары, дзе ёй і самае месца. Асабліва вясёлы нумар (акцёр вылятае на падмосткі нібыта казуля, што трапіла ў свет фар грузавіка на начной дарозе) сустракаюць грамавымі раскатамі смеху. Блізка да сэрца прымаюць кожнае віншаванне, кожны камплімент.

«Гэта вельмі прыемна. Гэта шчасце, што нашаму тэатру 70 гадоў. Магчыма, дата не самая круглая, але яна цудоўная. Яна наша. Я больш за 35 гадоў маю гонар іграць на гэтай сцэне», — кажа **заслужаная артыстка Беларусі Людміла ВОЛКАВА**. Удалая на кінаэкране, менавіта яна найчасцей выконвала ролі прым. Як расказваюць тут, на спектаклі з таленавітай красуняй прыходзілі натоўпы: мужчыны — захапляцца, жанчыны — нярэдка зайздросціць.



«Зранку хочацца сюды ляцець, увечары — затрымацца, — кажа **дырэктар Ігар ГЕДЗІЧ.** — Гэтыя сцэны бачылі Васіля Ланавога і Віталя Саломіна. Яны родныя для дзясяткаў заслужаных артыстаў. Яны — дом, другая сям'я. Ведаеце, радасна, калі бачыш: пра спектакль «Нараджэнне» гавораць і пішуць святары. Поўная зала плача і смяецца. За ўсю нашу гісторыю не было больш акупнай пастаноўкі. Але будзе. 70 — для тэатра ўзрост юнацкі».

Сярод яўна славянскіх аблічча заўважаю экзатычны твар артыста аркестра. Стэла Фідзі Ракутуарысуа ўсмешкай растапляе любы лёд. У Беларусь, як выявілася, яго прывяло каханне. Дзеля гродзенкі ён кінуў сонечны Мадагаскар.

Гэтыя сцэны бачылі столькі рамантыкі! Столькі сцэнарных і яшчэ больш рэальных гісторый кахання, што купідону і не снілася. Сяргей Курыленка і Валянціна Харытонава, Васіль і Вераніка Мінічы, Мікалай і Таццяна Вілімовічы, Аляксандр і Антаніна Калагрывы, Валерый і Іна Алешукі, Ігар Уланаў і Аксана Машынкова... «Журналісты, прыходзьце на дзень св. Валянціна сюды, тут не тое што артыкул, тут раман накатаць можна!» — жартуюць акцёры.

Біяграфія гродзенскага драмтэатра пачалася восенню 1947 года са спектакля «Праўда — добра, а шчасце лепш». З тых часоў яго гісторыю прынята адлічваць не датамі, а гучнымі прэм'ерамі. Колькі іх было за 70 гадоў не злічыць. Але сэрцу гледача не загадаеш. Так, у маскоўскі мастацкі акадэмічны ідуць на «Чайку», у «Сучаснік» — на «Голага караля». Купалаўскі тэатр — гэта, вядома нацыянальная «Паўлінка». «Будзеце ў Гродне — завітайце на «Белкамедыю». Візітная картка, легендарны спектакль і сёння ў рэпертуары. Яго сыгралі амаль паўмільёна разоў. Вам пакажуць нешчаслівага селяніна, яго жонку Маланку, жыда Давіда і Чорта, які страціў сэнс існавання», — раяць знаўцы.

Усе персанажы сёння таўкуцца ў вялікай зале. У пашпарце кожнага — тэатральная прапіска — Маставая, 35. «Усё як у людзей», — кажа старая з «Белкамедыі». «Не ўсё! — тыкае ў свой пашпарт жыд Давід. — Пенсіі няма! Персанажам, гавораць, па законе не паложана!»

Вострасучасны як тады, пасля вайны, так і цяпер, у свае 70. Гэта для гродзенскага драмтэатра не ўзрост. Трупа зноў пачала маладзець, а здзіўляць і не пераставала «Палёт над гняздом зязюлі» стаў сапраўдным адкрыццём у Санкт-Пецярбургу на фестывалях «Сустрэчы ў Расіі». Ён узяў прэстыжную прэмію Кірыла Лаўрова. Такой узнагароды ў Беларусі больш няма.

Для **Марыны МІКУЛІЧ** тэатр пачынаецца з вешалкі ў прамым сэнсе слова. Яна касцюмер, і гэта яе рукі ратуюць спектакль. Марына прызнаецца, зашываць сукенку проста на актрысе ёй даводзілася не раз. Каб усё было паводле Станіслаўскага і мы верылі, дзяўчаты і на Рамэа знойдуць джынсы, і на Джульету — касуху. На чатырох складах касцюмаў невядома колькі тысяч. А ноччу яны, мажа, ажываюць, шэпчуцца. Дзе быць магіі, калі не ў тэатры?

А ці сапраўдны віскі п'юць акцёры на гродзенскай сцэне? «Вам раскрыць таямніцу? — усміхаецца мілавідная блондзінка. — Так, гэта мая работа заварваць гарбату колеру пяцізоркавага каньяку. Замест піва наліваю квас, ну, а гарэлка, вядома, вада». Калі **Алена МІЛІНКЕВІЧ** прымала пост **загадчыцы рэквізіту** ад папярэдніцы, ледзь не адправіла на сметніцу нейкія драўляныя штучкі. Аказалася, гэта ўнікальны прадмет, якому цаны ў базарны дзень няма: калі ім пагрукаць, ствараецца абсалютна рэальны цокат капыт.

Але пакінем тэатральныя байкі і на наступныя юбілеі.

Вось яны, апошнія хвіліны юбілейнага спектакля. На ветразі-заслоне мы бачым: праплывае ўся гісторыя тэатра-дома, якому гродзенцы верныя не адно дзесяцігоддзе і які для многіх стаў прыстанню і караблём. Гродзенскі драматычны пад гучнае «брава!» плыве ў цудоўнае далёка.

«Ой, дажыць бы і да векавога юбілею!» — чую, хтосьці сказаў за маёй спінай.

**Маргарыта САДОЎСКАЯ.**

■ Вернісаж

# «МАСТАЦТВА ПАЧЫНАЕЦЦА З ЧЫСЦІНІ І ШЧЫРАСЦІ»

**Днямі адсвяткавала свой 15-гадовы юбілей галерэя «Універсітэт культуры», што знаходзіцца ў Палацы Рэспублікі. Творчым вернісажам распачаўся цыкл мерапрыемстваў, што будуць прысвечаны юбілею галерэі. А на выстаўцы «З творчасцю ў жыцці» прадстаўлены работы выкладчыкаў, выпускнікоў, сённяшніх студэнтаў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Дарэчы, у наступным годзе чакаецца яшчэ адзін юбілей — 25-годдзе кафедры!**

— Галерэя «Універсітэт культуры» сёння працуе як адна з цэнтральных пляцовак нашага горада, — адзначыў на адкрыцці выстаўкі **прарэктар па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Віктар ЯЗЫКОВІЧ.** — Гэта адзін з эпіцэнтраў міжнародных і культурных камунікацый, які бліскуча рэалізуе свае задачы. Безумоўна, у галерэі ёсць крэатыўны, цудоўны дырэктар Павел Сапоцька. Гэты чалавек — знаходка і для ўніверсітэта, і для гуманітарнай навукі (хутка абароніць дысертацыю). Да таго ж ён цудоўна арганізуе работу галерэі. Безумоўна, усе кафедры ўніверсітэта, асабліва творчыя, вартыя таго, каб выстаўляцца і дэманстраваць сябе. І ў галерэі сапраўды быў прадстаўлены цэлы феерверк дасягненняў — мастацкіх, творчых, музычных, выяўленчых, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і кіно.

У экспазіцыі прадстаўлены адметныя, выкананыя ў незвычайных тэхніках творы жывапісу, графікі, керамікі, тэкстылю, батыку, саломапляцення, роспісу па шкле. Кожны зможа знайсці тут твор мастацтва, які прыйдзецца яму пад густ. Куратарамі выступілі Ала Непачаловіч і Тамара Васюк — тыя людзі, што займаліся арганізацыяй самай першай выстаўкі, што адбывалася 15 гадоў таму.



Куратары выстаўкі Ала НЕПАЧАЛОВІЧ і Тамара ВАСЮК.



Дырэктар галерэі «Універсітэт культуры» Павел САПОЦЬКА.

Фота Ігара КАЛАШНІКАВА.



— Кожная выстаўка мае сваё аблічча і свой характар, — заўважыла **Тамара ВАСЮК.** — Калі перад намі паставілі задачу пачаць з гісторыі, то ў працэсе мы зразумелі, што ў нас сапраўды ёсць гісторыя, што яна сфарміраваная. Мы ўжо вызначылі напрамак і заклалі глебу — калі ёсць падмурак, аснова, значыць, уся будоўля будзе трывалая. Так у нас і атрымалася. За аснову мы ўзялі народную творчасць — а гэта велічыня, якая ніколі не падманвае, яна чыстая, як усё мастацтва. Мастацтва ўвогуле пачынаецца з чысціні і шчырасці. Калі ўчора мы завяршалі працу над экспазіцыяй, мы адчулі задавальненне і радасць. Хочацца, каб усе, хто наведае выстаўку, адчулі тое ж.

Варта адзначыць, што сярод удзельнікаў выстаўкі — доктар мастацтвазнаўства, прафесар Рыгор Шаура, прафесар, уладальнік медаля Францыска Скарыны Уладзімір Гардзеенка, прафесар, член міжнароднай гільдыі жывапісцаў Уладзімір Рынкевіч і іншыя.

**Доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўніверсітэта культуры і мастацтваў Рыгор ШАУРА** заўважыў:

— На кафедры працуюць дактары навук, прафесары, дацэнты, кандыдаты навук — інтэлектуальная эліта высокага класа. І ў той жа час мастакі. Што мы ствараем і як працуем — некаторыя работы выкладчыкаў можна ўбачыць на выстаўцы. Аднак з кожным годам творчых здабыткаў робіцца ўсё больш і больш. Яны з цяжкасцю памяшчаюцца ў выставачнай прасторы, таму мы іх дорым, раздаём — адным словам, эстэтызуем прастору.

Падаецца, сапраўднай творчасці, асабліва звязанай з народнай культурай, з нашымі вытокамі, шмат не бывае. Таму выстаўку варта наведаць, — каб яшчэ раз убачыць сваё, беларускае.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■

# «У НАС НЯМА ПРАХАДНЫХ ФІЛЬМАЎ»

## Арганізатары кінафестывалю «Лістапад» аб'явілі праграму і расказалі, якія ўзнагароды сёлета атрымаюць пераможцы

**Шчыра кажучы, я яшчэ не паспела асэнсаваць усё, што ўбачыла на мінулым кінафестывалі «Лістапад», а ён ужо абвяшчае новую праграму, і гэтая праграма дзіўная, выкшталцоная, першакласная. У ёй — Азербайджан, Індыя, Куба, Кыргызстан, Румынія, Грузія, Туніс і, навічок на «Лістападзе», Албанія. Тут інтэлектуальныя і глядацкія, аўтарскія і жанравыя, ігравыя і дакументальныя, дзёрзкія і «сталыя» карціны. Кіно, што разліваецца атмасферай альбо б'е эмоцыямі наводмаш; што падкупляе рэалістычнасцю альбо прапануе свой унікальны свет; што выкрывае блізкія нам праблемы альбо дапамагае даведацца аб нечым пакуль непазнаным... Фільмы, якія вы наўрад ці дзе-небудзь яшчэ ўбачыце на вялікім экране ды і на маленькім, магчыма, таксама. І, канешне, асаблівая частка «Лістапада», якую нельга абмінуць увагай, — Нацыянальны конкурс, які па азначэнні збірае найлепшае беларускае кіно апошняга часу. Адным словам, 3 лістапада распачынаецца сапраўднае, прабачце за культывуемы шаблон, свята кіно. Праграма абвешчана, а значыць прыйшоў час скласці карту сваіх зацікаўленасцяў.**

165 карцін з 55 краін. Шэсць конкурсаў, якія ўключаюць у сябе 94 фільмы. Кінатэатр «Масква» як пляцоўка для цырымоній адкрыцця і закрыцця. Кінатэатры Falcon Club Буцік Кіно, «Цэнтральны», «Мір», «Піянер» і «Беларусь» як асноўныя цэнтры пагружэння ў кіно. Традыцыйныя сустрэчы з аўтарамі. Індустрыяльная платформа. Глядацкае галасаванне.

«Мы прагледзелі больш за пяцьсот карцін і пастараліся адабраць найлепшае з таго, што ёсць у сучасным кіно, — дзеліцца **дырэктар праграм ігравога кіно «Лістапада» Ігар СУКМАНАЎ.** — У нас няма прахадных фільмаў. Усё, што будзе паказана на «Лістападзе», — гэта прадмет асаблівага, у тым ліку нашага, гонару. Мы паспрабавалі спалучыць, можна сказаць, неспалучальнае: аўтарскія, сур'ёзныя, глыбокія інтэнцыі і кіно, разлічанае на шырокую публіку. Мы будзем усміхацца і выціраць слёзы, кіно будзе радаваць нас мовай, стылем, зместам і прыносіць задавальненне. Гэтыя работы апроч іншага авеяны прызамі і ўдзелам у шматлікіх міжнародных кінафестывалях. Зараз быў аб'яўлены лонг-ліст кінапрэміі «Оскар» і аказалася, што трынаццаць карцін з гэтага спіса будуць прадстаўлены на сёлетнім «Лістападзе». У нас будуць карціны, што заваявалі галоўныя ўзнагароды Канскага і Берлінскага кінафестываляў, безумоўна, сустрэчы са шматлікімі яркімі кінематаграфістамі. Да нас прыедуць рэжысёры, што дэкларуюць «ісціну, любоў і прыгажосць» — той самы дэвіз, вакол якога сабралася наша калекцыя».

Фільмам адкрыцця стане «Арытмія» аднаго з найцікавейшых прадстаўнікоў аўтарскага расійскага кінематографа Барыса Хлебнікава. Асноўны конкурс ігравога кіно складаецца з дванаццаці карцін, акцэнт праграмы, як заўсёды, робіцца на краінах постсамуністычнай прасторы. Гэтая геаграфія насамрэч ахоплівае большую частку сушы: у конкурс трапілі карціны са знакамі Цэнтральнай Азіі, Кубы, Балтыйскага рэгіёна, Балкан.

У асноўны конкурс ігравога кіно трапілі пераможца фестывалю ў Карлавых Варах «Маленькі крыжаносец», зняты чэшскім рэжысёрам Вацлавам Кадрнкай, грузінскі рэжысёр Георгій Авашвілі з карцінай «Хібула», карціна з Кыргызстана «Кентаўр» Актана Арыма Кубата, азербайджанскі фільм Ільгара Наджафа «Гранатавы сад». Тут будуць і ўлюбёны «Лістападам» літоўскі рэжысёр Шарунас Бартас з карцінай «Іней», фільм «Рахманая» Сяргея Лазніцы, паказаны на апошнім Канскім кінафестывалі, расійскі фільм Юсупа Разыкава «Турэцкое сядло». Аматарам арт-кіно Ігар Сукманаў прапануе звярнуць увагу на карціну «Лістапад» Райнера Сарнета і кажа, што ён нікога не пакіне абыякавым.



Кадр з фільма адкрыцця «Арытмія» Барыса Хлебнікава.

У асноўны конкурс дакументальнага кіно таксама ўваходзіць дванаццаць фільмаў. Адзін з іх будзе беларускі: якраз на «Лістападзе» адбудзецца прэм'ера апошняй работы Вольгі Дашук «Сяргей Плыткевіч. Чалавек з фотаапаратам». У асноўны конкурс дакументальнага кіно трапілі і дэбюты, напрыклад, расійскі фільм «Апошні вальс» Юліі Бабковай пра апошнія месяцы жыцця кампазітара Алега Каравайчука, які шмат працаваў у кіно, у тым ліку на нашай кінастудыі.

У сваю чаргу Ігар Сукманаў падкрэслівае асаблівасць «Лістападзіка» — конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі, які мусіць зацікавіць не толькі падлеткаў, але і дарослых, тым больш, што шмат з гэтых фільмаў трапляюць не толькі ў дзіцячыя секцыі, але дэманструюцца і дарослай аўдыторыі. «Гэта не проста забаўляльныя жанравыя гісторыі. Мы спрабуем паказаць карціны, што сур'ёзна размаўляюць менавіта з маладымі людзьмі, прапаноўваючы ім уступаць у дарослае жыццё без аніякіх ружовых акуляраў. Робіцца гэта далікатна і разам з гэтым вельмі праўдзіва». Французская карціна «Падарожжа Фані», напрыклад, закранае тэму халакосту, а фільм «Подых жыцця» Іран сёлета выстаўляе на саісканне прэміі «Оскар».

Нарэшце, конкурс «Маладосць на маршы», які традыцыйна падае першыя і другія карціны найбольш яркіх маладых рэжысёраў сусветнага кіно, сёлета ўключае ў сябе адзінаццаць фільмаў.

Праграмны дырэктар вылучыў з сёлетняга конкурсу некалькі сенсацый, сярод якіх адна з найгалоўнейшых падзей апошняга Канскага кінафестывалю расійская карціна «Цесната» і карціна Ёнаса Карпіньяна, якому спрыяе сам Марцін Скарсэзэ, «Чамбра» пра цыганскую суполку. З «Маладосцю на маршы» звязана і першае з'яўленне на «Лістападзе» Албаніі — з фільмам «Дзень пачынаецца» Генціяна Кочы. Але найбольш прыемная навіна звязана з тым, што ў конкурс упершыню з 2010 года трапіла беларуская карціна — ёй стала работа Юліі Шатун «Заўтра».

Яна ж будзе значыцца і ў Нацыянальным конкурсе, які сёлета прадставіць трыццаць адзін беларускі фільм, сярод якіх ігравыя, дакументальныя і анімацыйныя работы. Тут можна сустрэць ужо знаёмыя карціны і тым больш знаёмых аўтараў, але трапяцца і новыя імёны, знаёмства з якімі яшчэ толькі мае адбыцца. **Куратар Нацыянальнага конкурсу Мікалай ЛАЎРАНЮК** кажа, што з-за недастатковых кольказці і якасці дасылаемых работ з фарміраваннем праграмы ўзнікаюць пэўныя складанасці: «Прычынай гэтаму, зразумела, з'яўляецца няпростае становішча сучаснай беларускай кіноіндустрыі, якое ў першую чаргу датычыцца ігравога кіно, у меншай ступені — дакументальнага і анімацыйнага. Галоўны крытэрый адбору для нас — гэта выразнасць аўтарскага выказвання і актуальнасць кінамовы. І ў гэтым годзе, як і ў мінулыя, у нас атрымалася сабраць фільмы, якія, на наш погляд, адпавядаюць сучасным тэндэнцыям сусветнага кіно і адначасова адлюстроўваюць жыццё беларусаў. Акрамя заявак, дасланых на фестываль, мы кожны год праводзім «даследчую» працу — шукаем новыя работы беларускіх рэжысёраў, у тым ліку тых, хто вучыцца і працуе за мяжой. У сёлетнім конкурсе, напрыклад, будзе паказаны фільм беларуса Сашы Сцяльчэнкі «Імітацыя», зняты ў знакамітай Чэшскай кінашколе FAMU. Акрамя аўтараў, што ўжо не першы раз удзельнічаюць у Нацыянальным конкурсе, такіх, як Андрэй Куціла ці Улада Сянькова, на шчасце, з'яўляюцца новыя імёны. Галоўнае адкрыццё гэтага года — дэбютны поўнаметражны фільм «Заўтра» Юліі Шатун. Важная задача Нацыянальнага конкурсу — быць сувязным звяном паміж беларускім і сусветным кіно, і на шчасце, у міжнародным прасоўванні, якому мы стараемся садзейнічаць, ужо ёсць некаторы прагрэс. Сёлета, напрыклад, на кінафестывалі ў нямецкім Котбусе будзе прадстаўлена асобная праграма беларускіх фільмаў, многія з якіх у свой час прымалі ўдзел у «Лістападзе».

Закрываць Лістапад будзе «падарунак шырокаму гледачу» — рэкардсмен лакальнага сербскага і чарнагорскага кінапракату «Васеньскі самурай» Даніла Бекавіча, першая ў гісторыі сербскага кіно карціна ў жанры баявых мастацтваў. «Гэта для тых, хто настальгіруе па 1990-х гадах, калі на піку папулярнасці былі Шварцэнэгер, Джэкі Чан, Сільвестр Сталоне і Жан-Клод ван Дам», — кажа Ігар Сукманаў.

Сёлета «Лістапад» ужо не будзе ўзнагароджваць Золатам, Серабром і Бронзай. Магчыма, такія змены справакавала пераўвасабленне журы кінапрэсы ў журы FIPRESCI, то-бок Міжнароднай федэрацыі кінакрытыкаў, да якой сёлета далучыліся дзесяць беларусаў. У выніку пераможцы атрымаюць Гран-пры, прыз FIPRESCI і прыз глядацкіх сімпатый.

Старшынёй журы асноўнага конкурсу ігравога кіно стане венгерскі рэжысёр Бенедыкт Флігауф — яго карціна «Лілі Лейн» атрымала Золата мінулага Лістапада.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

# «ЗАРА» НАД ПАЛЕССЕМ: ЭКСПАНСІЯ






**Пра справы ў адной з найлепшых гаспадарак Беларусі расказваем вуснамі яе кіраўніка — дырэктара саўгаса-камбіната «Зара» Мазырскага раёна Алега СЛІНЬКО**

***— Што новага ва ўсіх шматлікіх галінах вашай гаспадаркі, Алег Міхайлавіч?***

— Самае прыемнае, што ва ўсіх аддзяленнях ідзе планамерная работа, скіраваная не толькі на замацаванне дасягнутага, але і на далейшае развіццё. Увесь час нешта ўдасканальваем, нарошчваем, мадэрнізуем, нават тэхналогію вытворчасці прадукцыі — як жывёлагадоўлі, так і раслінаводства, перапрацоўкі. Што датычыцца раслінаводства, то плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў крышку павялічыліся, мы дадалі больш за 400 гектараў зямлі ў Нараўлянскім раёне. Бачылі, што суседняя гаспадарка не магла з ёю справіцца, а зямля для нашай мясцовасці дастаткова ўрадлівая. Пастараліся навесці там элементарны парадак. Дыскавалі ў два-тры сляды і пасеялі кукурузу. Агульная структура пасяўных плошчаў не змянілася, каля 50 працэнтаў займаюць азімыя і яравыя, і столькі ж — «каралева палёў».

Збожжавых у гэтым годзе сабралі крышачку менш, чым летась, — валавы збор склаў 12 562 тоны. Ураджайнасць збожжавых сёлета — каля 45 цэнтнераў з гектара. На гэты момант нарыхтавалі 33 тысячы тон кукурузнага сіласу, каля 4,5 тысячы тон сенажу і каля 1,5 тысячы тон сена. Вядзём уборку кукурузы, на сённяшні дзень валавы збор 21,7 тысячы тон пры ўраджайнасці 107 цэнтнераў з гектара. Думаю, будзе яшчэ каля 12 тысяч тон, што значна перавысіць мінулагодні паказчык.

Зараз закупілі невялікую колькасць збажыны, якой не хапала, у асноўным ячменю і пшаніцы. У цэлым прадукцыя раслінаводства дазволіла стварыць надзейную кармавую базу для жывёлы, назапасілі кармоў на паўтара года. І канцэнтраваных, і травяністых аб'ёмістых таксама. А калі ўлічыць, што ў структуры сабекошту прадукцыі яны займаюць да 70 працэнтаў (у залежнасці ад віду жывёлы), то можна сказаць, што большы аб'ём сабекошту выкуплены. І такая эфектыўная работа ў раслінаводстве дазваляе з аптымізмам глядзець у будучае.



## ПРЫРОСТ — СТАБІЛЬНЫ

Калі гаварыць пра жывёлагадоўлю, то ў гэтай галіне прырост стабільны. Асноўнай нашай галіной застаецца свінагадоўля. На 1 кастрычніка налічвалася 54 тысячы галоў свіней, яны размешчаны на трох пляцоўках — на двух свінагадоўчых комплексах і свінаферме. За год, які прайшоў пасля папярэдняй нашай сустрэчы, мы цалкам запоўнілі новы свінакомплекс у Нараўлянскім раёне, вывелі яго на поўную тэхналогію і сёння рэалізуем з гэтага комплексу 120 тон свініны ў месяц. Там утрымліваецца 8,5 тысячы галоў, і валавая вытворчасць свініны ў гаспадарцы перавысіла 800 тон у месяц.

Пагалоўе буйной рагатай жывёлы налічвае 6340 галоў, з іх 1570 — дойны статак. Сканцэнтраваны ўсе на пяці фермах. Летась давялі да ладу ферму па вырошчванні буйной рагатай жывёлы ў Махнавічах, там размясцілі лагер круглагадовага ўтрымання і пачалі камплектаваць. І недзе прыблізна 500 галоў дадалі да ўзроўню мінулага года. Сёння атрымліваем каля 135 тон ялавічыны.

Дастаткова стабільна працуе і наша птушкагадоўля. Маем адзін з лепшых паказчыкаў у краіне па яйцаноскасці на адну куру-нясушку і па годзе 67 мільёнаў яек будзем мець. Па мясным кірунку, па бройлерах пачатак года быў крыху «скамечаны». Бройлераў у краіне не хапае, і мы ў апошнія гады закуплялі маладняк у Польшчы. Але там здарылася ўспышка курынага грыпу і ўведзена забарона на пастаўку. Пераключыліся на ўнутраны рынак, заключылі дагавор з шклоўскай «Александрыяй» і камплектавацца пачалі толькі з лютага. За кошт таго, што прыраслі ў якасных паказчыках, і за кошт росту сярэднясутачных прыбаўленняў у вазе, нарошчвання масы тушкі за 9 месяцаў фактычна ліквідавалі студзеньскае адставанне. Думаю, па дзесяці месяцах павінны выйсці на стапрацэнтны ўзровень вытворчасці бройлераў у аб'ёмных паказчыках. А ў якасных будзе таксама не горш за ўзровень мінулага года. Сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе даходзяць да 57 грамаў.

Гэтая нечаканая мінулагодняя праблема падштурхнула нас да развіцця яшчэ аднаго кірунку ў птушкагадоўлі — вырошчвання бацькоўскага статку, будаўніцтва свайго інкубатара. Каб не быць залежнымі ад вонкавых фактараў.


«Вось наша багацце!» Загадчыца фермы «Дзербінкі» Вераніка ДРАЗДОВА.

## УЗГОДНЕНАСЦЬ КІРУНКАЎ

Калі сказаць абагульнена, то за месяц мы ўжо даём 1100 тон мяса ўсіх відаў — свініны, мяса птушкі і ялавічыны. За 12 месяцаў зможам рэалізаваць больш за 13 тысяч тон мяса. Да ўзроўню мінулага года будзе больш за тысячу тон плюс.

Малака ў суткі надойваем 37 тон, прыкладна 1100 тон у месяц. Думаю, паказчык яшчэ прырасце. Такая вось у нас узгодненасць кірункаў гаспадарання — колькі мяса, столькі і малака. І каля 6 мільёнаў яек. Усё гэта дастаткова сур'ёзны аб'ём вытворчасці.

Летась па Мазырскім раёне сярэдні надой быў 8512, а мы сёлета павінны атрымаць на карову на сваіх фермах у раёне 9100. І наблізіцца бліжэй да 7 тысяч па Нараўлянскім раёне. Хутка тры гады, як да нас далучылі там ферму, і з мінімальных надояў за гэты час яна выйшла на даволі неблагі ўзровень.

***— І ўсё гэта вы перапрацоўваеце ў сваіх цэхах...***

— Толькі 240 галоў быкоў здаём на мясакамбінат і каля 28 тон малака кожныя суткі адвозім на малочны завод. Усё астатняе сапраўды перапрацоўваем у сябе. Сёлета пасля сур'ёзнай рэканструкцыі ўведзены цэх кулінарыі. Аб'ект таксама атрымаўся сур'ёзны, калі ў вобласці ёсць нейкія аналагі, то адзінкавыя. Раней у гаспадарцы былі тры кулінарныя цэхі — у Мазыры, Калінкавічах і Рэчыцы. З увядзеннем гэтага цэха мы перайшлі на двухзменную работу і ўсе заяўкі задавальняем з яго дапамогай. Таму закрылі кулінарыю ў Калінкавічах і перапрафілявалі ў Рэчыцы. Частку людзей перавялі ў магазін і пачалі асвойваць вытворчасць бліноў з рознымі начынкамі. Новы від прадукцыі знайшоў свайго пакупніка, і з месяца ў месяц рэалізацыя такіх апетытных блінчыкаў шырокага асартыменту адчувальна павялічваецца.

Што датычыцца фірменнага гандлю, то яго таксама паступова развіваем, не стаім на месцы. Некалькі невялікіх магазінаў, па сутнасці павільёнаў, мусілі закрыць. У першую чаргу тыя, што былі на арэндзе і давалі невялікую выручку. Лічым, трэба ісці ў больш «людныя» месцы. Яшчэ і для таго, каб забяспечыць своечасовую дастаўку прадукцыі і належную зарплату прадаўцам, рост эканомікі. Пашырылі гандаль у абласным цэнтры: адкрылі ў Гомелі два магазіны і працуем цяпер над праектам яшчэ аднаго, у цэнтры горада. Гэта будзе адзін з самых вялікіх нашых магазінаў, бо выкупілі памяшканне на 500 квадратных метраў і зараз належным чынам абсталёўваем. Такім парадкам, у сваіх 28 магазінах цалкам рэалізуем той аб'ём прадукцыі, які выпускаем.


Жывёлагадоўля ў гаспадарцы пастаўлена на індустрыяльныя рэйкі.

***— Давайце пагаворым пра перспектывы, Алег Міхайлавіч.***

— Тады перш за ўсё варта крыху падрабязней спыніцца на развіцці ўласнага бацькоўскага статка для бройлераў. Заказалі і атрымалі даволі дарагі праект і пачалі будаўніцтва такой фермы. Усё будуем за кошт уласных сродкаў, на аб'екце


Ідзе вялікае малако. Звяно аператараў машыннага даення аддзялення №3.

працуе каля 30 нашых будаўнікоў, а падрадныя арганізацыі наймаем для мантажу жалезабетонных канструкцый, сістэм водазабеспячэння і выкавання іншых спецыяльных работ. Самі робім фундаменты, кладку, аддзелку. Гэта не новае будаўніцтва, а карэнная рэканструкцыя малочнатаварнай фермы ў Махнавічах.

На першым этапе аб'ём вытворчасці інкубацыйных яек складзе каля пяці мільёнаў штук у год. Нам патрэбны сёння мільён курanят. Але мы паралельна рыхтуем праект на будаўніцтва яшчэ аднаго птушніка, каб павялічыць вырошчванне. Той аб'ём, які даём сёння, можна назваць недастатковым, рознічнаму гандлю элементарна не хапае. Куранят і інкубацыйнае яйка будзем прадаваць і «на старану». Разлічваем на стабільных пакупнікоў, а яны павінны быць, бо ёсць пэўны недахоп сутачных куранят (маладняку птушкі) на тэрыторыі краіны.

## «ДРУГОЕ ДЫХАННЕ» НАРОЎЛІ

***— Вы ўкладваеце немалыя сродкі ў развіццё Нараўлянскага раёна.***

— Таксама гаспадарчым спосабам разгортваем там будаўніцтва мехмайстэрні. Пачнём з заправачнай станцыі, бо пакуль паліва на аддзяленне дастаўляем бензавозам. Следам вырасце адміністрацыйны будынак, каб стварыць належныя ўмовы для працы людзей. Бліжэй да вясны возьмемся за рэканструкцыю будынка самой майстэрні.

Ствараем новыя рабочыя месцы. Як толькі комплекс у Нароўлі запоўнілі жывёлай, адразу дадаліся рабочыя месцы — там працуюць 35 чалавек. Усе мясцовыя, з вёскі і з самой Нароўлі. Купілі аўтобус і возім людзей. Прынялі на працу некалькі механізатараў. Пачнём будаўніцтва мехмайстэрні — будзем набіраць моцную будаўнічую брыгаду.

У чацвёртым аддзяленні ёсць рэзервы і для развіцця малочнатаварнага кірунку, выношваем планы зрабіць там рэканструкцыю наяўнага будынка пад малочнатаварную ферму на 600 кароў. Ідэя падтрымана губернатарам Уладзімірам Андрэевічам Дворнікам, які нядаўна быў у нас, і мы паказвалі яму гэты аб'ект. Так што, як бачыце, планаў «громаддзё».

***— Вас паслухаеш, Алег Міхайлавіч, — ажыццяўляеце палітыку экспансіі, па ўсіх кірунках — ідзе пашырэнне тэрыторыі, «захоп» рынкаў, пашырэнне сферы дзейнасці. Праўда, экспансіі — у станоўчым сэнсе слова.***

— Менавіта ў станоўчым. Мы ж шматпрофільная гаспадарка, і нам няма калі спаць у шапку. Рынак дыктуе і тэмп, і пэўную агрэсію, падмацаваную разлікамі і грашыма.

***— У такім разе як пажывае ваша перапрацоўчая галіна?***

— На перапрацоўцы вузкім месцам была кулінарыя, а зараз пасля правядзення рэканструкцыі і аснашчэння цэхаў новым абсталяваннем вельмі мала засталося ручной працы. Адчувальна пашырылі асартымент прадукцыі, вырaслі яе спажывецкія якасці. Увялі двухзменную работу і ў суткі даём амаль 2,5 тоны кулінарнай прадукцыі на радасць гаспадыням. Толькі пельменяў выпускаем тону, за месяц 30 тон. Не адзін мясакамбінат вобласці такім аб'ёмам рэалізацыі пельменяў пахваліцца не можа.

На самой перапрацоўцы гады тры назад прайшоў рамонт, усё адпавядае санітарным і ветэрынарным нормам. Пакуль спраўляюцца ў адну змену, але калі паступаюць вялікія заяўкі, напрыклад перад святамі, працуюць у паўтары. Цалкам рэальна арганізаваць двухзменку і прыкметна павялічыць перапрацоўку сваёй жывёлагадоўчай прадукцыі.

Камбікормавы завод у Хойніках па-ранейшаму дзейнічае, але аб'ём выпуску прадукцыі невялікі. Атрымалі ад вобласці «дабро» на праектаванне новага камбікормавага завода. Хутчэй за ўсё, гэты чарговы сур'ёзны этап у вытворчым жыцці калектыву будзе ўжо ў 20-х гадах, пасля ажыццяўлення той праграмы, якую я агучыў.

Абнаўляем тэхніку, за гэты год парк машын абнавілі вельмі здорава. Купілі тры гомельскія камбайны КЗС-1218. Працуем толькі з камбайнамі «Гомсельмаша», бо лічым, што для нашага ўзроўню ўраджайнасці гэта нармальныя машыны па суадносінах «цана — якасць». Пры належнай настройцы — выдатны камбайн.

Набылі два аўтобусы для падвозкі работнікаў аддзяленняў Рудня і Нароўля. А яшчэ два «МАЗы», чатыры адзінкі машын для перавозкі прадукцыі, два кустарэзы, энерганасычаны трактар.

У фінансавым плане год таксама складваецца нядрэнна. Прыкметна павялічылася выручка, і чысты прыбытак — вышэй за ўзровень мінулага года. Сярэдняя зарплата пакрыху расце, калектыў расце таксама. Усё як мае быць. Вядома, працаваць становіцца складаней, бо аб'ёмы, самі бачыце, якія. Працаваць «ад дасягнутага» няпроста, калі раней была ўзятая сур'ёзная вышыня. Апошнія гады мы стабільна даём з месяца ў месяц 55 працэнтаў аб'ёму вытворчасці Мазырскага раёна, бывае нават да 60, і 50 працэнтаў ад аб'ёму Нараўлянскага. Пасля завяршэння ўборкі кукурузы лічба тут таксама можа вырасці да 55%.

Дапамагае тое, што стаўку робім як на вопыт сваіх ветэранаў, так і на маладых энтузіязм. Скажам, у нас у раслінаводстве працуе шмат маладых спецыялістаў, з чатырох аддзяленняў у трох кіраўнікі — зусім маладыя людзі, да 35 гадоў. Маладыя таксама ўсе аграномы. Пры належным стаўленні да справы, да тэхналогіі, пры патрабавальнасці спецыялістаў да сябе і наяўнасці маладога энтузіязму горы можна зрушыць з такімі кадрамі.


Гаспадыня новага цэха кулінарыі Людміла ЧАРАНКОВА.


Прыемныя клопаты ў маладым садзе.

## «САДУ ЦВЕСЦЬ...»

***— Ведаем, што вы ганарыцеся маладым садам.***

— Хоць вясна сёлета была складаная, халадная, тым не менш пачаў пладаносіць наш малады сад. Спецыялісты папрацавалі нядрэнна, і мы атрымалі ўраджай на першых дваццаці гектарах. Будзем мець прыкладна 400 тон яблыкаў, зараз займаемся іх зборам і рэалізацыяй. Цана рэалізацыі нас задавальняе, крыху замінае, што пакуль няма абсталяванага сховішча, але гэта з'яўленне — справа часу. А пакуль частку ўраджаю, 60 тон, заклалі на захоўванне, каб зрабіць больш разнастайным перадпнавагодні гандаль у фірменных магазінах. Астатнія пастараемся прадаць да маразоў. Яблыкі нашы — цудоўных сартоў, карыстаюцца попытам у мазыран.

У садзе працы заўсёды многа: абрэзка, падкормка, пабелка, праполка. Збіраць ураджай дапамагаем усім калектывам, па чарзе выходзяць амаль усе службы. Пастаянна там працуюць пад кіраўніцтвам агранома-садавода ўсяго 15 чалавек. На 80 гектараў сёння гэта ўжо малавата, нават пры падтрымцы механізмаў. Па выніках года нават з невялікім пакуль ураджаем у 400 тон яны будуць з плюсавым вынікам. Па самых прыблізных падліках малады сад пры наяўным узроўні цаны прынясе 500—600 тысяч рублёў.

***— І ўсё ж, Алег Міхайлавіч, што зараз робіце на палях?***

— Заканчваем сяўбу азімых (сёння, на момант публікацыі, сяўба завершана. — **Аўт.**). Папярэднік у асноўным кукуруза. Радуе стаўленне да справы тых самых маладых аграномаў і кіраўнікоў аддзяленняў. Належным чынам падрыхтавалі глебу, унеслі ўгнаенні — па тэхналогіі, дакладна выконваецца норма высеву. Асаблівая ўвага — глыбіні закрывання насення... Маладыя хлопцы жывуць гэтым, я бачу па зацікаўленасці ў вачах. Значыць, на наступны год ураджай будзе не горшы.

***— Па эфектыўнасці гаспадарання нехта абагнаў вас у Беларусі?***

— Складана сказаць, але па выніках мінулага года ў нас быў другі ў краіне паказчык чыстага прыбытку на адзін бала-гектар. За першае паўгоддзе рэнтабельнасць крышку большая за 20 працэнтаў. Але лічба не канчатковая, бо сельскагаспадарчы год не завершаны.

Выручка ў апошнія месяцы сем — сем з паловай мільёнаў новых рублёў, на старыя гэта 70—75 мільярдаў. Што можна супаставіць з сумарнай выручкай некалькіх раёнаў вобласці.

***— У сацыяльным пакеце для членаў калектыву нешта дадалося?***

— Мы захавалі ўсё, што запісана ў калектыўным дагаворы, ужо адно гэта важна. У тым ліку дапамогу ў адпачынку ў памеры дзесяці базавых велічынь. Дабавіліся яблыкі з уласнага саду, учора на бульбу выплацілі па 170 рублёў кожнаму, хто без заўваг адпрацаваў год.

Новае жыллё пакуль не будавалі, бо ёсць свабодныя дамы ў Махнавічах і Рудні, у выпадку неабходнасці засяляем у іх спецыялістаў, маладыя сем'і. Нават моладзь з горада, што здымае ў Мазыры жыллё і ездзіць да нас працаваць на свінакомплекс ці птушкафабрыку, выказвае пажаданне перабрацца ў вёску. Моладзь цэніць магчымасць атрымаць свой дах над галавой. А нам падабаецца іх імкненне працаваць на зямлі. У такім выпадку станаўленне маладога чалавека будзе цалкам залежаць ад тых, хто працуе побач, ад настаўніка, скажам так.

Я дваццаць гадоў працую ў «Зары». У свой час пашанцавала трапіць да Уладзіміра Андрэевіча Дворніка, сярод маіх настаўнікаў была і галоўны заатэхнік Таццяна Мікалаеўна Самбук. Я вельмі ўдзячны гэтым людзям за навуку жыцця. Як і ўсяму калектыву — за дастаткова дружную, а таму і эфектыўную сумесную працу. Вобразна кажучы, яна ператварае абшары «Зары» ў суцэльны дагледжаны малады сад.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Здымкі з архіва «Зары».**

**Ад рэдакцыі.** Выказваем шчырую падзяку **намесніку дырэктара Іне ХАМУТОЎСКАЙ** за рознабаковую дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.

УНП 400408726


Любоў ПІНЧУК, Наталля ЕРЭШКА і Алена БЫЧКОЎСКАЯ за сартыроўкай яблык.


І смак, і якасць — найвышэйшыя.


Адпачывай, поле, да вясны.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорскторг» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе**:**

**Лот №1 (повторный аукцион):** одноэтажное кирпичное здание склада продовольственных товаров №1, общ. пл. 1 604,9 кв. м (инв. №644/С-34916), включая многолетние насаждения (береза, 5 шт.), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002429 площадью 0,5314 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1.

**Начальная цена с НДС – 278 007,36** бел. руб. **Цена снижена на 20%.** Задаток 10% от начальной цены – **27 800,00** бел. руб.;

**Лот №2 (повторный аукцион):** одноэтажное кирпичное здание мебельного склада, общ. пл. 972,9 кв. м (инв. №644/С-34933), включая многолетние насаждения (береза, 2 шт.), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002430 площадью 0,3498 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1.

**Начальная цена с НДС – 134 838,72** бел. руб. **Цена снижена на 20%.** Задаток 10% от начальной цены – **13 484,00** бел. руб.;

**Лот №3 (повторный аукцион):** здание склада №6,9 общей площадью 1 724,9 кв. м (инв. №644/С-2073), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002780 общей площадью 0,3752 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1.

**Начальная цена с НДС – 290 309,04** бел. руб. **Цена снижена на 30%.** Задаток 10% от начальной цены – **29 030,90** бел. руб.

**Лот №4:** мастерские торговой базы, общей площадью 489,0 кв. м (инв. №644/С-34913), расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002779 площадью 0,1250 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1. **Начальная цена с НДС (20%) – 123 960,00** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены – **12 396,00** бел. руб.

**Лот №5:** павильон, общей площадью 120,0 кв. м (инв. №644/С-34948), 1980 года постройки, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003022 площадью 0,0306 га по адресу: Минская область, Солигорский район, г. Солигорск, ул. Ленинского Комсомола, 44. **Начальная цена с НДС (20%) – 83 160,00** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены – **8 316,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с №3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Срок подачи заявок на участие в аукционе – 30 (тридцать) календарных дней с последующими условиями оплаты имущества:

– по объектам №№1–3 – оплата 40% стоимости имущества в течение 20 (двадцати) календатных дней после заключения договора с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 60% в течение 6 календарных месяцев (по 10%) либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора;

– по объекту №4 – оплата 40% стоимости имущества в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 60% в течение 3 календарных месяцев (по 20%) либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора;

– по объекту №5 – оплата 100% стоимости имущества в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: по лотам №№ 1,3 в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 2,4 – 4 (четырех) процентов и по лоту № 5 – 5 (пяти) процентов.

Аукцион состоится **14.11.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.11.2017** до 16.00 по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 10 ноября 2017 года в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20 открытого повторного аукциона по продаже выявленного, задержанного, арестованного и обращенного в доход государства имущества

| № лота | Наименование объекта | Уполномоченный орган | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. №350/С-83927, площадью 787,3 кв. м**, назначение – здание специализированное внутреннего водного транспорта, наименование – **береговой производственный участок**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Подгорная, д. 10.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000001003845,** общей площадью **0,4657 га (право постоянного пользования)**. Ограничение (обременение): **залог недвижимого имущества (ипотека), аренда.** | ИМНС РБ по Центральному р-ну г. Гомеля | **301 320,00** | 30 132,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. №350/С-70579, площадью 1 059,5 кв. м**, назначение – здание многофункциональное, наименование – **здание склада с мастерскими**. Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером с **340100000002000691,** общей площадью **0,6002 га (право постоянного пользования).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1г.** Ограничение (обременение): **ипотека.** | | **176 256,00** | 17 625,60 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. №350/С-168154, площадью 479,9 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1г.** | | **107 856,00** | 10 785,60 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. №350/С-70577, площадью 1 504,7 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание СУ-43**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1г.** | | **436 392,00** | 43 639,20 |
| 5 | **Капитальное строение с инв. №350/С-168157, площадью 486,6 кв. м**, назначение – здание многофункциональное, наименование – **столярная мастерская с гаражами и складом**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1г.** | | **111 600,00** | 11 160,00 |
| 6 | **Капитальное строение с инв. №350/С-168156, площадью 154,3 кв. м**, назначение – здание многофункциональное, наименование – **здание гаражей и склада**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Лепешинского, д.1г.** | | **36 288,00** | 3 628,80 |
| 7 | Здание специализированного автомобильного транспорта **– гараж площадью 38,6 кв. м.** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская, 47Б/13, блок №112.** | ОПИ Центрального р-на г. Гомеля | **6 552,00** | 655,20 |
| 8 | **Капитальное строение с инв. №310/С-41690, площадью 2 455,6 кв. м**, назначение – здание специализированное животноводства, наименование – **здание коровника и телятника**. Местонахождение: **Гомельский р-н, Грабовский с/с, д. Журавлевка, ул. Полевая, 40/6.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **321081602101000026,** общей площадью **6,0141 га (право постоянного пользования)**. | ИМНС по Гомельскому р-ну | **114 660,00** | 11 466,00 |
| 9 | **Капитальное строение с инв. №340/С-30011, площадью 745,2 кв. м**, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – **навес №2**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **324550100001010218,** общей площадью **0,1701 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1).** Местонахождение: **г. Речица, ул. Энергетиков, д. 1.** Ограничение (обременение): **ипотека.** | ИМНС РБ по Речицкому р-ну | **66 787,20** | 6 678,72 |
| 10 | **Изолированное помещение с инв. №340/D-219519, площадью 36,0 кв. м**, назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – **гостиничный номер**. Адрес: **г. Речица, ул. Строителей, д. 4, пом №11.** | | **21 168,00** | 2 116,80 |
| 11 | **Капитальное строение с инв. №310/С-48027, площадью 44,3 кв. м**, назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – **жилой дом**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **321085602101000319** общей площадью **0,1500 га (право пожизненного наследуемого владения).** Местонахождение: **Гомельская обл., Гомельский р-н, Прибытковский с/с, д. Климовка, ул. 1-я Совхозная, 156.** | ОПИ Гомельского р-на | **6 930,00** | 693,00 |
Найбуйнейшы ў свеце нарвежскі суверэнны фонд быў заснаваны ў 90-х гадах мінулага стагоддзя для кіравання нафтавымі даходамі краіны фіёрдаў. Афіцыйна ён называецца The Government Pension Fund Global (Глабальны дзяржаўны пенсійны фонд) і кіруецца падраздзяленнем Банка Нарвегіі, Norges Bank Investment Management. Кіруючая кампанія падпарадкоўваецца міністэрству фінансаў краіны. Пытанні аб інвестыцыях NBIM вырашае не ў адзіночку, а з улікам меркавання мінфіна і нават на падставе абмеркаванняў у парламенце.

Першы транш «нафтавых грошай» перавялі на рахунак фонду ў маі 1996 года. З тых часоў актывы выраслі амаль у 4000 разоў: з 1,93 млрд да 7,83 трлн нарвежскіх крон. «Глабальны ўрадавы пенсійны фонд назапашвае для будучых пакаленняў. Аднойчы нафта скончыцца, але даходы фонду працягнуць прыносіць карысць жыхарам Нарвегіі», — адзначаецца на сайце The Government Pension Fund Global. Колькасць насельніцтва паўночнага каралеўства складае каля 5,3 млн чалавек — такім чынам, цяпер на аднаго нарвежца прыпадае прыкладна $189 тыс. (157 тыс. еўра) актываў фонду.

Фонд мае свае долі ў амаль 9000 кампаній 77 краін, валодае 1,3 працэнта сусветнай рынкавай капіталізацыі і 2,3 працэнта — у Еўропе. Прычым інвестыцыйны партфель цалкам адкрыты, з ім можа азнаёміцца любы ахвотны. Дарэчы, тут можна знайсці ўсе вядучыя фірмы з новай інтэрнэт-эканомікі — Google, Amazon і іншыя. У NBIM 550 супрацоўнікаў і пяць офісаў: у Осла, Нью-Ёрку, Лондане, Шанхаі і Сінгапуры. Першыя інвестыцыі фонду былі ў аблігацыі, затым да іх дадаліся акцыі, а ў апошнія гады — нерухомасць у Нью-Ёрку, Лондане і Парыжы. Летась палову даходу NBIM прынеслі інвестыцыі, 45 працэнтаў — паступленні ад продажу краінай нафты і газу, астатняе — курсавая розніца валют.

Адметна, што на фоне глабальнага фінансавага крызісу і падзення цэн на нафту Нарвегія выдаткавала на бягучыя патрэбы менш за адзін працэнт сродкаў свайго суверэннага фонду, сведчаць разлікі The Wall Street Journal. Інакш складваўся ў гэты перыяд лёс суверэнных фондаў краін, якія развіваюцца, — практычна ўсе трацілі назапашанае. Зрэшты, у Нарвегіі сітуацыя таксама можа змяніцца. Урад каралеўства, які накіроўвае ў фонд усе свае нафтавыя даходы, мае права прыцягваць сабе толькі эквівалент чаканага фінансавага прыбытку, які паменшыўся з чатырох працэнтаў да трох.

### ЭТЫЧНЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ

Паколькі акцыі прыносяць большы даход, NBIM атрымаў дазвол павялічыць укладанні ў іх да 70% партфеля. Інвеставаць у аблігацыі ён будзе менш. У пачатку верасня фонд звярнуўся да нарвежскага мінфіна з просьбай пакінуць у індэксе бондаў, які служыць бенчмаркам (узорам) яго даходнасці, толькі суверэнныя аблігацыі ў амерыканскіх доларах, еўра і брытанскіх фунтах стэрлінгаў з тэрмінам абароту ад 10 гадоў. Зараз у гэтым індэксе аблігацыі ў 23 валютах. Рашэнне аб адпаведных змяненнях мінфін прыме вясной 2018 года, расказаў прадстаўнік NBIM Томас Севанг.

Пры гэтым NBIM зусім не скупляе ўсё запар. Наадварот, фонд прытрымліваецца канцэпцыі так званых этычных інвестыцый, укладваючы грошы толькі ў тыя прадпрыемствы, якія адпавядаюць выпрацаваным у Осла крытэрыям. Прычым зноў-такі адбор ажыццяўляецца максімальна празрыста і адкрыта, а «чорны спіс» непрымальных для фонду прадпрыемстваў таксама публікуецца ў сеціве. Каму не дастаюцца грошы найбуйнейшага суверэннага фонду? Напрыклад, кампаніям, якія вырабляюць або ўдзельнічаюць у вытворчым ланцужку вырабу ядзернай зброі. Немагчымыя інвестыцыі і ў кампаніі тытунёвай прамысловасці. Катэгарычна не гатовы працаваць фонд і з фірмамі, якія выкарыстоўваюць дзіцячую працу.

Табу для нарвежцаў — і фірмы, якія, па інфармацыі NBIM, нанеслі сур'ёзны ўрон экалогіі (бо фонд створаны для будучых пакаленняў), а таксама кампаніі, вінаватыя ў карупцыі, парушэнні правоў чалавека або іншых «фундаментальных этычных нормаў». Наадварот, не выклікаюць пытанняў аграпрамысловыя кампаніі, якія прымяняюць генную інжынерыю. Няма і палітычнага падыходу: так, нягледзячы на міжнародныя санкцыі, NBIM па выніках мінулага года трымаў акцыі 51 расійскай кампаніі.





Урад Нарвегіі чакае, што аб'ём фонду працягне расці да 2025 года, і ён можа дасягнуць ад 10,5 трлн крон (каля $1,3 трлн). Але такія ацэнкі, на думку аналітыкаў, ненадзейныя, паколькі цяперашні памер фонду ўжо перавышае мяжу, якой не чакалі дасягнуць да канца наступнага года.



### «ЗЯЛЁНЫЯ» НЕ Ў ТРЭНДЗЕ

Выбары ў стортынг (парламент) Нарвегіі, якія прайшлі 11 верасня, засталіся амаль незаўважанымі сусветнымі СМІ. Шмат у чым гэта тлумачыцца тым, што змены ўрада не адбылося: хоць сацыял-дэмакраты з Нарвежскай рабочай партыі сабралі найбольшую колькасць галасоў, ва ўладзе засталася правацэнтрысцкая кааліцыя, і Эрна Сульберг («жалезная Эрна»), лідар партыі «Хейрэ», захавае за сабой крэсла прэм'ер-міністра на наступныя 4 гады. Аднак вынікі гэтых выбараў заслугоўваюць увагі як мінімум з-за некалькіх акалічнасцяў. Яны прадэманстравалі тэндэнцыі, характэрныя не толькі для Нарвегіі. Пры гэтым слабасць «зялёных», за якіх прагаласавалі ўсяго 3,2% выбаршчыкаў, заслугоўвае асаблівай увагі. Паколькі гэта адзіная з палітычных партый Нарвегіі, якая выступае за спыненне нафтаздабычы ў краіне. У передвыбарнай праграме «зялёных» было патрабаванне спыніць здабычу нафты на працягу найбліжэйшых 15 гадоў. Яны адмовіліся ўступаць у кааліцыю з любой партыяй, якая не падзяляе такога падыходу. Аднак выбары яскрава прадэманстравалі, што прыхільнікаў гэтага патрабавання ў каралеўстве амаль няма.

Па вытворчасці электраэнергіі на душу насельніцтва Нарвегія займае першае месца ў свеце. Пры гэтым, нягледзячы на наяўнасць вялікіх запасаў вуглевадародаў, 99% электраэнергіі выпрацоўваецца на ГЭС, у сувязі з наяўнасцю значных гідрарэсурсаў. Таму вытворчасць нафты і газу скіравана на экспарт. Нарвегія штогод здабывае «чорнага золата» больш, чым усе краіны Еўрасаюза разам узятыя. Зразумела, што ў значнай ступені дабрабыт залежыць ад газаздабыўной і нафтаперапрацоўчай прамысловасці. З сярэдзіны 1990-х гадоў Нарвегія стала другім у свеце, пасля Саудаўскай Аравіі, экспарцёрам нафты. Пры гэтым варта ўлічваць, што цяпер здабыта менш за трэць разведаных запасаў вуглевадародаў, якія належаць Нарвегіі.

Абвал сусветных цэн на нафту ў 2014 годзе аказаўся для краіны вельмі балючым: рэзка скараціўся прыток выручкі ад экспарту «чорнага золата», колькасць працуючых у нафтаздабыўным сектары зменшылася на 50 тысяч чалавек. Адмова ад нафтаздабычы (што прапануюць «зялёныя») сталася б стратай значных фінансавых паступленняў і звальненнем 180 тыс. занятых. Зацягваць паясы тужэй нарвежцы з іх высокім узроўнем даходу на душу насельніцтва негатовыя. Развітвацца з дасягненнямі дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту, пабудаванай на нафтадоларах, не хочацца. У выпадку адмовы ад нафтаздабычы для падтрымання звыклага ўзроўню сацыяльных ільгот давялося б рэзка павысіць падаткі (ужо цяпер ПДВ у Нарвегіі дасягае 25%). Выбаршчыкам аказалася больш блізкай пазіцыя міністра фінансаў, лідара Партыі прагрэсу Сіва Джэнсана: «У перспектыве нафтавая прамысловасць перастане быць маторам, але застанецца важнай часткай нарвежскай прамысловасці. Гэта значыць, што мы павінны не толькі рабіць стаўку на новыя галіны, але і паляпшаць рамачныя ўмовы для нафта- і газаздабычы».

### ЛЕПШЫЯ ПА ІНДЭКСЕ

Чысты прыток паступленняў з нафтагазавага сектара, як чакаецца, вырасце налета на 4,3% у параўнанні з бягучым годам і на 47% адносна 2016-га. Разам з тым урадам прагноз росту ВУП без уліку здабычы нафты і газу на шэльфе на 2017 год палепшаны з 1,6% да 2%, на наступны — з 2,4% да 2,5%.

Аднак нафтай і газам прыродныя багацці зусім не абмяжоўваюцца. Краіна валодае вялікімі запасамі лесу, радовішчамі жалеза, алюмінію, медзі, цынку, свінцу, нікелю, тытану, малібдэну, серабра, мармуру, граніту. Тут развіта хімічная прамысловасць, лесаводства, машынабудаванне. Нарвежская марская эканоміка ахопліве шырока развітую сетку галін, звязаных з перавозкамі і развядзеннем аквакультуры, якія прадстаўляюць усё больш разнастайны спектр тавараў і паслуг.

Пры гэтым адукацыя і культура — на першым плане. У пачатковай школе выкладаецца не толькі англійская мова (з першага класа), але і — акрамя традыцыйных прадметаў — экалогія і мастацтва. Дарэчы, на адукацыю выдаткоўваецца ў тры разы больш, а на ахову здароўя — у чатыры разы больш, чым на абарону. Нездарма з 2001 да 2006 года і пачынаючы з 2010-га Нарвегія ўзначальвае спіс краін па Індэксе чалавечага развіцця. Так што каралеўства зусім не сядзіць склаўшы рукі ў чаканні канца «нафтавай эпохі», спадзеючыся на вялізную «заначку».

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*

## Извещение о проведении 3 ноября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Мостострой»

| Предмет торгов |
|---|
| «здание склада-цеха мастерских» общей площадью 70,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 330/С-16500; «здание проходной» общей площадью 43,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 330/С-16501; «ворота въездные металлические», инв. № в ЕГРНИ 330/С-16502; «забор (ограждение базы (железобетонное)) протяженностью 248,42 м», инв. № в ЕГРНИ 330/С-16503; «площадка базы со смотровой ямой», инв. № в ЕГРНИ 330/С-16504; «забор (ограждение базы (металлическое)) протяженностью 81,58 м», инв. № в ЕГРНИ 330/С-16505; «здание надворной уборной» общей площадью 3,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 330/С-16506; растворо-бетонный узел (инв. № 9278); шкаф КТП 100-10 (инв. № 192); трансформатор ТМГ-100-10 (инв. № 198) |
| Местонахождение: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Гоголя Н. В., 151 |
| Площадь земельного участка: 0.5642 га, кадастровый номер: 341500000001000134 |
| Начальная цена: 91 644,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 9 100,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «Мостострой», пер. Домашевский, 11, 220036, г. Минск, тел. (017) 208-87-81.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, т. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Мостострой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 3 ноября 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 23.10.2017 по 01.11.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(029) 669-82-46, (029) 395-99-47 (ОАО «Мостострой»).

**Idea Bank**

Наименование банка:

## ЗАО «Идея Банк»

www.ideabank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2017 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 1 октября 2017 | на 1 января 2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 39 759 | 45 888 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | – | – |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 21 388 | 21 041 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 29 508 | 52 959 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 0 | 2 994 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 176 847 | 134 419 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | – | – |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5 | 5 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 38 188 | 38 195 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 59 | – |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | – | – |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 29 211 | 29 863 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 334 965 | 325 364 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | – | – |
| 17 | Средства банков | 1202 | 39 667 | 37 341 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 207 727 | 205 132 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 215 | 217 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | – | – |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | – | – |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 2 687 | 6 136 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 250 296 | 248 826 |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 26 806 | 26 806 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 6 177 | 5 179 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 10 818 | 10 937 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 40 868 | 33 616 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 84 669 | 76 538 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 334 965 | 325 364 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 3 квартала 2017 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 1 октября 2017 | на 1 октября 2016 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 35 949 | 48 632 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 12 205 | 27 338 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 23 744 | 21 294 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 9 679 | 12 455 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 3 621 | 3 419 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 6 058 | 9 036 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | – | – |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (14) | (213) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7 093 | 7 812 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | – | (874) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (6 258) | (7 898) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 2 205 | 6 001 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 26 863 | 27 848 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1 627 | 1 469 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 16 854 | 21 637 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 4 091 | 5 446 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 12 763 | 16 191 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | |

Председатель Правления Е. М. Папушева

Главный бухгалтер О. В. Глазырина

11 октября 2017 года

Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (ЗАО «Идея Банк»).
Свидетельство о регистрации от 24 апреля 2004 года.
Лицензия на осуществление банковской деятельности №25 от 03.06.2013 года.
УНП 807000122

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», пр-т Победителей, 119-506 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | | |
| **Административное помещение** | Административное помещение | 390,1 кв. м | 500/D-708176123 | г. Минск, пр-т Победителей, 119-505 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **673 465,50 белорусских рублей (BYN)** | | | |
| **Лот №2** | | | | |
| **Торговое помещение** | Торговое помещение | 608,3 кв. м | 500/D-708180083 | г. Минск, пр-т Победителей, 119-502 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **972 520,60 белорусских рублей (BYN)** | | | |
| **Лот №3** | | | | |
| **Административное помещение** | Административное помещение | 395,5 кв. м | 500/D-708175053 | г. Минск, пр-т Победителей, 119-508 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **536 028,90 белорусских рублей (BYN)** | | | |
| **Лот №4** | | | | |
| **Административное помещение** | Административное помещение | 433,4 кв. м | 500/D-708175054 | г. Минск, пр-т Победителей, 119-509 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **560 673,90 белорусских рублей (BYN)** | | | |
| **Лот №5** | | | | |
| **Административное помещение** | Административное помещение | 333,7 кв. м | 500/D-708175052 | г. Минск, пр-т Победителей, 119-506 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **403 794,10 белорусских рублей (BYN)** | | | |
| **Лот №6** | | | | |
| **Административное помещение** | Административное помещение | 345,2 кв. м | 500/D-708175055 | г. Минск, пр-т Победителей, 119-510 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **414 340,90 белорусских рублей (BYN)** | | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» в номере от 26.08.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.11.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **16.11.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Вольт», г. Могилев, Гомельское шоссе, 38 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Участок изготовления металлоконструкций** | Здание нежилое | 1222,7 кв. м | 700/С-6119 | Могилевская обл., г. Могилев, ш. Гомельское, 38/4 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | Одноэтажное каменное здание участка изготовления металлоконструкций. |
| **Обременения** | Частичная аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by |

**Сведения о земельном участке**

Предмет аукциона расположен на земельном участке общ. пл. 4,5026, предоставленному продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания административно-бытовых и производственных помещений. Продавец в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона. После выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания предмета аукциона между продавцом и покупателем в течение 10 (десяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации земельного участка должен быть заключен договор купли-продажи

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20%** | **119 400,00 белорусских рублей (снижена на 50%)** |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 26.09.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **17.11.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **15.11.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Орша-Сервис», 211391, Витебская обл., г. Орша, ул. Герцена, д. 4А, (0216) 51-25-15

**Лот №1.** Капитальное строение с инв. №240/С-19761 площадью 115,2 кв. м, наименование – здание конторы базы, назначение – здание административно-хозяйственное, по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 230П. Капитальное строение с инв. №240/С-29416 площадью 52 кв. м, наименование – здание бытовки, назначение – здание неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 230П/1. Имущество расположено на зем. участке №242400000001004361 площадью 0,0814. **Начальная цена:** 23 100 руб. без НДС. **Задаток:** 2 310 руб.

**Лот №2.** Капитальное строение с инв. №240/С-18945 площадью 3392,6 кв. м, наименование – здание склада №1, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 230Ю, на зем. участке №242400000001001710 площадью 0,5742. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание №1 со складом, двумя платформами, кабельными линиями электропередачи, асфальтобетонной площадкой, тремя рампами. **Начальная цена:** 139 000 руб. без НДС. **Задаток:** 13 900 руб.

**Лот №3.** Капитальное строение с инв. №240/С-17088 площадью 902,8 кв. м, наименование – мелкооптовая база, назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание мелкооптовой базы, по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г.Орша, ул.1 Мая, 109. Капитальное строение с инв. №240/С-28848 площадью 2,5 кв. м, наименование – здание туалета, назначение – здание специализированное иного назначения, по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. 1 Мая, 109. Составные части и принадлежности: одноэтажное здание туалета с асфальтной площадкой, железобетонным ограждением, металлическими воротами. Имущество расположено на зем. участке №242400000001000512 площадью 0,4682. **Начальная цена:** 72 000 руб. без НДС. **Задаток:** 7 200 руб.

Аукцион состоится 23.11.2017 в 12.00 по адресу: г. Орша, ул. Герцена, д. 4А, в ОАО «Орша-Сервис». Срок внесения задатков и приема документов: с 23.10.2017 с 8.30 по 22.11.2017 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**

Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Экалагічны ЛІКБЕЗ

# НІ ХВАСТА І НІ ЛУСКІ!

## Што робіцца, каб напоўніць гэтыя словы сэнсам

**Чуючы такое пажаданне перад наведваннем вадаёма, кожны рыбалоў марыць вярнуцца дадому з прыстойнымі трафеямі. Аднак аднаго майстэрства, спрыяльных умоў надвор'я і элементарнага шанцавання часам бывае недастаткова. З той простай прычыны, што ва ўгоддзях рыбы папросту можа не быць... Недзе «пагаспадарылі» браканьеры, дзесьці сама прырода ўнесла карэктывы ў жыццё падводных насельнікаў. Каб яно не спынілася ў водных угоддзях увогуле, у краіне праводзіцца вялікая работа па зарыбленні, калі трэба, уводзяцца абмежаванні і забароны. А нячыстым на руку «рыбакам» даюць па іх у поўнай меры. Усім гэтым займаюцца ў тым ліку і работнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

### ЗАРЫБІЛІ МОРА ШЧУПАКОМ

**Так, члены Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, Вялікага рыбалоўнага інтэрнэт-клуба і супрацоўнікі Мінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету ў пачатку красавіка ўсялілі ў Заслаўскае вадасховішча 4,2 тоны малявак шчупака (аднагадовых асобін).**

Яны былі закуплены ў рыбгасе «Белае» Жыткавіцкага раёна за сродкі рыбаловаў. Рыбу адгружалі ў ёмістасці, далей іх развезлі па акваторыі на лодках і выпусцілі шчупака на глыбіні.

Дзяржінспектары пасля правядзення маштабнага зарыблення ўзмацнілі кантроль за выкананнем правілаў рыбалоўства на вадаёме. Шчупака цяпер можна здабываць, але паводле ўстаноўленай прамысловай меры — даўжынёй не менш за 40 сантыметраў.



### НЕРАСЦІЛІШЧЫ ДЛЯ СУДАКА

**У той жа час на Заслаўскім вадасховішчы (Мінскім моры) прайшла акцыя па вырабе штучных нерасцілішчаў для судака.**

Яе ініцыятарам быў Вялікі рыбалоўны інтэрнэт-клуб (ВРІК) пры садзейнічанні Дзяржаўнай інспекцыі і Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў (БТПР). Мерапрыемства праводзіцца штогод і, як правіла, носіць масавы характар, многія рыбакі прыязджаюць цэлымі сем'ямі, бо зрабіць нерасцілішча пад сілу нават дзіцяці.

Канструкцыя вырабляецца з экалагічных матэрыялаў: да глінянай цагліны льняной вяроўкай прывязваюць некалькі яловых лапак — «калыску» ікры судака. Затым нерасцілішчы развозяць на лодках і на глыбіні апускаюць у ваду. Кожны год судаку трэба новае нерасцілішча, бо старыя заглейваюцца, таму акцыя стала традыцыйнай. Гэта адносна танны і эфектыўны спосаб падтрымаць папуляцыю судака. Сёлета было зроблена каля 300 гнёздаў-нерасцілішчаў. Далучыцца да мерапрыемства можа любы ахвотны.

### У ДНЕПР ВЫПУСЦІЛІ СЦЕРЛЯДЗЬ

**У маі паблізу вёскі Холаўе Дубровенскага раёна адбылося зарыбленне Дняпра сцерляддзю.**

У рыбалоўныя ўгоддзі выпусцілі каля 1,5 тысячы асобін сцерлядзі агульнай вагой 300 кілаграмаў. Рыбапасадачны матэрыял прывезлі з доследнага рыбгаса «Белае» Жыткавіцкага раёна. Закуплены ён быў на сродкі рыбакоў, выдзеленых Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў з членскіх узносаў.

Ініцыятарам зарыблення выступіла Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У жніўні 2016 года дзяржінспектары зафіксавалі наступствы маштабнага замору рыбы, які здарыўся з-за анамальнай спякоты ў вярхоўях Дняпра на тэрыторыі Расіі. Некалькі дзён уніз па цячэнні ракі плыла мёртвая рыба — тысячы асобін былі сабраныя і ўтылізаваныя.

Спецыялісты Дзяржінспекцыі правялі перамовы з калегамі з Расрыбалоўства і дасягнулі дамоўленасці, што ў 2017 годзе Днепр будзе зарыбляцца абодвума бакамі. Майскае ўсяленне сцерлядзі — першы крок да аднаўлення біярэсурсаў ракі. Сёння гэты від уключаны ў Чырвоную кнігу Беларусі, вылоўліваць сцерлядзь забаронена. Тым не менш ён з'яўляецца абарыгенным для гэтага вадацёку: яшчэ ў пачатку XX стагоддзя сцерлядзь здабывалі на Дняпры ў прамысловых маштабах.

У далейшым раку будуць зарыбляць таксама шчупаком і судаком. Згодна з біялагічным абгрунтаваннем, у наступныя год-два на тэрыторыі Беларусі плануецца ўсяліць каля сямі тысяч асобін шчупака, 3,5 тысячы асобін судака і яшчэ каля дзвюх тысяч асобін сцерлядзі.

### ПАПАЎНЕННЕ З РАСІЙСКАГА БОКУ

**І працяг не прымусіў сябе доўга чакаць. Ужо ў ліпені больш за 30 тысяч асобін малявак сцерлядзі было выпушчана ў Днепр на заходняй ускраіне Смаленска.**

Зарыбленне трансгранічнага ўчастка ракі праводзілася ў рамках дамоўленасці паміж Расрыбалоўствам і Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь з удзелам прадстаўнікоў беларускага боку.

Спецыялісты абедзвюх краін спадзяюцца не толькі аднавіць запасы Дняпра, але і ўзнавіць некалі традыцыйную для гэтай ракі папуляцыю сцерлядзі. На тэрыторыі Смаленскай вобласці раку зарыблялі ёю восем разоў за апошнія тры гады, хоць і не так маштабна, як цяпер. Віцебскія рыбакі, сапраўды, адзначаюць, што сцерлядзь усё часцей з'яўляецца ва ўловах на Дняпры. Праўда, забіраць гэтую рыбу ў нас нельга: сцерлядзь у Беларусі — пакуль чырванакніжніца.

Вярнуць сцерлядзь у Нёман маюць намер і нашы заходнія суседзі літоўцы. Для гэтага Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Літвы штогод плануе ўсяляць па 30 тысяч рыб на ўчастку ракі ад горада Масты да Каўнаскай ГЭС.

У пачатку жніўня ў рамках выканання дамоўленасцяў паміж Дзяржінспекцыяй і расійскімі калегамі аб сумесным аднаўленні рэсурсаў Дняпра адбылося чарговае зарыбленне ракі. Супрацоўнікі Дэпартамента Смаленскай вобласці па ахове, кантролі і рэгуляванні выкарыстання лясной гаспадаркі, аб'ектаў жывёльнага свету і асяроддзя іх пражывання выпусцілі ў Днепр 182 кілаграмы малявак сазана. Сярэдняя вага кожнай рыбіны каля 200 грамаў, усяго было ўселена амаль тысяча асобін.

Чарговае масавае зарыбленне трансгранічнага ўчастка Дняпра расіяне правялі літаральна днямі, выпусціўшы каля дзвюх тысяч малявак шчупака.

### НОВАЯ ЗАБАРОНА НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

**Перад плацінай Віцебскай гідраэлектрастанцыі ў значнай колькасці збіраецца рыба, якую вельмі актыўна вылоўліваюць рыбакі.**

У мэтах захавання абарыгенных відаў рыб Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь пастановай №22 ад 22.06.2017 устанавіла забарону на аматарскае рыбалоўства на ўчастку ракі Заходняя Дзвіна ад плаціны Віцебскай гідраэлектрастанцыі на адлегласці 800 метраў уніз па цячэнні да месца ўпадзення ракі Лужаснянкі па 9 красавіка 2019 года.

Пастанова была апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь 11 ліпеня, калі і ўступіла ў сілу.

### ПАРАДАК АРЭНДЫ ЎГОДДЗЯЎ ЗМЯНІЎСЯ

**13 ліпеня Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал апублікаваў тэкст Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2017 года №247 «Аб змяненні Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» (ад 8 снежня 2005 года №580). Дакумент вызначае новы парадак перадачы ў арэнду рыбалоўных угоддзяў і зямельных участкаў у мэтах павышэння эфектыўнасці вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства.**

Згодна з Указам, больш не будуць перадавацца ў арэнду рэкі — аматарскае рыбалоўства на іх стане бясплатным. Гэта новаўвядзенне ініцыявалі спецыялісты Дзяржінспекцыі ў сувязі са шматлікімі зваротамі грамадзян, якія сведчылі аб нарастанні сацыяльнага напружання. Аблвыканкамы абавязаны будуць прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі Указа ўжо дзеючыя дагаворы арэнды ўчасткаў вадацёкаў.

Указ таксама прадугледжвае, што рыбалоўныя ўгоддзі будуць здавацца ў арэнду па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, па выніках конкурсу і толькі разам з зямельным участкам, неабходным для рэалізацыі комплекснага плана іх выкарыстання, напрыклад, для будаўніцтва капітальных будынкаў.

Акрамя таго, ураду было даручана распрацаваць комплексную схему размяшчэння сажалак і абводненых кар'ераў, прыдатных для рыбаводства, на падставе якой у далейшым гэтыя водныя аб'екты будуць здавацца ў арэнду для гадоўлі таварнай рыбы. Гэта дазволіць пазбегнуць сітуацый, калі арандатарам-рыбаводам перадаваліся прадукцыйныя рыбалоўныя ўгоддзі, якія карысталіся папулярнасцю ў рыбаловаў-аматараў.

### РАЗВІВАЦЬ ТУРЫЗМ НА ДРЫВЯТАХ

**Водныя транспартныя сродкі з рухавікамі ўнутранага згарання магутнасцю звыш 15 конскіх сіл цяпер дазволена выкарыстоўваць юрыдычным і фізічным асобам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам, якія ажыццяўляюць аказанне паслуг у сферы турызму на возеры Дрывяты ў Браслаўскім раёне.**

Новаўвядзенне замацавана на заканадаўчым узроўні — у Палажэнні аб Нацыянальным парку «Браслаўскія азёры», зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №59 ад 9 лютага 2012 года «Аб некаторых пытаннях развіцця асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый», у які нядаўна былі ўнесены змяненні (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №248 ад 11 ліпеня 2017 года).

Пры гэтым ахвотныя пакатаць турыстаў на плаўсродках з магутным маторам (больш за 15 конскіх сіл) павінны заключыць з нацпаркам дагавор, які прадугледжвае штогадовую плату ў памеры адной базавай велічыні за кожную конскую сілу рухавіка воднага транспартнага сродку звыш устаноўленай нормы. Гэтыя даходы будуць накіраваны на добраўпарадкаванне рэкрэацыйнай зоны нацыянальнага парку, узнаўленне каштоўных абарыгенных відаў рыб і зарыбленне рыбалоўных угоддзяў.

### ВАДАЁМ — ПАД КАНТРОЛЬ

**Возера Спораўскае ў Бярозаўскім раёне Брэсцкай вобласці вылучаецца не толькі сваёй прыгажосцю і багаццем іхтыяфаўны, але і прэсінгам з боку браканьераў. Пры гэтым асноўная маса парушэнняў правілаў рыбалоўства здзяйсняецца жыхарамі вёскі Спорава, размешчанай на беразе возера.**

З пачатку года на ім было затрымана некалькі мясцовых браканьераў, некаторыя з іх аказвалі непадпарадкаванне работнікам інспекцыі. У парушальнікаў канфіскавалі больш за 600 метраў сетак. Па двух фактах матэрыялы перададзены ў праваахоўныя органы для вырашэння пытання аб узбуджэнні крымінальных спраў. Акрамя таго, з вады дасталі звыш 30 безгаспадарных сетак агульнай даўжынёй 1510 метраў, у якіх загінула 60 кілаграмаў рыбы.

Плошча возера ў 11,5 квадратнага кіламетра значна ўскладняе кантроль за выкананнем нормаў прыродаахоўнага заканадаўства. Гэта прымусіла работнікаў Бярозаўскай міжраённай інспекцыі змяніць звыклыя метады работы з браканьерамі. Мясцовыя інспектары, карыстаючыся аператыўнай інфармацыяй, сумесна з супрацоўнікамі Бярозаўскага РАУС правялі шэраг аглядаў жылля і гаспадарчых пабудоў меркаваных парушальнікаў у вёсцы Спорава, падчас якіх выявілі і канфіскавалі незаконныя прылады рыбалоўства.

Так, у ходзе аднаго агляду падворкаў па чатырох розных адрасах канфіскавана 106 рыбалоўных сетак агульнай даўжынёй звыш 3900 метраў і шэсць венцераў. Раней быў выяўлены факт незаконнага захоўвання 35 рыбалоўных сетак агульнай даўжынёй 1792 метры. У дачыненні да вінаватых распачаты адміністрацыйныя працэсы па артыкуле 15.36 КоАП Рэспублікі Беларусь (незаконнае захоўванне прылад здабычы рыбы).

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Прававая гасцёўня

## ТВАЯ — МАЯ — ДЗЯРЖАЎНАЯ СПАДЧЫНА

**Як вярнуць замежную маёмасць**

***— Я пяць гадоў была замужам за італьянцам. Жылі ў Неапалі, набылі там за грошы мужа невялічкую кватэру, нарадзілі сына. Пасля мы скасавалі шлюб, я з малым вярнулася на радзіму. Ці маю я нейкае права на тую маёмасць, і ці можа наш сын разлічваць на спадчыну італьянскага бацькі?***

**Вольга Д.,** *г. Мінск*

На пытанне адказвае **Марына ЖАНДАРАВА, начальнік аддзела выканання міжнародных дагавораў упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:**



— Права на замежную нерухомую маёмасць згодна з дагаворамі аб прававой дапамозе рэгулюецца законамі дзяржавы, на тэрыторыі якой яна знаходзіцца. Дагаворы аб прававой дапамозе рэгулююць вялікі спектр пытанняў: прызнанне дзеяздольным ці адсутным без звестак, устанаўленне факта смерці, заключэнне або скасаванне шлюбу, вызначэнне асабістых і маёмасных праваадносін мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей у змешаных шлюбах, атрыманне спадчыны, прызначэнне апекі, кампенсаванне шкоды і іншыя.

Узнікненне або спыненне права ўласнасці ці іншага маёмаснага права на маёмасць абумоўліваецца законам краіны месца знаходжання гэтай маёмасці на той момант, калі меліся абставіны, што сталі падставай такога права. Калі ж маёмасць з'яўляецца прадметам здзелкі, то ўзнікненне ці спыненне права ўласнасці вызначаецца законам краіны, дзе яна была здзейснена (калі іншае не прадугледжана пагадненнем бакоў).

А вось права ўласнасці на транспартныя сродкі, якія падлягаюць унясенню ў дзяржаўныя рэестры, вызначаецца, напрыклад, законам дзяржавы, дзе гэты сродак зарэгістраваны.

Дзякуючы міжнародным дагаворам, беларусы могуць атрымаць замежную спадчыну на тых жа ўмовах і ў тым жа аб'ёме, што і ўласныя грамадзяне краіны. Права наследавання вызначаецца законам апошняй краіны, дзе жыў спадчынадавец. У дачыненні нерухомай маёмасці дзейнічаюць законы краіны, дзе яна знаходзіцца.

*Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы*

■

■ Хто каго?

# «ДА ХАЛЕРЫ РОЗНЫХ ЗНАКАЎ НАЧАПЛЯЎ ДАШНІК ЯКАЎ...»

**Жыла-была...**
**Ці вам казаць: пачынаюцца так не толькі казкі, але і зусім праўдзівыя гісторыі.**
**Значыць, жыла-была маладая сямейка, і расло ў ёй дзіцятка — адно. А каб яму не так сумна было, бацькі чаго ні куплялі: кніжкі, цацкі, дыскі з песнямі-казкамі, плэеры, пазлы, потым — розных рыбак, жывёл...**
**Але ж неяк прыходзіць матуля дамоў, а сын яе няшчасны-няшчасны. Кажа праз слёзы: «Пацучок памёр». «Што ж, так бывае, — суцяшае малога маці. — Зараз мы з табой возьмем прыгожую каробачку, пакладзём яго, занясём у парк і пахаваем. А потым — купім торцік, кока-колу, ты запросіш сяброў...»**
**Разважае яна вось гэтак, шкадуе мальца, а сама тым часам ідзе да клеткі з пацучком і бачыць, што той — нічога падобнага — жывы!**
**Думаеце, малы таксама ўзрадаваўся? Не. Ён спытаў: «Мама, а можа я яго прыдушу?»**

...Прычым тут жанчына з каровамі і запраўка? Не паверыце, але сувязь ёсць. Прынамсі, не так даўно даказана, што калі ў кока-колу (на здымку, бачыце, вітрына з ёй?) наліць трохі малака, то праз шэсць гадзін адстойвання кола ачысціцца ад ўсіх сваіх прымесяў, і атрымаецца... чысты бензін.

Зрэшты, пра ўсё — і гэта, і многае іншае — лепш не прозай, лепш вершамі, калі яны ёсць. Ну, у прыватнасці, ад **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска:**

*Адшукала наша Клаўка*
*Траўку — побачкі з запраўкай:*
*Без хвашчу, без бадзякоў —*
*Канюшынка белая...*
*Напасе сваіх кароў*
*Гаспадынька смелая!*

Смелая таму, што ў неналежным месцы з каровамі пераходзіць дарогу? Ці таму, што збіраецца пасвіць іх, мякка кажучы, абы дзе?

Пра гэта аўтарка, на жаль, не піша. Але ж адказы на пытанні ў пошце ёсць — ад **мінчан сужэнцаў Астроўскіх.** Менавіта з іх канверта — па-першае, слушная просьба-папярэджанне:

*Не выходзьма на дарогі*
*Без належнай асцярогі!*
*Беражом сябе й каровак,*
*Бо гіблота безгаловых:*
*Так газуюць ліхачы —*
*Не паспееш уцячы!*

А па-другое, — канстатацыя відавочнага:

*Цётка ўбачыла траву*
*І падумала: «Жыву —*
*На запраўцы ўсе ўмовы,*
*Каб наеліся каровы!*
*...Цягне бедных цётка Саша,*
*Бо не мае іншай пашы!*

Каб што лепшае, а вось гэта, на жаль, бывае. І людзі не маўчаць:

*На бяду для цёткі Машы*
*Зааралі ў вёсцы пашу.*
*Што ж ёй зараз загадаць:*
*Чым каровак «запраўляць»? —*

перажывае разам з гаспадыняй **спадарыня Святлана Моніч з Маладзечна.** А **Іна Алісевіч з Уздзеншчыны** дадае:

*Крыўдна Зорачцы з Малютай —*
*Добрай пашы — у абрэз,*
*Вось і ходзяць па пакутах:*
*Не «спрыяе» ім прагрэс.*

На яго ж наракае і **спадар Мікола Кісель з Мінска.** Ён у шасці радках цэлую карціну малюе — алеем, можна сказаць.



*Дзень на ўзлеску каля рова*
*Ядзя пасвіла каровак.*
*Ей не ў думках быў прагрэс...*
*Вечаркам дамоў прыгнала,*
*А хлява — як... не бывала:*
*Там асфальт і АЗС.*

Згадзіцеся, рэдкая неспадзяванка ды і тэмпы такія ж: як бачыш, усё змянілася! А вось да лепшага ці да горшага? Як сведчыць рэдакцыйная пошта, і да тога, і да другога. Ад **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды** канстатацыя фактаў:

*У наш век, такі тэхнічны,*
*Інтэрнэтаўскі, хімічны,*
*Столькі чуліі!.. І такога...*
*Не здзіўляе ўжо нікога,*
*Што Лысуха ў цёткі Зіны*
*Ранкам нюхае бензіну.*
*І Мальвіна слабасць мае —*
*Дужа колу паважае.*

Розныя, выходзіць, густы — у кароў! Што ўжо казаць пра людзей? А вось самі яны — кажуць. І нават пішуць: «Мяркую, што кабета са здымка — вялікая аматарка кока-колы, і таму з каровамі напрасткі шыбуе да вітрыны з гэтым напоем. А вось муж яе іншую слабасць мае», — лічыць **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў** і нават падказвае сужэнцам шлях да прымірэння:

*Ясь здаўна аматар піва,*
*Яня — кока-колы.*
*А таму яно не дзіва,*
*Што ў сям'і расколы...*
*Дам параду: «До мудрыць!*
*Малако вам трэба піць:*
*Во дзе асалода!*
*І ў хаце згода».*

Лёгка яе прадбачыць — чыста тэарэтычна, а вось як дасягнуць, калі...

Чыстую праўду піша **спадарыня Чыгрынава:**

*Ну й дастала ж нас рэклама,*
*Бо пішчом... І ў вочы прама —*
*У газетах, на экранах,*
*Са слупоў, з дзвярэй у крамах:*
*Чыпсы, дрыпсы, кока-кола...*
*Фанта, шманта (во назола!)*
*Нейкі спрайт і газіроўка...*
*На халеру ўжо й кароўка?*

Лагічнае пытанне. Як і адказ таго ж **спадара Гаўрыша:** каб... працаваць.

*У каго сягоння нафта—*
*У таго й даляры:*
*Свае фірмы, свае яхты,*
*Вілы на Канарах...*
*А шчыруеш на зямлі —*
*Ці ўзаб'ешся на рублі?..*
*Вілы, праўда, маеш:*
*Імі гной кідаеш.*

Чаму так атрымліваецца? Ды таму (мае рацыю **спадарыня Чыгрынава**) што

*Малаку цана — капейкі,*
*А гаручаму — рублі.*
*Так прыдумаў ёлуп нейкі,*
*Каб сагнаць людзей з зямлі.*

І, згодзімся, ён дамогся свайго, то-бок сагнаў... Але ж, дзякуй богу, не ўсіх! З таго ж канверта:

*Да халеры розных знакаў*
*Начапляў дашнік Якаў,*
*Ды Маруся напраскі*
*Цягне Мілак да ракі.*
*Для каровак там прысмакі,*
*А ўсе знакі ёй да с...*

Ну, вы здагадаліся... Бо жанчына, як правіла, ведае, што робіць. А тым больш, калі яна (паводле **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў**) — гаспадыня гэтай запраўкі і працуе на ёй, як належыць, як дыктуюць, у прыватнасці, час і рынак:

*Законам для Зіны*
*Жаданне любое:*
*Камусьці — бензіну,*
*Каму — сырадою...*

А вось на думку **спадарыні Алены Пятроўскай з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна**, з кароўкамі на здымку не хто іншы, як заклапочаная матуля, у якой

*Доні замуж закарцела,*
*Бо Пакровы на дварэ...*
*Ды жаніх — хлапец у целе,*
*Без каровы не бярэ.*

Вось і спяшаецца маці на выручку, хоча мець зяця, а гэты, падобна, чалавек не дурны: ведае (як і **спадарыня Алена Кулік з Валожыншчыны**), што

*Куды лепш за колу будзе*
*Малако сваіх кароў:*
*Як штодзень «бярэш на грудзі»,*
*Дык не знаеш дактароў!*

Праўда, наконт «грудзей» ёсць яшчэ адно меркаванне (прычым досыць нечаканае) — ад **спадарыні Веры Жук з Гродна.** Яна, уважліва паглядзеўшы на здымак, піша:

*Напаі кароў вадой, —*
*Атрымаеш сырадой.*
*А калі ім колы даць,*
*Можна... віскі атрымаць!*

Гэта, згадзіцеся, ужо нешта, прычым новае (пра тое, што колай можна выводзіць плямы, адмываць унітазы, вокны і посуд, травіць мурашак, асвятляць няўдала пафарбаваныя валасы і г. д. вы, напэўна, чулі). А калі праўда пра віскі?..

Яшчэ адзін прыклад узаемасувязі: жывеш — хочацца выпіць, вып'еш — хочацца жыць. Адкуль дыялог: жонка пытае ў мужа: «Дарагі, ты малака купіў?» Ён ёй: «Малакаку? Не піў!»

І тут вось што цікава: кажаш, што не п'еш, — усе спрабуюць напаіць. Кажаш, што на дыеце, — усе спрабуюць накарміць. Кажаш, што грошай няма... Ці тое ціха кажаш, ці тое дрэнна чуюць...

Няма, карацей, ніякай рэакцыі. Як і адказу.

На іншыя пытанні, дарэчы, таксама. Ну вось скажыце, каму належаць прыродныя багацці — тыя ж нафта, газ? Народу? Так. Тады чаму ён, гэты народ, сам сабе іх прадае? За такія шалёныя грошы...

А зрэшты, гэта як бы не пра нас, бо мы

*Сваёй нафты мала маем,*
*Болей мяса з малаком:*
*На гаручае мяняем*
*То каровак, то бычкоў, —*

мяркуе **спадарыня Вольга Лабажэвіч з Клецка.**

А ёсць, на жаль, «гаспадыні», што могуць і так аддаць, задарма. Пра адну з іх піша **спадарыня Раіса Васільева з Гомеля:**

*Не касіла, не сушыла*
